ТОЛЬКІ ПРАЛЕТАРСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ
вызваліць пралетарыят ад беспрацоўя, галечы, голаду і рабства

Пралетэры ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 54 (3958)
СЕРАДА, 25 ЛЮТАГА
1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Да міжнароднага дня барацьбы з капіталізмам

Па заклику Камінтэрту пралетары ўсяго сьвету пад кіраўніцтвам камуністычных партый выйдуць сёньня на вуліцы згуртаванымі радамі з пратэстам супроць спроб капіталістаў усе труднасьці крызісу перавяліць на плечы працоўных мас, супроць зьніжэньня заработнай платы, за зьвяржэньне ўлады капіталу, супроць інтэрвэнцыяністкіх пляноў, за абарону СССР. Сёньняшні дэманстрацыя зьмулецца агляданым рэвалюцыйных сіл да надыходзячых бояў з капіталам, супроць усяго капіталістычнага ладу, супроць галечы і голаду, падрыхтоўкі новай вайны, за соцыяльную ўладу ва ўсім сьвеце.

Эканомічны развал сусьветнай капіталістычнай гаспадаркі, развал і зачыканьне ўсёй капіталістычнай сыстэмы адбываюцца прыспешанымі тэмпамі. Яркім доказам гэтага зьлучаецца скарачэньне продукцыі за ўсіх галінах прамысловасьці капіталістычных краін амаль на 50 проц., доказам гэтага зьлучаецца і тыя дзесяткі мільёнаў беспрацоўных, якімі зараз запоўнены ўсе гарады капіталістычных дзяржаў.

Толькі ў адной Эўропе і Амэрыцы налічваецца зараз звыш 120 мільёнаў галадаючых, не гаворачы ўжо аб калёніях.

Гаспадарчы развал капіталістычнага сьвету адбываецца далей. Няма таго дня, каб у тай ці іншай капіталістычнай краіне не закрылася адна або некалькі фабрык і заводаў, каб не збанкрутавала некалькі фірм, буйных банкаў і г. д. Яшчэ ўчора магутнейшая капіталістычная дзяржава, узор для ўсяго капіталістычнага сьвету—ПАЗШ, сёньня налічвае звыш 10 мільёнаў беспрацоўных. Прадукцыя прамысловасьці ПАЗШ скарочана ва ўсіх галінах на 35-40 проц., а ў некаторых галінах нават на 50 проц. Ад спаўтага амэрыканскага «процэрыты» не засталося і сьледу. Нашат Францыя, якая яшчэ да гэтага часу ня можа пераварыць награбленай у вынику сусьветнай імпэрыялістычнай бойні здабычы, Францыя, якая да апошняга часу хвалілася свае «устойлівым» гаспадарчым становішчам, зараз таксама пагрузілася ў хаос жорсткага гаспадарчага крызісу. Шпаркімі тэмпамі скарачаецца прадукцыя ў галоўных галінах яе прамысловасьці. На сёньняшні дзень яна налічвае, паводле даных рэвалюцыйных прафсаюзаў, звыш 1 млн. 400 тыс. беспрацоўных і паўбеспрацоўных.

Асабліва востра ўдарыў эканомічны крызіс па фашысцкай ПОЛЬШЧЫ. З прычыны сваёй тэхнічнай адсталасьці, польская прамысловасьць, ня гледзячы на жабрацкую зарплату, якую атрымліваюць рабочыя, ня ў стане канкураваць на замежным рынку з перадавымі капіталістычнымі краінамі. Сельская гаспадарка Польшчы не змагла апраўцца ад ран, нанесеных ёй сусьветнай вайной. Цяжкія падаткі, якімі абкладзена сялянства ў фашысцкай Польшчы, давялі сялянства Польшчы, а асабліва Зах. Беларусі і Зах. Украіны, да поўнага жабрацтва, зьнізілі і да таго нізкую пакупную здольнасьць іх да крайніх межаў.

Усе ўпрыскваньні, якія робяцца польскім фашызмам для аслабленьня крызісу ў выглядзе замежных пазык, у стане толькі расьцягнуць крызіс, але ні ў якім разе ня зьнішчыць яго. У Польшчы эканомічны крызіс набывае проста катастрафічны характар. Беспрацоўе расьце проста нячуванымі тэмпамі—зараз 60-70 проц. квадрата пралетарыяту Польшчы беспрацоўныя. Амаль што кожны другі рабочы зьяўляецца беспрацоўным.

Адначасова з масавым звальненьнем рабочых адбываецца і наступленьне шырокім фронтам прадпрыемцаў на зарплату. Зараз няма ні адной капіталістычнай краіны, дзе-б прамыслоўцы не вялі паходу супроць зарплаты, дзе-б апошняя ня зьнижалася на 25-30 проц., а ў некаторых краінах — нават і на 50 проц. Няма ні адной краіны зараз, дзе-б не зьмяншалася і без таго мізэрная дапамога беспрацоўным.

Імпэрыялісты шалёна ўзбройваюцца. Капіталістычная ваенная прамысловасьць — адзіная галіна, якая ва ўмовах самага жорсткага эканамічнага крызісу далей расьце і разгортваецца. Насычаньне імпэрыялістычных армій тэхнічнымі сродкамі барацьбы дасягнула вялізарнага ўзроўню. Імпэрыялісты ўзмоцнена рыхтуюцца да новай вайны, за новы перадзел сьвету. Вострасьць падрыхтоўкі вайны накіравана імі супроць Савецкага Саюзу, які нячуванымі ў гісторыі тэмпамі будуе сацыялізм.

«Народная гаспадарка нашага Саюзу, — зазначыў у сваіх пастановах апошні сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б), — стаіць на парозе завяршэньня грандыёзнага пляну работ па будаўніцтва сацыялізму — пяцігадовага пляну. Пэрспэктыва рашаючай перамогі ня можа ня выклікаць новага энтузіязму і новага ўздыму сярод рабочых і сялян. Але яна ня можа таксама не ўзмацніць нянавісьці і злосьці нашых клясавых ворагаў».

Вось чаму міжнародны імпэрыялізм шалёнымі тэмпамі рыхтуецца да інтэрвэнцыі супроць СССР. Выйсьці з крызісу за кошт СССР, аслабіць рэвалюцыяністкую ўплыў першай у сьвеце пралетарскай дзяржавы, затрымаць пераможны ход міжнародной пралетарскай рэвалюцыі, — вось пляны сусьветных драпежнікаў. Працэс «прампартыі», які нядаўна адбыўся ў Маскве, паказаў, што ПЫТАНЬНЕ ІНТЭРВЭНЦЫІ СУПРОЦЬ СССР ІМПЭРЫЯЛІСТАМІ СТАІЦЬ У ПАРАДКУ ДНЯ. У гэтым сэнс усёй тэй антысавецкай сьвістапляскі, якую мы наглядаем на працягу ўжо амаль году пад рознымі пёзунгамі, а ў апошнія часы — пад выглядам, нібы, барацьбы супроць савецкага «дэмпінгу» і «прымусовай працы» на нашых пасазагатоўках. АНТЫСАВЕЦКАЯ КАМПАНІЯ, якая вядзецца цьвёрдалобымі розных эдценьняў, — ГЭТА ТОЛЬКІ ПАДРЫХТОЎКА ДА ІНТЭРВЭНЦЫІ.

У такой насычанай порахам міжнароднай абстаноўцы дзень 25 лютага — дзень барацьбы супроць беспрацоўя — набывае асабліва значэньне. Перад сусьветным пралетарыятам ёсьць два выхады — або выміраньне ад голаду і фашысцкая навала, або рэвалюцыйная барацьба пад кіраўніцтвам кампартыі супроць капіталістычнага ладу, за пралетарскую дыктатуру ва ўсім сьвеце.

У апошнія часы ў капіталістычных краінах наглядаюцца ўсё больш частыя выпадкі стыхійных выступленьняў беспрацоўных на вуліцах. Да гэтых выступленьняў далучаюцца і рабочыя з фабрык і заводаў, якія яшчэ працуюць. Асабліва востры характар набылі дэманстрацыі беспрацоўных у ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ І НЯМЕЧЧЫНЕ. У Польшчы, дзе амаль што на мільён беспрацоўных толькі каля 110 тыс. атрымліваюць грашовую дапамогу, галеча працоўных мас і голад дасягнулі нябывалых разьмераў. Калі беспрацоўныя Перамышля зьвярнуліся да кіраўніка біржы працы з просьбай дапамогі, дык ён цынічна адказаў: «Грошай у касе ня маю, магу вам толькі запрапанаваць невялікую суму грошай на куплю вяроўкі, каб вы маглі павесіцца». У фашысцкай Польшчы няма таго, дня, каб у тым ці іншым горадзе на адбывалася дэманстрацыя беспрацоўных, прычым дэманстрацыі гэтыя заўсёды з надзвычайнай жорсткасьцю разганяюцца ўзброенай да зубоў, апранутай у панцыры, папіцыяй і жандармэрыяй.

Гэты-ж самы малюнак уладарт, жорсткай барацьбы пралетарыяту, а асабліва беспрацоўных, супроць капіталу, наглядаецца і ў Нямеччыне.

Кожнае такое выступленьне беспрацоўных набывае зараз зусім натуральна палітычны характар — барацьбы супроць капіталістычнага ладу.

Сёньнішні дзень зьвяцца ня толькі днём маніфэстацыі беспрацоўных, але адначасова і днём масавай барацьбы ўсяго пралетарыяту супроць беспрацоўя. Адным з цэнтральных пёзунгаў дня будзе барацьба за страхаваньне ад беспрацоўя за кошт фабрыкантаў і дзяржавы, за безадкладную дапамогу беспрацоўным, барацьба супроць масавых звальненьняў рабочых, супроць зьніжэньня зарплаты, за павышэньне яе, за 7-гадзінны рабочы дзень. Задачай кампартый адначасова будзе — вытлумачыць беспрацоўным масам пралетарыяту, што вызваленьне ад беспрацоўя, галечы і голаду можа даць толькі дыктатура пралетарыяту.

Кампартыі выкрываюць да канца ролю сацыял-фашызму, як агента буржуазіі, як зьпейшага ворага рабочае клясы. На барацьбу з сацыял-фашызмам, на заваляньне рабочых, якія яшчэ знаходзяцца пад уплывам сацыял-фашызму, у дзень 25-га лютага павінна быць зьвернута асабліва ўвага. Сацыял-фашызм пасьля апублікаваньня адозвы кампартый аб арганізацыі міжнароднага дня барацьбы з беспрацоўем, добра зразумеў значэньне гэтай кампаніі. Жадаючы параліжаваць імкненьне пралетарскіх мас пад кіраўніцтвам кампартый стварыць адзіны фронт супроць капіталу, сацыял-фашызм зрабіў рад «левых» манэўраў. Зараз мы зьяўляемся сьведкамі таго, як буржуазныя краіны Эўропы адна за другой узьнялі пытаньне аб уядзеньні пяціднёўкі ў сваёй капіталістычнай вытворчасьці. Буржуазія пры дапамозе сацыял-фашысцкіх прахвостаў імкнецца выкарыстаць папулярнае слова савецкай пяціднёўкі ў сваіх мэтах—шляхам скарачэньня зарплаты выйсьці з крызісу. Таму задачай кампартый павінна быць канчатковае выкрыцьцё гэтага манэўру аб'яднанага фронту капіталістаў і сацыял-фашыстаў, накіраванага на далейшае грабежніцтва рабочых мас.

За некалькі дзён да 25-га лютага буржуазія многіх краін ужо мабілізавала ўсю сваю паліцыю і жандармэрыю, прабуючы прыстасаваньнем самых жорсткіх мер не дапусьціць рабочых дэманстрацый. За некалькі дзён перад 25 лютым у Нямеччыне, Румыніі, Вэнгрыі, Баўгарыі і асабліва ў фашысцкай Польшчы адбываліся масавыя вобыскі і арышты сярод рэвалюцыйнага пралетарыяту, а таксама і жорсткія, упартыя крывавыя сутычкі паміж паліцыяй і фашыстамі, з аднаго боку, і беспрацоўнымі — з другога.

Пралетарыят усяго сьвету пад кіраўніцтвам сваіх кампартый, НАПЕРАКОР ЗАБАРОНЕ КРЫВАВЫХ ЦЭРГІБЕЛЯЎ, ня гледзячы на суровы фашысцкі тэрор, выйдзе сёньня на вуліцу прадэманстраваць сваю волю да барацьбы супроць загніваючага капіталістычнага ладу, супроць галечы, голаду і вайны, за абарону СССР, за хлеб, працу і ўладу, за пралетарскую дыктатуру ва ўсім сьвеце, за сусьветны Кастрычнік.

Да пратэсту супроць арышту правадыра Грамады, тав. Тарашкевіча

ФАШЫСЦКІЯ ТРЭПАВЫ
жорстка памыляюцца
КРЫВАВЫМ ТЭРОРАМ РЭВАЛЮЦЫЙНА-ВЫЗВАЛЕНЧАГА РУХУ БЕЛАРУСКІХ ПРАЦОЎНЫХ МАС ІМ НЯ СПЫНІЦЬ

Гутарка з б. дэпутатам—кіраўніком Грамады тав. Мятлою

У гутарцы з нашым карэспандэнтам аб правакацыйным арышце польскай ахранкай правадыра разгромленай польскім фашызмам беларускай работніцка-сялянскай Грамады В. Тарашкевіча, тав. Мятла заявіў наступнае:

«Няма ніякага сумненьня ў тым, што гэты правакацыйны арышт быў падрыхтаваны супольна польскай і нямецкай ахранкамі. Аб гэтым сьведчыць факт захопу тав. Тарашкевіча ў загоне, які карыстаўся экстэрыторыяльным правам.

Удзел камісара віленскай ахранкі Скольскага ў гэтым нячуваным бандыцкім нападзе,—гаворыць далей т. Мятла,—сьведчыць аб тым, што ён быў праведзены пры актыўнай дапамозе беларускіх нацфашыстаў Астроўскага і К°. Мята гэтага арышту зразумела кожнаму працоўнаму Заходняй Беларусі. Шалёна рыхтуючыся да інтэрвэнцыі супроць СССР, польскі фашызм мэтадамі крывавага тэрору імкнецца задушыць нацыянальна-вызваленчую барацьбу працоўных мас, барацьбу, якая жорстка б'е па інтэрвэнцыйных плянах польскіх імпэрыялістаў.

Арышт тав. Тарашкевіча зьяўляецца новым ударам фашысцкай дыктатуры па нацыянальна-вызваленчым руху працоўных мас Зах. Беларусі і адначасова сьведчыць аб нязвычайным узмацненьні белага тэрору польскіх акупантаў.

Рэвалюцыйных барацьбітоў, фашызм хоча пазбавіцца аднаго з сваіх найпрымірымых ворагаў. Але фашыстаўскія Трэпавы жорстка памыляюцца, калі думаюць, што катаваньнямі Луцкіх і Беластоцкіх ахранак, шматгадовымі катаржнымі прысудамі зломяць рэвалюцыйнае імкненьне працоўных мас да зьвяржэньня фашысцкай дыктатуры.

У адказ на тэрор, у адказ на арышты сваіх лепшых рэвалюцыйных кіраўнікоў—заканчвае тав. Мятла—працоўныя масы Заходняй Беларусі яшчэ шчыльней згуртуюць свае рады, з яшчэ большай рашучасьцю будуць весьці змаганьне з польскімі акупантамі.

Працоўныя ня толькі БССР, але ўсяго сьвету, павінны узьняць рашучы голас пратэсту супроць крывавай расправы фашысцкіх акупантаў над лепшымі прадстаўнікамі працоўных мас Зах. Беларусі.

Гутарка з дэлегатам 10-га Усебеларускага зьезду саветаў--чырвоным партызанам тав. Аляксеенка

Дэлегат 10-га Усебеларускага зьезду саветаў—тав. Аляксеенка Піліп Сяргеяў—былы чырвоны партызан, сапдацкі дэпутат першага менскага савету рабочых і сапдацкіх дэпутатаў у 1917 годзе, цяпер калгасьнік—ударнік калгасу «Новы Сьвет».

— Прачытаўшы артыкул у газэце «Зьвязда» аб бандыцкім нападзе польскіх фашыстаў на кіраўніка нацыянальна-вызваленчага руху Зах. Беларусі—тав. Тарашкевіча, я быў вельмі абураны. Лічу гэта новай правакацыяй фашысцкага ўраду Польшчы, каб задушыць і абязглавіць рэвалюцыйны нацыянальна-вызваленчы рух Заходняе Беларусі.

Крывавы фашысцкі тэрор, арышт тав. Тарашкевіча, супроць якога ўвесь свет, супроць якога ўвесь свет, супроць якога ўвесь свет

Сёньня, у міжнародны дзень барацьбы з капіталам

мільёны пралетараў ва ўсім сьвеце выйдуць на вуліцу, каб дэманстраваць сваю волю да барацьбы супроць галечы, голаду, рабскай працы і беспрацоўя за абарону СССР—

за уладу саветаў ва усім сьвеце

60—70 проц. кадравых рабочых у Польшчы —беспрацоўныя

Каля 4 мільёнаў галадае

У сучасны момант армія беспрацоўных у Польшчы хапляе, паводле афіцыяльных даных, **каля 500 тыс. чал.** Афіцыяльная статыстыка памяншае сапраўдную лічбу беспрацоўных. Калі ўлічыць беспрацоўных батракоў, сэзонных рабочых дробнай прамысловасьці і ремесьнікаў, дык **колькасьць беспрацоўных перавышае 1 млн.** Сотні тысяч рабочых працуюць ад аднаго да чатырох дзён у тыдзень, г. зн., што ў Польшчы разам з сем'ямі ад беспрацоўя **мутуе ня менш 4 млн. чал.** У 1929 г. 40 проц., а ў 1930 г. 60-70 проц. кадравых прамысловых пралетараў у Польшчы ня мелі работы. **Такіх высокіх лічбаў беспрацоўя ня ведае ні адна іншая краіна.**

Польскія беспрацоўныя знаходзяцца ў жудасным стане. **Іх лёс—голад і галеча.** Толькі нязначная частка зарэгістраваных беспрацоўных, 122.237 чал. атрымлівае дапамогу. У 1929 г. усёй сумы выданых дапамог па беспрацоўі складала 49,8 млн. злотых (злоты—22 кап.). Калі падзяліць гэту суму на лік беспрацоўных, што атрымалі дапамогу, дык выйдзе, што **кожны беспрацоўны атрымаў у сярэднім 45 кап. у дзень.** На «дапамогу» беспрацоўны павінен пракарміць ня толькі сябе, але і сям'ю. Аднак і гэтыя нікчэмныя грошы выдаюцца толькі на працягу 17 тыдняў. Няма чаго гаварыць аб тым, што шматмільённая маса беспрацоўных ня ведае ні адной **выступленьняў беспрацоўных,** прычым яны паўтараюцца па некалькі разоў, **яшчэ раз працягваюцца на працягу ранейшых дзён.** Супроць беспрацоўных выступае паліцыя, якая ўжывае ў сваёй праве ня толькі прыклады і шаблі, але і вагнястрэльную зброю і бомбы, і выклікаюць сьлёзы.

Дэманстрацыі беспрацоўных праходзяць пад рэвалюцыйнымі лёзунгамі, у абаронах сьвятасьці пад пёзунгам абароны СССР. Польскі буржуазны і сацыял-фашысцкі друк з трывогай адзначае, што **выступленьнямі беспрацоўных кіруе польская кампартыя.**

ЗВЫШ 10 МІЛЬЁНАЎ БЕСПРАЦОЎНЫХ У КРАІНЕ „ПРОСПЕРЫТЫ"

Статыстычнае бюро ПАЗШ да гэтага часу яшчэ не апублікавала рэзультатаў перапісу беспрацоўных, зробленага ў красавіку 1930 году. Аднак, **факт наяўнасьці 10 мільёнаў беспрацоўных у ПАЗШ** вядомы ўсяму сьвету. Выдатныя амэрыканскія буржуазныя статыстыкі **акрэсьліваюць колькасьць беспрацоўных ад 6 да 10 мільёнаў чалавек.**

Калі ўзімку мінулага году значныя масы беспрацоўных маглі яшчэ весьці амаль поўталоднае існаваньне за кошт сваіх зьберажэньняў або дапамогі ад сваякоў і знаёмых, то цяпер яны залежаць ад мізэрнай дапамогі дабрачынных таварыстваў. У Нью-Ёрку ёсьць 50 арганізаваных добрачыннымі таварыствамі пунктаў раздачы хлеба, якога ў зімовыя халодныя дні гадзінамі чакаюць беспрацоўныя, адзетыя ў лахманы. **Высяленьне беспрацоўных з кватэр стала ў ПАЗШ масавым зьявішчам.** У кватэрах беспрацоўных выключаецца сьвятло і газ за непагашэньне запазычанасьці. **Сотні тысяч беспрацоўных сталі ў ПАЗШ бяздомнымі і даўно ўжо начуюць у вэстыбюлях, гарадзкіх парках або на ложках перанаселеных начлежак.** Друк кожны дзень паведамляе аб самагубствах беспрацоўных і аб выпадках страты прытомнасьці ў чэргах за хлебам. Бяздомныя беспрацоўныя арыштоўваюцца па абвінавачаньні ў «бадзяжніцтве». У Паўднёвых Штатах гэтых «бадзяг» закоўваюць у кайданы і асуджаюць на цяжкую бясплатную прымусовую працу. Урад ПАЗШ упарта пярэчыць супроць якіх-бы там ні было асігнаваньняў на выдачу дапамогі беспрацоўным. Афіцыяльныя колы падкрэсьліваюць, што такая дапамога супярэчыла-б «амэрыканскім прынцыпам».

Адзінымі арганізацыямі, якія кіруюць барацьбой беспрацоўных ПАЗШ, зьяўляецца кампартыя і арганізаваныя ёю рады беспрацоўных, што далучаюцца да рэвалюцыйнай лігі прафсаюзнага адзінства. Рады беспрацоўных разгарнулі шырокую кампанію за ўвядзеньне санстраху ў ПАЗШ. Высунуўшы рад патрабаваньняў у галіне паляпшэньня матар'яльнага становішча беспрацоўных і барацьбы супроць беспрацоўя, кампартыя ПАЗШ і рэвалюцыйная ліга прафсаюзнага адзінства растлумачваюць адначасова няміну часьць беспрацоўя пры капіталістычным ладзе. Галодныя паходы і масавыя дэманстрацыі, арганізаваныя кампартыяй у дзесятках прамысловых цэнтраў ПАЗШ, прайшлі не толькі пад лёзунгам барацьбы за частковыя патрабаваньні, але **і пад пёзунгамі барацьбы супроць капіталізму і ў абарону СССР.**

БЕСПРАЦОЎЕ, ГАЛЕЧА І ГОЛАД у ЧЭХА-СЛАВАКІІ

Каля 30 проц. усяго насельніцтва краіны галадае

Пры насельніцтве ў 14 мільёнаў чалавек **у Чэха-Словакіі налічваецца 700.000 беспрацоўных** і столькі-ж працуючых толькі два-тры дні ў тыдзень. Калі дадаць сюды членаў іх сем'яў, то выявіцца, што каля 4 млн. чалавек, г. зн. **каля 30 проц. усяго насельніцтва Чэха-Словакіі вядзе жабрацкае, галоднае існаваньне.** Становішча рабочае клясы ў значнай ступені пагаршаецца яшчэ тым, што капітал, пры падтрыманьні сацыял-фашысцкіх прафсаюзаў вядзе шалёнае наступленьне на ўмовы працы рабочых і на іх зарплату.

Надзвычай цяжкое становішча рабочае клясы ў Чэха-Словакіі прывяло да паляваньня чэха-словацкага рабочага руху. Арганізацыйна непамерна больш слабая, чым чэская і нямецкая сацыял-фашысцкія партыі, кампартыя Чэха-Словакіі і чырвоныя прафсаюзы здолелі стаць на чале руху беспрацоўных і нездаволеных рабочых мас. У вачох найшырэйшых мас чэха-словацкага пралетарыяту кампартыя зьяўляецца адзіным іх правадыром і абаронцаю. Аўтарытэт кампартыі за апошнія некалькі месяцаў надзвычайна вырас. Аб гэтым сьведчаць перавыбары фабзаўкомаў па буйнейшых мэталюргічных заводах, у рабочай спажывецкай каапэрацыі, масавыя дэманстрацыі беспрацоўных апошняга часу, рух у абарону арыштаванага камуністычнага дэпутата **т. Гаруса** і г. д. Адным з асноўных лёзунгаў, вакол якога кампартыя Чэха-Словакіі і рэвалюцыйныя прафсаюзы мабілізуюць беспрацоўных, зьяўляецца **патрабаваньне ўвядзеньня дзяржаўнага страхаваньня ўсіх беспрацоўных.** Паводле існуючай сыстэмы правам па дапамогу,—і то толькі на працягу некалькіх месяцаў,—**карыстаюцца толькі рабочыя, арганізаваныя ў прафсаюзах.** Такім чынам, з 700.000 беспрацоўных, мізэрную дапамогу атрымліваюць усяго толькі каля 60.000, а праз некалькі месяцаў іх будзе яшчэ менш.

Адпадушны заклік буржуазіі і сацыял-фашыстаў да расправы над дэманстрацыямі беспрацоўных 25 лютага хутчэй **сьведчыць аб боязьні,** чым аб сіле капіталізму і яго сацыял-фашысцкіх вартавых сабак.

Грамадзкае харчаваньне атрымлівае толькі зусім невялічкая колькасьць беспрацоўных і членаў іх сем'яў. Вельмі нямногім «выбраным» удаецца дабіцца талёну на бурду, якая называецца крупнікам. Да таго-ж засеўшыя ў гарадзкіх муніцыпалітэтах паны разьмяркоўваюць гэтыя талёны сярод прыхільнікаў сваіх партый. Яшчэ большымі зьдзекамі над беспрацоўнымі зьяўляецца збор добраахвотных ахвяраваньняў для беспрацоўных.

Ня лепш стаіць справа і з забесьпячэньнем беспрацоўных жыльлём. Сацыял-фашысцкія журналісты надзвычай красамоўна пераконваюць «сьвядомых дамаўласьнікаў» у тым, што выкідаць беспрацоўных і іх сем'і ў мароз на вуліцу вельмі нядобра. Але гэты аргумант аказвае, відавочна, вельмі слабую ўзьдзейнасьць на «рэспубліканска-мысьлячых» дамаўласьнікаў. Лічба самагубстваў і «злачынстваў» супроць «сьвяшчэннага прынцыпу» прыватнай уласнасьці ўзрасла за некалькі апошніх месяцаў да надзвычайных разьмераў. Ня бачачы перад сабой ніякіх пэрспэктыў і не жадаючы асуджваць сваіх дзяцей на галодную сьмерць, беспрацоўны часта забівае іх, а потым і сябе, карыстаючыся пры гэтым рэвальвэрам, газам, вяроўкай — толькі-б хутчэй унікнуць «шчасьлівай выспы».

БЕСПРАЦОЎЕ У ВЭНГРЫІ

ВЕНА, 20. Сусьветны эканамічны крызіс адбіўся, у першую чаргу, на сельскай гаспадарцы **Вэнгрыі,** гэтай пераважна аграрнай краіны. Зьніжэньне цэн на збожжа ў 1930 годзе амаль **на 50 проц.** прывяло да канчатковага зьбядневаньня многіх селянскіх гаспадарак. Бесьперапынна скарачаецца і прадукцыя амаль усіх галін прамысловасьці. Здабыча **чыгуначнай руды панізілася** на працягу 1930 г. **на 38 проц.,** здабыча **жалеза-сырцу на 20 проц., прадукцыя сталі—на 30 проц.**

Шпарка расьце беспрацоўе. Далёка няпоўныя даныя рэфармісцкіх прафсаюзаў гавораць аб тым, што на працягу мінулага году **беспрацоўе ў Вэнгрыі павялічылася на 28 проц.** Што датычыць агульнага ліку беспрацоўных, дык іх па ўсёй краіне налічваецца, паводле паменшаных даных прафсаюзаў, **да 150.000.** Сюды трэба дадаць яшчэ на меншай меры **200.000 беспрацоўных батракоў.** Уся гэта вялізарная армія беспрацоўных не атрымлівае ніякай дапамогі і накінута разам з сем'ямі на поўную галечу і голад. Галеча і голад кідаюць тысячы беспрацоўных у рады люмпэн-пралетараў, ператвараюць іх у бадзяг, у жабракоў. Выкінутыя дамаўласьнікамі са сваіх кватэр беспрацоўныя разам з сем'ямі, знаходзяцца проста на вуліцах, бараках і скляпох. Паліцыя адносіцца да гэтых выкінутых з буржуазнай грамады пралетараў, як да злачынных элементаў: здымае водпіскі з іх пальцаў, рэгіструе іх, як крымінальных злачынцаў.

Масавае беспрацоўе скарыстоўваецца капіталістамі для жорсткага наступленьня на зарплату рабочых. Буржуазны друк амаль штодзённа паведамляе аб хваляваньнях беспрацоўных, аб вулічных дэманстрацыях, аб рэвалюцыйных выступленьнях. **Урад адказвае на выступленьні беспрацоўных узмацненьнем тэрору паліцэйскай дубінкі і масавымі арыштамі рэвалюцыйных рабочых.**

«К чорту міласьцю», патрабуем страхаваньня ад беспрацоўя,—з такімі пёзунгамі дэманстравалі беспрацоўныя ў Філядэльфіі.

Голад, прастытуцыя, сьмерць

«На Шыпцы ўсё спакойна»... Заходняя Украіна «ўціхамірана». Заходняя Беларусь «супакоєна». Мірна і ягоўна жывуць крэсы Рэчпаспалітай, пад крылом белага арла. І міністэрства ўнутраных спраў «абавязанае клапаніцца аб цішыні і спакоі дзяржавы» абвяшчае нелегальнай ППС-лявіцу, арыштоўвае яе зьезд і пагражае ўсімі карамі тым, хто ўступіць у гэту злачынную арганізацыю. І — «на «Шыпцы ўсё спакойна»

Ці ўсё, аднак, спакойна ў «царстве польскім»? О, далёка ня ўсё. Фашысты ня могуць задушыць рэвалюцыйнага руху. Іх «пацыфікацыя» не дасягае мэты. Іх «просвещенным» задачам перашкаджае крызіс.

У Заходняй Беларусі крызіс паражае ўсе жыцьцёвыя цэнтры. Усё больш і больш пагмыляючыся, ён вядзе да зьбядневаньня мільёнаў, выкідваючы на вуліцу дзесяткі тысяч рабочых, рэйнуючы сотні тысяч сялян. І гэтыя масы ня бачаць выхаду са становішча пры панаваньні фашызму. Павялічваюцца, па прызнаньні самых фашыстаў, «антыдзяржаўныя тэндэнцыі».

Крызіс расьце. Пан ваявода Віленскі Кіртыклис «парашыў устрымацца ў гэтым годзе ад наладжаньня ваяводзкага балю з прычыны дрэннай гаспадарчай сітуацыі краіны. Пан ваявода таксама ні прыме абавязкаў ганаровага гаспадара на ўсіх іншых балёх у гэтым квартале» («Кур'ер Віленскі»), але пан ваявода Кіртыклис узбройвае паліцыю «на вазмежны лад» Віленскай паліцыяй атрыманы два бранявыя вазнага тыпу для дзеяньняў у часе дэманстрацый, абрыяч і г. д. Яны ўзброены кулямётамі і газавымі бомбамі. Паліцыя атрымала панцыры і гумавыя палкі — піша фашысцкая газэта.

«На Шыпцы ўсё спакойна»...

Але... «29-летняя Зося Гуданіс атруцілася воцтавай эсэнцыяй. Прычына самагубства — цяжкія матар'яльныя абставіны».

«Шыдлоўская Ганна, ня маючы пастаяннага месца жыхарства, каля дому № 8 па Бэрнадынскай вуліцы выпіла эсэнцыі з мэтай атруціцца» (якая, аднак, прапярлівасьць фашысцкіх газэт). «На Зьвярынцы быў знойдзен малады мужчына з моцнымі адзнакамі атраўленьня воцтавай эсэнцыяй... Устаноўлена, што гэта — Бардзілоўскі Міхал, беспрацоўны, без пастаяннага месца жыхарства. Другі выпадак — таксама атруціўся воцтавай эсэнцыяй 30-гадовая Станіслава Габіс, якая доўгі час ня мела работы»... Ці патрэбны яшчэ прыклады?

Тысячы беспрацоўных растуць.

У верасьні 1929 году ў Заходняй Беларусі было 5.510 беспрацоўных. У верасьні 1930 г. — 7.360, а ў лістападзе гэтага-ж году — 10.734.

Буржуазія ўсяго сьвету крычыць аб прымусовай працы ў СССР. Але Польшча — не Савецкі Саюз. Польшча — гэта авангард цывілізацыі на мяжы з Азіяй — сказаў калісьці пан Брыян. І ў Польшчы людзі зусім свабодны... паміраць з голаду. Станіславу Гобіс, Міхала Бардзілоўскага, Зосю Гуданіс і тысячы іншых ніхто ня прымушае працаваць. Іх прымушаюць паміраць.

Умовы працы ў Савецкім Саюзе... Паглядзім-жа, паважаныя паны, як наконт гэтага ў вас.

Ці вядома гэта вам — ды адкуль-жа гэта вам можа быць вядома: вы ня чытаеце сваіх газэт — што рабочыя па першапачатковай апрацоўцы ільну гадзінамі стаяць ля хлявоў, каб атрымаць работу, пачынаючы з 5 гадз. раніцы. «Шчасьліўцы, атрымаўшыя работу, заробяць у дзень 1 злоты 25 грошаў (35-40 кап.). Апошнія-ж ідуць дамоў «да пустога гаршчка». Так мэляпхалічна піша фашысцкая газэта «Слова». Батракі атрымліваюць 60-100 пудоў жыта ў год, жывуць у хлявох, тыднямі ня зьнімаючы кажухоў.

«Прымусовая праца ў Савецкім Саюзе»... Паглядзім. Увосень мінулага году з Адэсы адышоў параход «Абхазія» з ударнікамі-рабочымі — каля 300 чалавек у паездку вакол Эўропы.

Сёньня — 25 лютага 1931 году з Вільні выяжджае эшалён работніц, завербаваных на сельска-гаспадарчыя работы ў Францыю. Іх вярбоўка адбывалася 19 лютага ў Сьвянцянах і 21 лютага ў Глыбокім дзяржаўным кіраўніцтвам насяраднітва працы. Яшчэ раней было пасланa 200 чалавек усіх-жа жадаючых ехаць было 800 чалавек. У Францыі таксама ёсьць крызіс, таксама — беспрацоўе. Аднак, францускія капіталісты лічаць за лепшае не скарыстоўваць сваіх беспрацоўных, а імпартаваць іх з Тунісу, Сэнэгалю, Нігерыі і... Заходняй Беларусі. Беларускія работніцы, ня ведаючы мовы, без абароны — прадаюцца ў няволю капіталістам Францыі. Можа быць яго прасьвяшчэнства, архіепіскап Дзяргемскі зробіць з гэтага повяду прадстаўленьне ў парляманце Вялікабрытаніі. Можа быць «пан фінансаў» — Фіш патрабуе ад ураду свабодных забойцаў Сако, Ванцэці і тысяч нэграў, ад ураду Ку-Клукс-Клана пасылкі камісіі на благадатныя палі Шпаніі, Гароны і Луары для абсьледваньня становішча і ўмоў работы беларускіх нявольнікаў у Францыі.

Доўгі час былы міністар яго вялікасьці караля Бэльгіі пан Эміль Вандэрвэльдэ быў у Маскве. Ён паведаў некалькі дамоў зьяўленьня і врабіў у мэмарыяльных кнігах уласнаручныя запісы, якія сьведчаць аб тым, што зьявіленыя ў дамох знаходзяцца ў чалавечых умовах, якія даюць магчымасьць пасьля адбыцьця тэрміну вярнуцца ў грамадзтва да карыснай працы. Ён надрукаваў свае ўражаньні аб гэтай паездцы на СССР. Можа быць ён паведае ў бліжэйшы час у Вільні турму Лукішкі, турмы Сьвентажыцкую і іншыя, якія носяць імёны сьвятых — самы падыходзячы спосаб ужываньня для сьвятых — турмы. Можа быць ён раскажа аб тым, як утрымліваюцца палітзьняволеныя ў гэтых турмах.

«На Шыпцы ўсё спакойна»...

Вы памятаеце, панове, словы Розы Люксэмбург, з поваду рэлігіі Носке аб тым, што «ў Бэрліне ўсё спакойна». «Вы — тупыя лёкаі. Рэвалюцыя непераможна. Яна трубным гукам заявляе аб сваім існаваньні: я была, я ёсьць, я буду».

Вы — таксама тупыя лёкаі, панове. Калі дзесяткі тысяч зьявіленых ад вашых турмах ізаляваны вамі ад вынесьнята міру, калі вы ўкралі Браніслава Тарашкевіча, калі вы адлучаналі сотню тысяч сялян Заходняй Украіны, калі вы ўмярцьвілі ў Луцкіх засьценках некалькі дзесяткаў камуністаў, згвалтавалі камуністак, калі вы замучылі некалькі камсамольцаў — то вы ўжо крычыце — на крэсах усё спакойна.

Ці ня рана, панове?

На ўсходзе вашай краіны ўзьнімаюцца сотні тысяч і мільёны людзей. Ім няма выхаду. У абдымках вашых для іх — галеча, голад, прастытуцыя, сьмерць. Бо ваша-ж міністэрства ўнутраных спраў яшчэ ўчора канстатавала рост прастытуцыі ў вялікіх гарадох. І гэтыя мільёны ня пойдуць на шляху Гобіс, Бардзілоўскага, Гуданіс: яны ня будуць назбаўляць сябе жыцьця. Яны лепш за ўсё пазбавяць жыцьця вас, панове, з тым, каб на руінах вашай магутнасьці стварыць умовы жыцьця, пры якіх ім ня трэба будзе пазбаўляць сябе жыцьця. Яны тады будуць мець пастаяннае месца жыхарства. А вы — вы, панове, таксама будзеце яго мець, — калі не пасьпееце далучыцца да вашых субратоў расійскай эміграцыі — у турмах, пабудаваных вамі для прыгоных. І бранявікі вашай паліцыі будуць абернуты супроць вас.

Вы — тупыя лёкаі. Рэвалюцыя непераможна. Вы памятайце — «няхай пануючыя клясы дрыжаць перад камуністычнай рэвалюцыяй. Пралетарам ў ёй няма чаго траціць апрача сваіх ланцугоў, здабыць-жа яны змогуць увесь сьвет».

Гэты сьвет — будзе намі здабыты.

Л. ЯКАЎЛЕЎ.

5 мільённая армія беспрацоўных у Нямеччыне

3-4 мільёны засуджаны на галодную сьмерць

Сусьветны эканамічны крызіс, які пачаўся ў канцы 1929 году, адразу-ж усім сваім цяжарам абрушыўся на капіталістычную Нямеччыну. Да 15 студзеня 1931 году лік беспрацоўных вырас да 4.765.000, з якіх дапамогу атрымалі 2.120.000, а 1-га лютага 1931 году лічба беспрацоўных дасягнула ўжо 4.894.000. У цяперашні момант лік беспрацоўных у Нямеччыне ўжо **перавысіў 5.000.000.** Гэта — афіцыяльныя лічбы нямецкіх бірж працы, фактычна лік беспрацоўных у Нямеччыне яшчэ вышэйшы, бо канчаткова зьнятыя з дапамогі беспрацоўныя, ня маючы найменшай надзеі трапіць праз біржы працы на работу, у большасьці выпадкаў перастаюць рэгістравацца на біржах працы.

К канцу 1931 году дапамога беспрацоўным будзе скарочана на 12½ проц., прычым у сярэднім мяркуецца выплачваць дапамогі толькі 1.750.000 беспрацоўным. Гэта значыць, **што 3-4 млн. беспрацоўных будуць пазбаўлены ўсякай дапамогі і асуджаюцца на галодную сьмерць.** У асабліва цяжкім стане знаходзіцца беспрацоўная моладзь, лічба якой **перавышае 1 мільён.** Беспрацоўная моладзь у большасьці выпадкаў паогул не атрымлівае ніякай дапамогі на беспрацоўі, бо паводле правіл, уведзеных пры ранейшым сацыял-дэмакратычным міністры працы Віселе, права на дапамогу мае толькі той беспрацоўны, які прапрацаваў дзе-небудзь ня менш аднаго году. У пераважнай большасьці малады беспрацоўны Нямеччыны трапляе на біржу працы яшчэ да таго, як ён год працаваў. У Нямеччыне налічваецца **каля 2-х мільёнаў беспрацоўных—работнікаў разумовай працы.** Лік беспрацоўных інжынэраў-тэхнікаў вырас за 1930 год амаль на **75 проц.** У сувязі з гэтым некаторыя газэты заклікаюць спыніць будаўніцтва новых навучальных устаноў і часткова закрываць ужо існуючыя. Апрача таго, у пачатку студзеня 1934 году ў Нямеччыне налічвалася больш 3.000.000 часткова беспрацоўных, г. зн. рабочых, працуючых толькі некалькі дзён у тыдзень. Лічба частковых беспрацоўных таксама расьце з кожным днём.

Якое становішча беспрацоўных у Нямеччыне? Гэтымі днямі **«Ротэ Фанэ»** паведаміла аб характэрным для становішча беспрацоўных у Нямеччыне выпадку. У чарзе на біржы працы ў Ланцендрэйерэ (Рурская вобласьць) рантам страціў прытомнасьць адзін беспрацоўны. Доктар канстатаваў сьмерць ад вычарпаньня сіл. **Вось пэрспэктыва кожнага беспрацоўнага ў Нямеччыне.** Кіраўніцтва па страхаваньні ад беспрацоўя, у якім амаль усе пасты ад кіруючых да нізавых заняты сацыял-дэмакратамі, кожны дзень зьнімае з мізэрнай дапамогі сотні і тысячы беспрацоўных. Так, напрыклад, беспрацоўны Вільгельм Данц у Бэрліне атрымаў нядаўна паступнае паведамленьне: **«З тае прычыны, што ваша нарачоная мае работу і зарабляе марку ў тыдзень, вам у далейшым дапамога выдавацца ня будзе».**

Асабліваю увагі заслугоўвае ўжываная ў Нямеччыне **сыстэма прымусовай працы для беспрацоўных.** Беспрацоўны, які атрымлівае ў працягу 52 тыдняў дапамогу на беспрацоўі, адзьмаецца з гэтай дапамогі і накіроўваецца бяжай працы на «грамадзкія работы». Гэтыя «грамадзкія работы» зьяўляюцца **ў сапраўднасьці прымусовымі работамі,** на якія гвалтам накіроўваюць беспрацоўных, даючы ім, праўда, «свабодны» выбар: **або памерці з голаду, або выконваць за грошы самую цяжкую работу.** На гэтых грамадзкіх работах высока-кваліфікаваныя рабочыя заняты асушкай балот, пабудовай дарогі і т. д. Высокакваліфікаваны мэталіст у Ганаверы быў пасланы на зямляныя работы **ў Гарц.** Ён піша ў газэту беспрацоўных аб становішчы, у якім ён там знаходзіўся. Сабраныя з усіх канцоў Нямеччыны беспрацоўныя загнаны ў мізэрныя сяк-так скалочаныя баракі. Кормяць іх панаўголодна. Работа брудная, сизыфопратка не выдаецца. За дажджлівыя дні, калі зямляныя работы рабіцца ня могуць, беспрацоўныя ніякай кампэнсацыі не атрымліваюць. Кідаць работу забаронена. **Калі хто-небудзь з беспрацоўных самазольна кідае гэту работу ён пазбаўляецца зароблених грошай і назаўсёды траціць права на атрыманьне дапамогі па беспрацоўі.**

Францыя—у ціскох крызісу

1.350 тысяч беспрацоўных

Ад уплывам эканамічнага крызісу, Усё глыбей захапляе Францыю, там пачынаецца шпаркі рост беспрацоўя, поўнага, так і часткового. У Францыі па дзяржаўнай статыстыкі беспрацоўя, як няма і дзяржаўнага страхаваньня ад беспрацоўя. Даныя адносна беспрацоўных, якія атрымліваюць дапамогу ад мясцовых самакіраўніцтваў—гарадзкіх і камунальных (пасёлкавых),—даюць ніякага прадстаўленьня аб абсолютных разьмерах беспрацоўя. Аб трэх тэмпах росту беспрацоўя даюць дастаўленьне і індэксы руху найму ў порту рабсілы. Калі прыняць індэкс 1913 г. за 100, дык наём рабсілы ў 1930 г. складаў: у першым квартале—[illegible], у другім — 101, у трэцім — 99 і ў чэцьвертым—77, у студзені 1931 г. **Індэкс рэзка зьнізіўся да 45, а ў лютым** (паводле папярэдніх даных) **да 35.** Індэкс попыту рабсілы за тыя-ж адрэзкі часу адпаведна раўняўся: **161, 156, 142, 52 і 40 у лютым 1931 г.**

Францускі ўрадавы дэпэшат Ніжэйшага насяльненьні міжнароднага бюро працы ў Жэнэве ў пачатку лютага бягучаго году, спасылаючыся на абсьледваньні, праводзілася інспэктарамі працы, даў, што колькасьць поўных беспрацоўных ва Францыі складае прыкладна **[illegible] тыс.** Аднак, паміма поўнага беспрацоўя маецца вялізарнае частковае беспрацоўе. Гэты выгляд «паўзучага» беспрацоўя прымае тым большы шырокіз памеры, што ўрад, заклапочаны палітычнымі разважаньнямі, раіць прадпрыемцам, замест часткового звальненьня рабочых, скарачэньне часу работы ўсім наёмным рабочым з тым, каб утрымаць большую колькасьць іх утрымаць на прадпрыемствах.

У вугальнай прамысловасьці паўночнага раёну **ўсе работы былі спынены на студзеня бягучага году. У тэкстыльнай, абутковай прамысловасьці** [illegible] шаецца. У 1930 г. гэта зьмяншэньне набыло кастрафічны характар... Крызіс востра ўдарыў таксама па самаўтужнай прамысловасьці. Працуюць толькі прадпрыемствы ваеннага характару. Але апрача соцень тысяч галодных у гарадох мы маем усё больш узрастаючае беспрацоўе і сярод мас вёскі. 50 проц. дрэваапрацоўчых рабочых, фабрык запалак і гут—гэта рабочыя, якія прышлі з вёскі ў горад шукаць заробку. Гэтыя рэдукаваныя рабочыя, вяртаючыся ў вёску, павялічваюць і без таго вялікую армію галоднага сялянства, зруйнаванага падаткамі, і якое церпіць ад безьзямельля»...

Гэты малюнак досыць яркі, каб уявіць сабе, што робіцца на Заходняй Беларусі і якія вялізарныя разьмеры эканамічнага крызісу, ахапіўшага Заходнюю Беларусь таксама, як і усю Польшчу. Факты і яркія лічбы, прыведзеныя органам ЦК КПЗБ, лепш за ўсё гавораць, у якой страшэннай галечы жывуць працоўныя масы Заходняй Беларусі, якія знаходзяцца пад пятой польскага імпэрыялізму.

У той час, як сотні тысяч і мільёны рабочых і сялян Польшчы і Заходняй Беларусі галадаюць, фашысцкі ўрад Пілсудзкага кідае сотні мільёнаў на ваенныя патрэбы, на турмы, на паліцыю і вялікі апарат адміністрацыі. Падпольны орган ЦК КПЗБ па польскай мове «До валькі» піша у перадавым артыкуле:

«Фашысцкі ўрад тлумачыць, што ня мае грошай для дапамогі беспрацоўным. Але на ваенныя выдаткі ўрад шчодрай рукой выдзячыў у бюджэце на 1931 год—836.000.000 злотых, на падрыхтоўку вайны супроць СССР знаходзяцца ў яго мільярды злотых! На задушэньне рэвалюцыйнай барацьбы, па ўціск рабочых, сялянскай беднаты і нацыянальна-вызваленчага руху працоўных мас Зах. Беларусі і Ўкраіны—фашысцкі ўрад разам з правадырамі ППС, хадэцыі, НПР асігнаваў 125.000.000 злотых па шпікоў, паліцыянтаў і дэфэнзыўшчыкаў».

Польская буржуазія вядзе наступленьне на рабочую клясу. У справе беспрацоўя гэта наступленьне выражаецца ў тым, што буржуазія не дае ўсёй вялізнай армії беспрацоўных ніякай дапамогі, што на кожнае выступленьне галодных мас яна адказвае жорсткім тэрорам, кулямі штыхамі. Няма такой дэманстрацыі беспрацоўных, якая-б ня скончылася праліцьцём крыві. Разьюшаныя банды паліцыянтаў, шпікоў і фашыстаў нападаюць на дэманстрацыі беспрацоўных, якія адбываюцца пад лёзунгамі «хлеба і працы». Гэта наступленьня фашысцкай дыктатуры адбываецца пры непасрэднай дапамозе сацыял-фашысцкіх і нацыянал-фашысцкіх правадыроў. Орган ЦК КПЗБ «До валькі» так піша аб ролі правадыроў ППС, Бунду і іншых сацыял-фашысцкіх партый у барацьбе супроць рабочае клясы, супроць беспрацоўных.

«Сацыял-фашысты, правадыры ППС, ХД, НПР, Бунду супроць барацьбы беспрацоўных. Больш таго, яны актыўна супрацоўнічаюць з фашызмам супроць барацьбы беспрацоўных. Гэта правадыр сацыял-фашызму, былы маршалак сойму Дашынскі лічыў, што паліцыя правільна зрабіла, калі яна арыштавала камуністычнага пасла тав. Жарскага за арганізацыю дэманстрацыі беспрацоўных. Замест барацьбы сацыял-фашысты ашукваюць рабочыя масы, ілюзіямі каншхатэў, перагавораў і гандлю ў прыёмных катаўскіх міністраў, вяводаў і старостаў»...

І адзінай сілай, якая выступае сапраўдным кіраўніком, арганізатарам і авангардам барацьбы беспрацоўных і яшчэ працуючых за іх штодзённыя патрэбы, за хлеб, працу і ўладу зьяўляецца камуністычная партыя. КПЗБ разгарнула шырокую працу сярод беспрацоўных. КПЗБ паваяла актыўную падрыхтоўчую кампанію да 25-га лютага. КПЗБ ясна і выразна гаворыць масам аб тым, дзе знаходзіцца выхад з таго цяжкага становішча голаду, беспрацоўя і галечы, у якім знаходзіцца рабочая кляса і працоўнае сялянства.

«Адзіны сапраўдны выхад з крызісу, голаду, беспрацоўя, ваенных падрыхтовак і тэрору, піша «До валькі» зьяўляецца рэвалюцыйная барацьба за зьвяржэньне капіталістычных урадаў, барацьба за уладу пралетарыяту»...

У сваіх адозвах да шырокіх працоўных мас гораду і вёскі ЦК КПЗБ піша:

«Ня выклянчваньне ў прыёмных катаў працоўных мас—фашысцкіх міністраў і вяводаў, як гэта раяць рабіць сацыял-фашысцкія лёкаі—правадыры ППС, НПР, Бунду, ХД,—а рашучая барацьба беспрацоўных, вялікія магутныя дэманстрацыі ўсіх рабочых як яшчэ працуючых, так і беспрацоўных... вось што павінны рабіць рабочыя, вось да чаго кліча іх кампартыя».

КПЗБ падкрэсьлівае, што прычынай і вінаватымі беспрацоўя, голаду і галечы мас зьяўляецца фашысцкая дыктатура, сыстэма капіталістычнай эксплёатацыі і ўціску, на барацьбу супроць якой неабходна арганізоўвацца мільёнам працоўных

«Сапраўдным вінаватым вашай пастаяннай галечы і ўзрастаючага беспрацоўя—піша ЦК КПЗБ у адозве да працоўных Заходняй Беларусі—зьяўляецца фашысцкая дыктатура. Прычыны цяжкага становішча шырокіх працоўных мас ляжаць у капіталістычнай эксплёатацыі працоўных, ды ў тым фашысцкім парадку, які існуе ў Польшчы і Зах. Беларусі, у парадку тэрору, беспрацоўя, голаду і шалёнай падрыхтоўкі да вайны супроць СССР».

Указваючы масам выхад з крызісу, КПЗБ, ня гледзячы на жорсткі тэрор акупантаў, мабілізуе рабочых і беспрацоўныя масы гораду і вёскі на выступленьні супроць фашысцкай дыктатуры. Да 25-га лютага КПЗБ разгарнула перад масамі працу вакол канкрэтнай праграмы штодзённых патрабаваньняў рабочых і беспрацоўных. Гэта канкрэтная праграма ўвязвецца ў барацьбе за канчатковыя мэты. Вось тыя канкрэтныя патрабаваньні, якія высунула КПЗБ да кампаніі 25-га лютага:

«1) Адназовыя дапамогі беспрацоўным на зіму ў разьмерах 100 злотых за кошт бюджэту на вайну, дэфэнзыву, паліцыю, клер і г. д.

2) Пашырыць паньствовыя дапамогі на ўвесь час беспрацоўя для ўсіх беспрацоўных, уключаючы жанчын і моладзь... Патрабаваць павышэньня дапамог на 100 проц.; патрабаваць пастаяннага забесьпячэньня на выпадак беспрацоўя ў разьмерах сапраўднага жыцьцёвага ўзроўню рабочага.

3) 7-гадзінны дзень працы, 6-гадзінны дзень працы для моладзі. Супроць усякага зьніжэньня заработнай платы, за яе павялічэньне, супроць капіталістычнай рацыяналізацыі, супроць лёкаўтаў і рэдукцый.

4) Забесьпячэньне ўсіх беспрацоўных у больнічных касах і за кошт дзяржавы»...

Канкрэтныя патрабаваньні высунуты і для беспрацоўнай масы батракоў, для беспрацоўных вёскі. КПЗБ увесь час падкрэсьлівае, што барацьба за гэтыя штодзённыя патрабаваньні беспрацоўных будзе пасьпяховай тады, калі беспрацоўныя і яшчэ працуючыя адзіным фронтам будуць выступаць супроць фашызму і сацыял-фашызму. Побач з патрабаваньнямі эканамічнага парадку КПЗБ высоўвае рад палітычных патрабаваньняў і перш за ўсё лёзунгі барацьбы супроць небясьпекі вайны, абароны СССР, барацьбы супроць белага тэрору і г. д. Ва ўсёй кампаніі па арганізацыі рэвалюцыйнай барацьбы беспрацоўных мас вялікую ролю адыгрывае папуляризацыя дасягненьняў СССР. Ліквідацыя беспрацоўя ў СССР выкарыстоўваецца нашай братняй КПЗБ для мабілізацыі мас на абарону СССР супроць антысавецкі

СПРАВАЗДАЧА УРАДУ БССР

Даклад тав. М. ГАЛАДЗЕДА

Таварышы, ад IX-га да X-га Зьезду Саветаў БССР прайшло амаль два гады (1 год 11 мес.). Тэрмін зусім невялічкі. Але гэты параўнаўча невялічкі тэрмін напоўнен вялікімі сацыяльна-эканамічнымі зрухамі, ён напоўнен вялікім аб'ектам працы пралетарыяту ў саюзе пад кіраўніцтвам нашай партыі, па будаўніцтве сацыялізму. Гэты перыяд знаменуе сабой **новы этап пралетарскай сацыяльнай рэвалюцыі.** Ён знамянальны тым, што ў гэтым прамінулым два гады **здбыўся круты паварот у бок разгорнутага і рашучага наступленьня сацыялізму на капіталістычныя элементы на ўсім фронце.**

У гэты перыяд сацыялістычнае наступленьне перарасло ў новую, вышэйшую фазу. Мы ўжо перашлі ў гэтым перыядзе ад палітыкі абмежаваньня і выцісканьня капіталістычных элементаў да палітыкі ліквідацыі кулацтва як класы на грунце суцэльнай калектывізацыі, на грунце суцэльнага паваротку бядняцка-серадняцкага сялянства ў бок сацыялізму.

У рашучай і жорсткай барацьбе з класавым ворагам прайшлі гэтыя два гады. У барацьбе з кулаком і яго саюзьнікамі і ідэолягамі — шкоднікамі і нацдэмамі, у барацьбе з кулацкай агентурай улутры партыі — правымі і «леваымі»-апартуністамі і нацапартуністамі, у барацьбе за генэральную лінію камуністычнай партыі — мы дабіліся вялікіх посьпехаў у будаўніцтве сацыялізму, на ўмацаньні пралетарскай дыктатуры.

Прамінулы двухгадовы перыяд быў знамянальным і пераможным ня толькі для Савецкага Саюзу — у саюзным маштабе, а ён быў знамянальным і пераломным і для капіталістычнага сьвету — у сусьветным маштабе. Але ў нас — у СССР — ён быў пераломным у бок далейшага хуткага ўздыму на крутую вяршыню (вышыню) сацыялізму, а ў іх — у капіталістаў — ён быў пераломным у бок пэўнага скочваньня ў бездань крызісу капіталістычнай эканомікі і ў бездань пятрасалочага крызісу самага грунту ўсяго капіталізму.

За гэты перыяд у нас — у Саюзе ССР — праходзіў і цяпер праходзіць уздым сацыялістычнай эканомікі і росквіт пралетарскай культуры, а ў іх — у капіталістаў — праходзіць развал эканомікі, заняпад і вульгарызацыя культуры, «извращение» быту.

У Савецкім Саюзе растуць і ўзмацняюцца кадры самага рэвалюцыйнага ва ўсім сьвеце пралетарыяту, ліквідавана ў асноўным беспрацоўе, узьнімаецца матар'яльны і культурны ўзровень усіх працоўных мас, у гігантскіх разьмерах праяўляецца творчы энтузіязм рабочых мас і калгасьнікаў,—а ў капіталістаў адбываецца нябачаны націск на рабочую клясу, зьніжэньне зарплаты, зьбяднеьне сотень мільёнаў рабочых і працоўных мас, рост у гігантскіх маштабах з надзвычайнай хуткасьцю беспрацоўя. Адначасова ідзе зьбяднеьне мас — усталяецца разруха і распуста адміраючай буржуазіі.

Вось схематычная паралель, якую можна правесьці на падставе сацыяльна-эканамічных зрухаў, якія адбыліся ў нас і ў іх.

Перад тым, як прыступіць да характарыстыкі дасягнасьці ўраду БССР, я хачу больш падрабязна спыніцца на ўмовах працы ўраду па будаўніцтве сацыялізму — гэта значыць на міжнародным становішчы Саюзу ССР.

Палітычная лінія ўраду БССР—правільная

ЗАСЛУХАЎШЫ СПРАВАЗДАЧНЫ ДАКЛАД СТАРШЫНІ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР ТАВ. ГАЛАДЗЕДА АБ ДЗЕЙНАСЬЦІ ЎРАДУ, X УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ **ПАСТАНАЎЛЯЕ:**

1. ПАЛІТЫЧНУЮ ЛІНІЮ ЎРАДУ ПРЫЗНАЦЬ ПРАВІЛЬНАЙ, АДПАВЯДАЮЧАЙ ЦАЛКАМ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ І ПРАКТЫЧНУЮ ДЗЕЙНАСЬЦЬ УХВАЛІЦЬ.

2. ДЛЯ РАСПРАЦОЎКІ РЭЗАЛЮЦЫІ ПА ДАКЛАДУ ЎРАДУ ВЫЛУЧЫЦЬ КАМІСІЮ.

Крызіс капіталізму і міжнароднае становішча Саюзу ССР

I. Аб эканамічным крызісе капіталістычных дзяржаў

а) Крызіс эканомікі, які адбываецца ў капіталістычных краінах, у сваёй аснове ёсьць структурны, хранічны крызіс капіталістычнай эканомікі. Аснова крызісаў — неправытворчасьць — закладзена ў самой сыстэме капіталістычнай эканомікі, але гэты крызіс адрозьніваецца ад звычайных капіталістычных крызісаў, дзякучы наяўнасьці раду новых асаблівасьцяй.

Тав. Сталін сказаў, што сучасны крызіс у капіталістычных краінах не зьяўляецца звычайным паўтарэньнем капіталістычных крызісаў. Ён праходзіць у некалькі новых умовах. Ён ня толькі супадае, але і перакрыжоўваецца (перапляцаецца) з сельска-гаспадарчым крызісам. Ён закапаў галоўную дзяржаву капіталізму (Амэрыку). Апрача таго, сучасны капіталізм — ёсьць капіталізм манапалістычны, — адсюль барацьба капіталістычных магнатаў за высокія цэны на тавары. Гэты эканамічны крызіс разьвіваецца на базе агульнага крызісу ўсяго капіталізму, які пачаўся пасьля вайны 1914-18 г. г. Цяпер існаваньне ССР — такой дзяржавы, якая займае адну шостую частку ўсяго сьвету і ў якой эканоміка будуецца на новых сацыялістычных асновах, а сам самым выпала з капіталістычнай сыстэмы такая дзяржава, як ССР.

Аб гэтых асаблівасьцях эканамічных крызісаў, якія працякаюць у буржуазных краінах, уже разумеюць і буржуазныя палітыкі і эканамісты. Гэта відаць з таго, што піша правадыр польскіх нацдэмакратаў Дмоўскі ў «Газэце Варшавскей» ад 21-1-31 г.:

«Гэты крызіс — піша Дмоўскі, — ня ў тым сэнсе слова, у якім мы прывыклі, яго ўмяваць, гэта не адзін з тых перыядычных крызісаў, якім здарадала да гэтага часу сусьветная гаспадарка, гэта глыбокі перагарот існуючых да гэтага часу эканамічных адносін. І таму он не (праходзіць так, як праходзілі мінулыя крызісы. Ня верыцца пасьля яго тое, што было да яго...»

Сутнасьць пытаньня заключаецца яшчэ і ў тым, што капіталізм у пасьляваенны час страціў свае рэзэрвы — тыя сельска-гаспадарчыя дзяржавы, якія раней былі базай сырцу і збыту, а таксама і некаторыя калёніі. Гэтыя дзяржавы цяпер самі часткова індустрыялізаваліся, плюс частковая індустрыялізацыя калёній і паўкалёній, як асноўных рынкаў збыту капіталістычнай прамысловасьці, ды плюс палітычны і эканамічны байкот гэтых калёній у адносінах да метраполій (Індыя і інш.). Гэтым самым зьменшыліся манэўраныя магчымасьці капіталізму.

Толькі пралетарыят рэвалюцыйным мэтадам і зможа вырашыць капіталістычны крызіс. Гэта значыць вырашыць яго праз пралетарскую сацыяльную рэвалюцыю.

Мы назіраем цяпер, што з аднаго боку ў буржуазных краінах маюцца вялікія запасы прадуктаў, у тым ліку і сельска-гаспадарчых, з другога боку — расьце жудасны голад мільённых працоўных мас.

Чым-жа гэта тлумачыцца? У чым справа? Як растлумачыць, напрыклад, такое зьявішча, што мільёны працоўных галадаюць, а ў 1930 г. паўднёва-афрыканскія фермэры маліліся богу, каб ён прыслаў ім сарамчу на іх палі.

Капіталісты ў сваіх інтарэсах гнояць тавары і пр[illegible], выраблены рукамі рабочых, для таго, [illegible] на рынках [illegible] і не памяншаць [illegible] капіталістычнага прыбытку.

Іменна ў гэтым сутнасьць капіталістычнай эканомікі і яе супярэчнасьцяй.

б) Як-жа справа фактычна стаіць з капіталістычным крызісам у лічбах?

Прывяду некалькі фактаў, якія сьведчаць аб фактычным становішчы капіталістычнай эканомікі сучаснага перыяду.

Напрыклад, дынаміка прамысловасьці за 10 месяцаў 1930 г. у важнейшых капіталістычных краінах выяўляецца наступным чынам: Паўночна-Амэр. Злуч. Штаты мінус 18,6 проц.; Англія — 8,4 проц.; Нямеччына — 14,2 проц.; Польшча — 26,2 проц.; Францыя плюс 2,5 проц.

Як бачыце, таварышы, Польшча пабіла рекорд у зьніжэньні прамысловай вытворчасьці за 10 месяцаў мінулага году.

в) Аб эканамічным становішчы ў Польшчы.

Быў бы няпоўны малюнак капіталістычнага крызісу, калі-б ня спынім[illegible] асаблівы на эканамічным становішчы нашай суседкі — Польшчы.

Вось як справа з эканамічным становішчам стаіць у Польшчы.

Калі ўзяць індэкс прамысловай прадукцыі ў кастрычніку 1930 г. за 100, то ў сьнежні ён ужо раўняецца 92 проц. — зьніжэньне на 8 проц.

Запас замежнай валюты па гадох выглядае наступным чынам: у ліпені 1928 году ён раўняўся 502 млн. злот., у ліпені 1929 г. — 444 млн. злот., а ў ліпені 1930 г. — 207 млн. злот. Ясна, што цяпер ён упаў яшчэ ніжэй.

Цяпер назіраецца амаль паўсюднае згортваньне (зварачаньне) прамысловасьці па ўсім фронце. Напрыклад, салямяныя капі ў Калушы закрыты, закрыты таксама тэкстыльныя фабрыкі і г. д. Разам з гэтым зьмяншаецца паступленьне падаткаў у дзяржаўную казну. Упадак прамысловай прадукцыі за год у сярэднім вызначаецца на 50 проц. Скарацілася здабыча вугалю в 3.900 тыс. тон у месяц да 2.500 тыс.; жалеза — 159 тыс. тон да 77 тыс тон.

Узровень вугальнай і жалезнай прамысловасьці раўняецца 40-50 проц. даваеннага.

Стальная вытворчасьць скарацілася да 70-75 проц. даваеннага ўзроўню, тэкстыльная вытворчасьць — да 60 проц.

Адначасова карысна назомніць, што ў Савецкім Саюзе яшчэ ў 1930 г. прамысловая вытворчасьць больш, чым у два разы перавысіла даваенны ўзровень.

А як-жа справа стаіць з фінансамі, становішча якіх адначасова сьведчыць і аб гаспадарчым становішчы.

Вось прыклад па пратэсьце вэксалёў. У ліпені 1928 г. было апратэставана вэксалёў на 48 млн. руб., у студзені 1929 г. — на 78 млн. руб., у красавіку — на 101 млн., у ліпені — на 118 млн., у студзені 1930 г. — на 122 млн., у сакавіку — 131 млн.

За ўвесь 1930 г. апратэставана 5 з пал. мільёнаў вэксалёў на суму мільярд трыста пятьдзесят млн. руб.

Зусім ясна, што ў сучасны момант пратэст вэксалёў дасягае яшчэ большай сумы. Аб гэтым гаворыць прыведзеная дынаміка за папярэдні час.

Вось з гэтых лічбаў відаць, якое эканамічнае становішча ў Польшчы, прычым я павінен папярэдзіць, што паказаныя лічбы ўзяты мною з афіцыяльных матар'яваў польскіх установаў, з іхняга друку, у прыватнасьці з часопісі «Эканамість».

Зусім зразумела, што на самой справе становішча іх значна горш, бо яны ня пішуць усяго таго, што ёсьць у сапраўднасьці.

г) Як-жа гэты эканамічны крызіс капіталістычных краін адбіваецца на рабочай клясе і на ўсіх працоўных масах?

Вядома, што каб аслабіць эканамічны крызіс, капіталісты націскаюць на рабочую клясу, зьмяншаюць іх заработную плату, выганяюць рабочых на вуліцу, а разам з гэтым і расьце беспрацоўе.

Характэрнай рысай сучаснага эканамічнага крызісу капіталістычных краін зьяўляецца такі маштаб беспрацоўя, якога яшчэ ня ведаў даваенны капіталізм. Аб гэтым сьведчаць лічбы беспрацоўя па некаторых буйнейшых капіталістычных дзяржавах.

Напрыклад, з пачатку 1930 г. у Паўночна-Амэр. Злуч. Штатах было 5 млн. беспрацоўных, а ў кастрычніку 1930 г. колькасьць беспрацоўных вырасла да 9 млн., ці павялічэньне на 80 проц.; у Нямеччыне за гэты-ж час — з 3.500 тыс. беспрацоўе вырасла звыш 4 з пал. млн., ці рост на 28,6 проц.; у Англіі з 1.500 тыс. — да 4-х млн. чалавек — рост на 166,7 проц.; у Польшчы — з 300 тыс. да 400 тыс. чалавек, ці рост на 33,3 проц. (Гэта паводле афіцыяльных вестак, а паводле сапраўдных вестак у Польшчы [illegible] ахопвена больш мільёну чалавек).

Беспрацоўных у капіталі[illegible] [illegible] інах налічвалася ў кастрычніку 1929 г. 17 млн., у кастрычніку 1930 г. — 30 млн. Паводле апошніх вестак, цяпер налічваецца звыш 50 млн.

Вось вам яркі малюнак аб росьце беспрацоўя, а г. зн. і аб згортваньні капіталістычнай вытворчасьці, у той час, калі ў нас, у СССР, беспрацоўе ў асноўным ліквідавана яшчэ ў 1930 г.

Значыць, паводле афіцыяльнага вылічэньня беспрацоўных у капіталістычных дзяржавах налічваецца звыш 50 млн., а калі ўзяць яшчэ няўлічаных, дык іх будзе яшчэ менш, а значна больш. Адсюль голад і галеча. Калі ўзяць лік працоўных (жонак і дзяцей беспрацоўных), якія таксама церпяць голад і голад ад беспрацоўя, то агульная лічба дасягне ня менш 200 млн. чалавек.

Іменна адсюль і нарастаюць сацыяльныя супярэчнасьці ў капіталістычных краінах, уздым рэвалюцыйнага руху, на ўсіх капіталістычных краінах прахо-дзіць кансалідацыя рабочае клясы і г. д.

Уздым рэвалюцыйнага руху характарызуецца, напрыклад, тым, што за апошнія часы ў капіталістычных краінах назіраецца значны рост палітычных забастовак, разьвіцьцё партыйнага руху, выступленьня беспрацоўных, супытчкі іх з паліцыяй, шэсьце грамадзянская вайна ў Кітаі, якая з кожным днём разрастаецца, разьвіцьцё рэвалюцыйна-нацыянальнага руху ў Індыі і г. д.

Вось вам кароткі малюнак сацыяльна-эканамічных зрухаў у капіталістычных краінах.

На гэтым фоне адначасова можна назіраць і значную няўпэўненасьць, разброд і замяшанасьць буржуазіі капіталістычных краін.

Аб гэтым гаворыць наступны прыклад. Газета «Кёльнішэ Цэйтунг» ад 25-XII—30 г. піша наступнае:

«Ці зможам мы правесьці капіталістычную гаспадарчую сыстэму, якая пабудавана на ідэях прыватнай уласнасьці, ня абароны і ня разьвіцьця праз бражэньне гэтага смутнага часу».

Гэта гаворыць аб няўпэўненасьці буржуазіі ў заўтрашнім дні.

II. Аб узаемаадносінах СССР і капіталістычных дзяржаў

Як-жа гэты глыбокі і няўмольны крызіс капіталізму адбіваецца на міжнародных суадносінах паміж асобнымі капіталістычнымі дзяржавамі і асабліва на адносінах капіталістычных дзяржаў да СССР.

Сучаснае эканамічнае становішча капіталізму — яго ўпадак, і эканамічнае становішча СССР — яго бурны рост — зьяўляюцца асноўнымі фактарамі, якія вызначаюць міжнародную палітыку і ў першую чаргу палітыку капіталістаў у адносінах да СССР.

Наш рост на фоне катастрафічнага ўпадку капіталістычных краін выклікае шалёную злосьць з іх боку да Савецкага Саюзу.

На 1Х-м зьезьдзе саветаў я прыводзіў прыклады міжнародных падзей, вызначаючых зьнешнюю абстаноўку нашай работы.

А што было за перыяд ад 1Х да Х-га зьезду на міжнародным арэне, можа капіталісты давалі нам спакойна працаваць? Зусім ня так. Капіталісты ў гэты адрэзак часу рабілі ўсялякія «хозьні» Савецкаму Саюзу, імкнуліся нарушыць нашу працу па будаўніцтве сацыялізму, імкнуліся і імкнуцца сарваць нашу пяцігодку.

Вось кароткі пералік важнейшых міжнародных здарэньняў за гэты час, які гаворыць аб тым, што нам не давалі спакойна працаваць.

25 мая 1929 г. газэта «Маскаў-Рунінаў» (Московское Обозрение) апублікавала тэкст тайнай польска-французкай канвэнцыі ад 19-IX—22 г. і дадатковыя згоды, падпісаныя 12-V — 28 г. У канцы мая 1929 г. Польшча дэманстравала свае паводзіны ў адносінах да СССР тым, што праводзіла ўрачыстасьці з прычыны абвяшчэньня несалежнасьці меншавіцкай рэспублікі Грузіі, і на гэтых урачыстасьцях прысутнічалі прадстаўнікі польскай улады.

За гэты час адбыліся і такія факты, як напрыклад: дзяржавы Малай Антанты зрабілі акт замацаваньня блёку супроць Савецкага Саюзу, на канфэрэнцыі гэтых дзяржаў працягнулі дзейнасьць сваіх дагавораў на 5 год.

Калі ў Варшаве адбываўся зьезд заўрабежных палякаў, дык Польшча дэманстрацыйна не дапусьціла на зьезд делегатаў польскага насельніцтва ад СССР.

Далей, кітайскія ўлады ў Харбіне захапілі тэлеграф Кітайска-Ўсходняй чыгункі, закрылі памяшканьні гандлёвага прадстаўніцтва, аддаленьняў Дзяргандлю, Тэкстыльсындыкату, Нафтасындыкату і Саўгандальфлёту, адхілілі ад кіраваньня Кітайска-Ўсходняй чыгункай т. Яншанава. (Я гавару аб канфлікце на Кітайска-Ўсходняй чыгунцы).

Далей у Варшаве быў падпісаны пратакол і рад эканамічных (?) згод паміж Румыніяй і Польшчай.

Потым напад польскіх фашыстаў на савецкае консульства на Львове. А потым усім вядомы факт аб выкрыцьці ў дымаходзе будынку паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Варшаве пікельнай машыны вялізарнай сілы.

Гэты факт быў яўнай правакацыяй да вайны з СССР. Характэрным зьяўляецца тое, што, ня гледячы на шматразовыя пратэсты в боку Савецкага ўраду і на запатрабаваньні, каб тлумачыць у гэтай правакацыі былі прыцягнуты да адказнасьці, — Польшча нічога не зрабіла.

Я вам пералічыў некаторыя прыклады з тысячы іх, якія адбыліся за гэты час на міжнародным арэне.

Сьледам за гэтым мы перажылі кампанію супроць Савецкага Саюзу, якая была праведзена на чале з папай рымскім пад сьцягам «абароны рэлігіі». Вы памятаеце, што папа рымскі апублікаваў ліст да вікарнага кардынала Палітыя з радам выпадаў супроць СССР, а потым у каталіцкіх касьцёлах адбываліся супроцьсавецкія набажэнствы пад сьцягам «супроць прасьледаваньня рэлігіі ў Савецкім Саюзе». Потым папа рымскі Пій абвясьціў аўтаномнай камісію «Про Русию», мэта якой зьявілася займацца праваслаўнай царкоўй у Расіі в тым, каб падпарадкаваць яе Рыму.

Сьледам за гэтым ва Францыі была абвешчана кампанія так званай «куцепаўшчыны».

Усе пералічаныя факты ёсьць факты аднаго зьместу і адной мэты.

Апошні акт, найбольш буйны па сваім маштабе, гэта тое, што французкі імпэрыялізм імкнуўся і імкнецца ўтварыць адзіны фронт супроць СССР. Мэмарандумам Брыяна абвяшчаецца арганізацыя «пан-эўрапэйскі саюз», але гэты фронт пакуль што на зусім гладка скалочваецца, бо Італія, Турцыя і Нямеччына выказаліся за ўдзел СССР у канфэрэнцыі «Пан-Эўрапэйскага Саюзу».

Вось [illegible] абставіны працы Савецкага Саюзу. Але ўрад Саюзу ССР, видучы няўхільную палітыку міру, змог ухіліцца ад усіх гэтых праваканый, выкрываючы іх. Видучы самастойную палітыку, палітыку міру, ён дабіўся мірнага ўрэгуляваньня ўсіх гэтых канфліктаў, пашырыў свае эканамічныя і палітычныя адносіны з розными дзяржавамі і ўзмацніў адносіны з тымі, з якімі і раней яны былі больш-менш нармальныя.

Вось некалькі прыкладаў гэтага:

17-V 1929 г. у Рэвэлі быў падпісан савецка-эстонскі гандлёвы дагавор.

11-VI у Афінах падпісана гандлёвая згода паміж Грэцыяй і Саюзам ССР. Паміж Пэрсіяй і ССР падпісана згода аб абмене паштовымі пасылкамі.

Падпісана таксама англа-савецкая згода аб аднаўленьні дыпляматычных адносін.

У Ангары падпісан савецка-турэцкі пратакол аб працягу дагавору пра прыязьнь і нэйтралітэт паміж Турцыяй і СССР.

Наш урад ССР падпісаў згоду з Італіяй аб пашырэньні гаспадарчых узаемаадносін і аб прадастаўленьні крэдытаў па савецкіх заказах.

Значыцца, з паказаных фактаў відаць, што на ўсе ўчынкі капіталістычных дзяржаў наш урад адказвае мірнай палітыкай і імкненьнем пашырыць палітычныя і эканамічныя ўзаемаадносіны з радам замежных дзяржаў.

Што-ж зараз зьяўляецца характэрнай рысай для характарыстыкі міжнароднага становішча Саюзу ССР?

Зараз мы назіраем новае ажыўленьне цікаваньня Савецкага Саюзу з боку капіталістаў. Зноў буржуазная прэса перапоўнена супроцьсавецкім цікаваньнем. Зноў у газэты пачынае пахнуць порахам. Усіх фактаў, якія сьведчаць аб ажыўленьні ў буржуазных дзяржавах супроцьсавецкага цікаваньня, пералічыць няма ніякай магчымасьці, ды важнейшыя з іх публікуюцца ў нашым друку.

Прывяду толькі некаторыя. Напрыклад, зноў стварацца ў цьвёрдалобай Англіі «лігі барацьбы з Савецкім Саюзам», зноў зьяўляцца прапановы аб эканамічнай блёкадзе СССР з боку капіталістычных краін.

Зноў у гітанцкіх разьмерах ажывілася кампанія супроць так зв. савецкага «дэмпінгу» і выдумляецца ўсялякая хлусьня, што нібыта ў СССР ёсьць «прымусовая» праца на несазагатоўках. Зноў паяўляцца весткі ў польскім друку аб марах польскіх дзеячоў аб пашырэньні меж «Жэчы Паспалітай». Мільёны вымыслаў, хлусьні і пакёпы на Савецкі Саюз пускаюцца ў ход, зноў выплывае на арэну папа рымскі Пій і архібіскупы чэха-славакіі. Кардачы і г. д. і г. д.

У чым тут справа? Ды вельмі проста. Эканамічны крызіс у капіталістычных краінах сьцягае моцным ланцугом горла капіталізму. Грунт капіталізму хістаецца, як ад землятрасэньня, і няма выйсьця з тупіка, у які зайшоў капіталістычны сьвет.

На адным сходзяцца ўсе капіталісты — гэта на тым, што капіталістычны крызіс можа быць вырашан за кошт СССР. Адсюль і вырастае ваенная небясьпека.

Відома, што галоўнай прычынай крызісу капіталістычнай эканомікі зьяўляецца звужэньне рынкаў збыту. Рынак, як адна з трох умоў Марксавай тэорыі разьвіцьця капіталістычнай сыстэмы, парушыў сваю роўнавагу. Таму перад капіталістамі стала праблема перадзелу сьвету праз імпэрыялістычную бойку ў вострай форме.

А ва ведаеце, што Савецкі Саюз прадстаўляе вялізны рынак, які выключыўся пасьля Кастрычніка з капіталістычнай сыстэмы. Ён, СССР, адначасова прадстаўляе прыманку. Сваёй узрастаючай сацыялістычнай сыстэмай СССР прадстаўляе вялікую нагрозу для існаваньня капіталістычнай сыстэмы.

Вось вам адсюль і цікаваньне Савецкага Саюзу і імкненьне капіталістаў ліквідаваць цыгадзь сацыялізму. Адсюль і барацьба з савецкім экспартам, байкот пра «дэмпінг» і пра «прымусовую» працу ў Саюзе ССР.

Да рэчы, само слова «дэмпінг» зьяўляецца словам англа-саксонскага паходжаньня. І калі вы возьмеце гісторыю ангельскага, амэрыканскага ды французкага экспарту, то там, як і ў іншых дзяржавах тавары зазуёды вывозіліся на замежныя рынкі на значна ніжэйшых цэнах, чымся ўнутрырынкавыя. Аб гэтым гаворыць матар'ялы самых капіталістычных дзяржаў. Злучаныя Штаты былі і застаюцца краінай «дэмпінгу». Экспартная палітыка Злучаных Штатаў непарыўна зьвязана з «дэмпінгам». Экспартныя цэны Амэрыкі ніжэй унутрэшніх на наступныя процанты. Напрыклад, Амэрыка прадае на замежным рынку палоса-вае жалеза на 51 проц. ніжэй, чымся ўнутраны продаж; тоўстае жалеза — на 35 проц., судновае жалеза — на 32 проц., аўтамабільнае — на 21 проц. і г. д.

Эўрапэйскія капіталістычныя краіны таксама не адстаюць ад Амэрыкі. Зусім нядаўна цьвёрдалобым кансэрватарам Англіі Балдуінам было заявана наступнае, што:

«Увесь кантынгент, што здабывае сталь, скарыстоўвае нам (ангельскі) рынак, як «дэмпінгавае» поле для яго лішкавай падукцыі. Злучаныя Штаты, такім чынам, скарыстоўваюць нашу краіну, як шчасьлівае паляўнічае поле, калі іх уласнае абсалютна абароненае поле заводзіна. Замежныя сталёвыя заводы маюць добрую магчымасьць разьмяшчэньня каля трох пятых сваёй прадукцыі на ўнутраным рынку, а рэшты двух пятых па цане ніжэй сабекошту ў Вялікабрытаніі, тым самым прымусячы страту Брытанскай сталёвай прамысловасьці»... (газэта «Таймс» ад 20-V 30 г.).

Францыя здаўна ўжывае сыстэму экспартных прэмій. «Сьндыкаты чыгуначныя, вугальныя, нітачныя і інш. ня раз садзеяічалі «дэмпінгу», даючы сваім членам экспартныя прэміі» — з кніжкі «Тарыф» — Дакцыянары (стар. 277).

Вось гэта самае англа-саксонскае слова «дэмпінг» заўзята паўтарае і польскі друк.

У апошні час мы назіраем шалёную кампанію польскіх газэт супроць савецкага «дэмпінгу».

Як-жа ў Польшчы стаіць справа з экспартам?

Па-мойму, першае месца ў справе «дэмпінгу» трэба па праве даць Польшчы. Польшча адкрыта ўжывае сыстэму экспартных прэмій. Пшаніца, авёс, ячмень, мука крупы і г. д. — да ўсіх гэтых тавараў шырока ўжываецца сыстэма дзяржаўнага экспартнага прэміраваньня. Каля 70 проц. усяго польскага экспарту дэмпінгуецца.

Паводле даных «Эканаміста» польскае міністэрства фінансаў павінна «на працягу першых 7-мі месяцаў бягучага бюджэтнага году (г. зн. да 31 кастрычніка 1930 г.) заплаціць больш 50 млн. злот. экспартных прэмій» («Эканомист» ад 13-IX 30 г.).

З агалошаных фактаў выразна відаць, што паконт савецкага «дэмпінгу» хлусьнь. Ды аб гэтым і буржуазныя газэты ўжо пішуць самі.

«Манчэстэр Гардыэнно Уітэль» ад 26 кастрычніка 1930 г. пісала адносна кампаніі супроць савецкага экспарту наступнае:

«Вельмі магчыма меркаваньне, што крыкі супроць савецкага «дэмпінгу» зьяўляюцца толькі заслонай, пазіцыі крыкаў супроць рэлігійных зрасьледваньняў для утварэньня палітычнай камбінацыі супроць СССР».

Вось, таварышы, як сапраўды стаіць справа. Дык ці ня ясна з паказаных фактаў, што гэта шалёная агітацыя супроць савецкага экспарту ёсьць дымавая заслона перад ваенным наступленьнем імпэрыялістаў на Савецкі Саюз? Ці-ж ня ясна, што яны хочуць сарваць нашу пяцігодку, бо яна-ж ім цяпер вельмі страшная. Адсюль іменна і такое зьявішча, як шалёная падрыхтоўка да вайны.

Таксама-ж стаіць справа і з агітацыяй супроць «прымусовай» працы. Яны забылі, што ў іх сёньня яшчэ працуюць рабы і што паміраюць людзі з голаду, працуючы за нізкую зарплату, і г. д., і г. д.

III. Аб ваеннай небясьпецы і задачах абароны СССР

З раней прыведзеных лічбаў і фактаў відаць, што ва ўсіх галінах капіталістычнай эканомікі назіраецца крызіс і развал. Але я павінен сказаць, што ў іх у адной галіне прамысловага будаўніцтва вызначаецца рост — гэта ў ваенная прамысловасьці.

Для таго, каб такія вынікі пацьвердзіць, я прывяду вытрымку з адной нямецкай газэты. Вось што піша аб гэтым газэта «Дойчэ Альгэмэйнэ Цэйтунг» ад 16-I 31 г.:

«Тэрмін падрыхтоўкі вайны з СССР кароткія. Польская ваенная прамысловасьць ахапляе 100 фабрык, якія даюць дзьве трэціх польскага рыштунку. Адна трэць у прыватнасьці цяжкія гарматы, зэнітныя гарматы і буйныя танкі Польшча атрымлівае з-за межы.

Польская ваенная прамысловасьць выпускае кожны месяц 18.000 вінтовак, 500 кулямётаў, 20 гармат, 40 самалётаў, 20 мільёнаў вінтовачных і кулямётных патронаў, 60 тысяч зваладаў. Вытворчая магутнасьць гэтых фабрык можа быць хутка павялічана ў пяць раз.

Гэтае вялізарнае накапленьне ваенных матар'ялаў у сваю чаргу штурхае Польшчу на пабудову новых фабрык за кошт іншых галін гаспадаркі.

У 1930 г. у Тарнове пабудавана другая фабрыка ўдушлівых газаў (адна ўжо ёсьць у Кожане), на што асігнавана было 100 млн. злотых.

Асноўным дастаўшчыкам зьяўляецца Францыя. У Нэрбургу знаходзіцца пастаянная польская камісія на куплі ваенных матар'ялаў. Адзуль ваенныя матар'ялы перакідваюцца непасрэдна ў Гдыню. Польская палявая артылерыя 1929 г. поўнасьцю адноўлена і заменена французкімі 75міліметроўскамі. Газэта вылічвае колькасьць ваенных самалётаў у Польшчы ў 540 супроць 180 у 1928 годзе».

Ну, а калі яшчэ дадаць да гэтага такі факт, што цяпер назіраецца ў шалёнай парадку ў Польшчы будаўніцтва стратэгічных чыгуначных і шосавых дарог, якія вядуць да мяжы з СССР і Данцыгскага калідора, — гэта ўсё выразна нам гаворыць аб падрыхтоўцы буржуазіі, у першую чаргу фашысцкай Польшчы да вайны супроць СССР.

Чым растлумачыць той факт, што ваенная прамысловасьць ва ўсіх капіталістычных краінах не падпадае крызісу, а расьвітае. Справа ў тым, што капіталістычныя дзяржавы шалёнымі тэмпамі рыхтуюцца да нападу на Савецкі Саюз. Аб тым, што яны рыхтуюцца да вайны, ёсьць шмат прызнаньняў і самога буржуазнага друку.

Вось адкрытыя думкі многіх імпэрыялістаў наконт вайны супроць Савецкага Саюзу.

Орган манапалістычнага капіталу Нямеччыны «Кельнішэ Цэйтунг» ад 1-I—31 г. такім чынам малюе пэрспэктывы Эўропы:

«Напружанасьць адносін якая тоіцца ў атмасфэры 1930 г., рэўнаванна той, якая была напярэдадні нашэсьця дзесяцігодзьдзя таму назад — сусьветная вайна...

Іскры ляцяць да парахавой бочкі, і правільны заклік у гэту новагодню ноч ня ёсьць вясёлы тост у гонар наступаючага году, а сур'ёзны зварот да кожнага і да ўсіх: сьпяшаецца, іначэй будзе позна».

Таксама і польскі друк як ужо было сказана, ажывіў сваю злосную кампанію супроць Савецкага Саюзу. Амаль кожны дзень польскія газэты зьмяшчаюць артыкулы і друкуюць паведамленьні аб выступленьні польскіх палітычных і дзяржаўных дзеячоў, накіраваныя супроць Савецкага Саюзу.

Я ня буду вам прыводзіць такіх шматлікіх фактаў адкрытых прызнаньняў імпэрыялістаў у сваіх думках і іх закліку да вайны, а прывяду толькі адзін прыклад, які гаворыць аб тым, якую ролю для сябе адводзіць Польшча ў падыходзячых сутычках.

Вось што піша вядомая «Газэта Варшавска»:

«На самой справе нам (гэта—Польшчы. М. Г.) прызначана роля жандара камуністычнай Расіі, — вартаўніка калючага дроту».

Гэта, таварышы, заключны акорд. Няхай яны падумаюць над тым, якую ролю польскія фашысты адыгрываюць перад капіталістычнай Эўропай.

Аказваецца, паводле прызнаньня самой «Газэты Варшаўскай», Польшча бярэ на сябе ролю жандара заходня-эўрапэйскага капіталізму. Ды на іншую ролю яны балай і нягодны. Яны ніяк ня хочуць растацца з жандарскай практыкай былой царскай Расіі.

Як і напярэдадні вайны 1914 г., так і зараз Людэндорф выпусьціў кніжку пад назвай «Война грядет».

Некаторыя вытрымкі з гэтай кніжкі я мушу вам прывесьці.

Ён піша: «вайна ёсьць ужо сёньня справа німінучая, німінучая да такой ступені, што чалавек, які ўважліва сочыць за падзеямі ў Эўропе, можа назваць акрэсьліць больш-менш дакладна момант не выбуху. Прадракальным тэрмінам будзе 1932 г...»

Дык вось, таварышы, аб чым піша сам буржуазны друк. У гэтым разрэзе жарыма прасачыць, якую ролю адыгрываюць сацыял-здраднікі з II-га Інтэрнацыяналу. Аказваецца, што толькі яны імкнуцца затуманіць галовы рабочым Заходняй Эўропы і тым самым дапамагаюць капіталістам прыкрываць свае шалёную падрыхтоўку да вайны.

У той час, калі чэха-славакі архібіскуп Кардач зьмясьціў свае інтэрв'ю ў «Абсэрватэрыо — Романо», у якім заяўляе, што «бяда тым народам, якія з сёньняшняга становішча не ўяўляюць сабе справы і ня бачаць тэй катастрофы, якая набліжаецца... Нам час пасьпеў да сусьветнай рэвалюцыі...»

І далей заклікае: «калі нашы ўрады і нашы капіталісты ня прымуць асноў хрысьціянства, увесь сьвет будзе зьнішчан праз чырвоне мора полымя...»,— у гэты час сацыял-здраднікі і сацыял-фашысты супакойваюць працоўных Заходняй Эўропы, брашучы ў сваіх газэтах аб тым, што ў сьвеце новага нічога ня здарылася, і марыць аб тым, што сацыялізм прыйдзе сам па сабе, бяз усякай сацыялістычнай сустрэчы.

Гэта значыць, прапаведуюць аб урастаньні капіталізму ў сацыялізм, як Бухарын прапаведваў у нас аб урастаньні кулака ў сацыялізм.

Прапаведуць сацыял-фашыстаў аб мірным урастаньні капіталізму ў сацыялізм навау ужо прыслася і буржуазіі.

Дык вось, таварышы, пасьля ўсяго сказанага аб міжнародным становішчы ці незразумела, што значае так пагрэбуўка капіталістычных сіл, якая цяпер у Эўропе праходзіць, ці не зразумела і тое, чаму нам Пілсудскі «па дарозе» у Мадэру заехаў у. Парыж і нёў там перагаворы. Ясна, што ён заключыў рэпаратацыі.

II. Вынікі і задачы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва СССР і БССР

I. Асноўныя вынікі сацыялістычнага будаўніцтва па Саюзе ССР

Лепш за ўсё вынікі нашай работы за справаздачны перыяд могуць характарызаваць лічбы і факты, і гаму дазвольце мне прывесьці некалькі паказальнікаў аб росьце сацыялістычнай гаспада

М. ГАЛАДЗЕД; даклад на X Усебеларускім зьезьдзе саветаў*)

II. Балянс работы ўраду БССР па сацыялістычным будаўніцтве за пэрыяд ад IX да X зьезду саветаў БССР

Перш за ўсё, таварышы, я павінен вам зьезьдзе, што тая пяцігодка, якая была ацэньвана IX усебеларускім зьездам саветаў, у асноўным вамі выконваецца з посьпехам, з перавыкананьнем яе па асноўных галінах разьвіцьця народнай гаспадаркі.

Па тых лічбах і фактах, якія я вам у далейшым агалашу, мы прыходзім да, мабадаў, што **пасьпяховае выкананьне пяцігодкі БССР ператварае Беларусь у сапраўдную індустрыяльную краіну і ў краіну буйных сацыялістычных фабрык жывёлагадоўлі і тэхнічных культур. Так мы можам фармуляваць асноўныя вынікі нашай работы за міжзьездаўскі пэрыяд. Рост прамысловасьці і рост сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі на шляху калектывізацыі зьяўляецца характэрнай рысай вынікаў нашай працы.** Што-ж гавораць аб гэтым факты? А вось наступнае:

а) Канкрэтныя вынікі працы па індустрыялізацыі БССР.

Валавая прадукцыя прамысловасьці БССР пяцігадовым плянам за пяць год памнажалася вырабіць на суму 2.313.650 тыс. руб. Калі ўзяць тое, што мы выканалі за першыя два гады пяцігодкі, і тое, што мы выканаем за 1931 год, то аб'ём валавой прадукцыі будзе раўняцца 1.573.091 тыс. руб., або за тры гады пяцігодкі мы выканаем 68 проц. валавой прадукцыі ўсёй прамысловасьці, найбольш хутка ідзе металёвая прамысловасьць, на якой за першыя два гады і за 1931 г. выкананецца 86 проц. усяго аб'ёму прадукцыі за пяць год. На прамысловасьці НКГандлю выконваецца 91,4 проц. і на мясцовай прамысловасьці — 89,1 проц. усяго аб'ёму пяцігодкі.

Капітальныя ўкладаньні за ўсе пяць год пяцігодкай вызначаліся ў суме 347.412 тыс. руб., а за першыя два гады пяцігодкі і за 1931 г. разам укладаецца 178.525 тыс. руб., або 72,3 усёй пяцігодкі. Найбольшы процант капітальных укладаньняў — рост па прамысловасьці НКГандлю — 91,3 проц., а на мясцовай прамысловасьці ў 1931 г. аб'ём капітальных укладаньняў будзе ўжо перавыкананы на 14,1 проц.

Вось, таварышы, з агалошаных лічбаў аб валавой прадукцыі і аб капітальных укладаньнях можна ўжо бачыць, што лёзунг: «Пяцігодка — за чатыры гады» ў галіне разьвіцьця прамысловасьці БССР палкам забясьпечан. Больш таго, па многіх галінах нашай прамысловасьці мы пяцігодку выканаем за 3 з пал. і за 3 гады.

[illegible] ранымі дасягненьнямі ў 29[illegible] ага будаўніцтва, я на[illegible] і факт недавыкананьня задач. Гэта на наступных паказальніках: на прадукцыйнасьці працы мы недавыканалі заданьняў пяцігодкі за першыя два гады, па зьніжэньні сабекошту мы таксама ідзем ніжэй ператаваньняў пяцігодкі. Гэта, таварышы, зьяўляецца вялікім мінусам у нашай працы, бо ўсім ужо вядома, што недавыкананьне плану і проц. на зьніжэньні сабекошту абыходзіцца нам ва многа мільёнаў рублёў, таксама і недавыкананьне на павышэньні прадукцыйнасьці працы абыходзіцца ва многа мільёнаў рублёў, якія мы маглі-б дадаткова ўкласьці ў індустрыялізацыю БССР. З гэтага трэба зрабіць ца зьезьдзе саветаў адпаведныя высновы і падкрэсьліць перад рабочымі БССР, што посьпехі нашай працы, якія мы маем у галіне прамысловага будаўніцтва і ў выкананьні пяцігодкі, яшчэ не даюць нам права супакоіцца на гэтых дасягненьнях і што нам трэба палягаць са ўсёй сілай пралетарыяту на выкананьне якасных паказальнікаў, г. зн. павышэньне прадукцыйнасьці працы, зьніжэньне сабекошту і асабліва павышэньне якасьці прадукцыі.

Як справа стаіць з ростам рабочых кадраў у прамысловасьці і з паляпшэньнем матар'яльнага становішча рабочых кадраў у перайманьні з пяцігодкай? Гэта можна ўбачыць з наступных лічбаў: як асоб наёмай працы вызначаўся во аноўні год пяцігодкі ў разьмеры 246,3 тыс. чалавек, а ў 1931 г. паводле кантрольных лічбаў прырост рабочых і ўсяго наёмнага персаналу нам вызначаецца ў 461,7 тыс. чалавек. Гэта значыць, што мы ў 1931 г. перавыкананем усю пяцігодку на 26,1 проц., прычым рост рабочых на чыгуначным транспарце і асабліва рост будаўнічых рабочых перагнане рост іншых галін народнай гаспадаркі ў сэнсе павялічэньня рабочых кадраў.

Сярэдняя гадавая зарплата ў грашовым выяўленьні на ўсёй народнай гаспадарцы БССР вызначалася на аноўні год пяцігодкі ў 816 руб., а ў 1931 г. лічбы ўстаноўлена на кантрольных лічбах 876 руб. Значыць, мы пяцігодку перавыконваем у 1931 г. на 7 проц., прычым і ў зарплаце рабочых, занятых на будаўніцтве, апярэджваюць рабочых іншых галін. Зарплата будаўнічых рабочых павысілася ў 1931 г. супроць аноўнага году пяцігодкі на 19,7 проц.

Да паляпшэньня матар'яльнага становішча і быту рабочых адносіцца яшчэ і такія артыкулы выдаткаў, як сацыяльнае страхаваньне, дапамога на часовай непрацаздольнасьці, дапамога на інвалідасьці і фонд мацярынскай дапамогі.

Фонд сацыяльнага страхаваньня на прыбытках вызначаўся на аноўні год пяцігодкі ў суме 33.950 тыс. руб., а ўстаноўлены намі прыбытак на 1931 год па фондзе сацыяльнага страхаваньня вызначаецца ў суме 44.977 тыс. руб., або перарастае ў 1931 г. аноўні год пяцігодкі на 32,5 проц. Па выдатках фонд сацыяльнага страхаваньня вызначан на аноўні год пяцігодкі ў 33.797 тыс. руб., а фактычна намі зацьверджаны на 1931 год у суме 44.920 тыс. руб., або перавышае аноўні год пяцігодкі на 32,9 проц.

Фонд дапамогі па часовай непрацаздольнасьці на 1932-33 год — аноўні год пяцігодкі — вызначаўся ў 7.913 тыс. руб., зацьверджан намі на 1931 год у разьмеры 12.238 тыс. руб., або перарастае пяцігодку на 54,7 проц.

Фонд дапамогі па інвалідасьці на аноўні год пяцігодкі вызначаўся ў 6.699 тыс. руб., зацьверджаны намі на 1931 год у 5.698 тыс. руб., або выкананьне пяцігодкі за першыя тры гады на 85,1 проц.

Фонд мацярынскай дапамогі на аноўні год пяцігодкі вызначаўся ў 6.499 тыс. руб., зацьверджаны на 1931 год у 12.615 тыс. руб., або перарастае аноўні год пяцігодкі на 94,1 проц.

Вось, таварышы, як стаіць справа з ростам рабочых кадраў і з паляпшэньнем матар'яльнага становішча рабочых мас. Значыць, мы пяцігодку ў гэтай галіне выконваем за 2 з пал. — 3 гады.

Для паляпшэньня становішча рабочае клясы мае асаблівае значэньне пытаньне пераходу на 7-гадзінны дзень. У БССР яшчэ ў канцы другога году пяцігодкі (1930 год) было пераведзена на 7-гадзінны рабочы дзень 43,2 проц. усіх рабочых прамысловасьці ВСНГ.

Яшчэ я павінен адзначыць адзін важнейшы фактар, які характарызуе тэмпы індустрыялізацыі БССР. Мы за справаздачны час ужо пусьцілі ў эксплёатацыю многа новых прадпрыемстваў, якія ўзмацняюць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва БССР, павялічваюць асноўны капітал нашай прамысловасьці, які знаходзіцца ў дзейсьні і працуе на карысьць сацыялізму. Ужо пушчаны такія прадпрыемствы, як Асінбуд, Гомсельмаш, бабруйскі дрэваапрацоўны камбінат, аршанскі ільнакамбінат па часальным аддзяленьні, магілёўскі мастаўёвы завод, менская швейная ф-ка, віцебская шпейная ф-ка, барысаўская запалкавая ф-ка «Пралетарская перамога», брысенскі завод па першапачатковай апрацоўцы ільну, лёзьненскі завод па першапачатковай апрацоўцы ільну, дуленскі, лесазавод, пяць буйных цагелень, віцебскі маслазавод, барысаўская макаронная ф-ка, крухмальны завод, магілёўская ф-ка штучнага валакна, рэчыцкі завод «Дубідель».

Для таго, каб закончыць характарыстыку росту індустрыялізацыі БССР, я прыведу вам яшчэ пару характэрных лічбаў аб удзельнай вазе прамысловай прадукцыі ў адносінах да сельска-гаспадарчай прадукцыі.

У 1929 г. прамысловая прадукцыя складала 24,5 проц., а сельска-гаспадарчая — 75,5 проц., у 1930 г. прамысловая прадукцыя ужо складала 35 проц., а сельска-гаспадарча — 65 проц., у бягучым 1931 г. прамысловая прадукцыя будзе складаць 45 проц., а сельска-гаспадарчая — 55 проц. На аноўні-ж год пяцігодкі — на 1933 г. — вызначалася, што ўдзельная вага прамысловай прадукцыі будзе раўняцца 41-43 проц., а ўдзельная вага прадукцыі сельскай гаспадаркі пяцігодкай меркавалася на аноўні год у 59 проц., а ў нас цяпер-жа ўдзельная вага прамысловай прадукцыі раўняецца 45 проц.; значыцца, мы ў гэтай галіне пяцігодку перарастаем на 3-4 проц. у 1931 г.

Я павінен шчыра прызнацца на зьезьдзе аб тым, што, ня гледзячы на вялікую працу, якую мы прарабілі па прамысловым будаўніцтве, узмацніўшы гэтым самым індустрыяльную базу БССР, і ня гледзячы на тое, што мы многа зрабілі ў справе разьвіцьця энэргетыкі і асабліва электрыфікацыі, прыкладам чаму можа быць тое, што мы ўжо пусьцілі ў ход Асінбуд, усё-такі ў гэтай справе — разьвіцьці энэргетычнай базы — нашы гаспадарчыя органы ня ўсё яшчэ зрабілі. Энэргетыка па ўмовах індустрыялізацыі адыгрывае вялізарную ролю ў справе росту гэтай індустрыялізацыі і гэтай справе — энэргетыцы — мы павінны аддаваць максымум увагі, тай увагі, якое мы аддаем гэтай справе яшчэ мала.

Са сказанага вынікае, што ў далейшай працы і Дзяржпляну, і ВСНГ, і СНК патрэбна пытаньню энэргетыкі аддаць максымум увагі, каб у гэтым пытаньні нас не заблытвалі.

б) Вынікі работы па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Калі ўзяць дынаміку пасеўных плошчаў за гэты час, то мы будзем мець наступны малюнак: наводле пяцігодкі, на аноўні яе год — на 1933 г. — вызначалася мець пасеўной плошчы ў разьмерах 3.917 тыс. гэктар., а ў 1930 г. мы мелі 3.633,7 тыс. гэктар., або 92,8 проц. да аноўнага году пяцігодкі, а ў 1931 г. мы будзем мець 4.083 тыс. гэктар., або 104,2 проц. пяцігодкі. Гэта значыць, што мы ў 1931 г. перавыкананем пяцігодку па плошчы на 4,2 проц. За першыя-ж 2 гады пяцігодкі пасеўная плошча ў нас нашырылася на 9,5 проц. Вельмі характэрным зьяўляецца тое, што плошча аграмаджанага сэктару сельскай гаспадаркі, г. зн. саўгасаў і калгасаў, расьце тыгаднікімі тэмпамі. Мы ўжо ў 1931 г. перавыкананем пяцігодку ў аграмаджаным сэктары сельскай гаспадаркі па плошчы да 200 проц.

Да рэчы кажучы, шкодніцкія і прышчэпаўскія элементы пры складаньні пяцігодкі сельскай гаспадаркі так ня будавалі, каб не выначалася амаль ніякіх пэрспэктыў для росту калгаснага і саўгаснага сэктару. Ім не ўдалося правесьці такую пяцігодку, а жыцьцё ў тысячу раз адкінула іх кулацкую палітычку і, наперакор кулацкім палітыкам і шкодніцкім элементам, нашы аграмаджаны сэктар сельскай гаспадаркі з кожным днём з'ежкай гадзінай тыгаднікі ўзмацняецца і расьце. Нашы дасягненьні ва ўзчацяньні аграмаджанага сэктару сельскай гаспадаркі адначасова зьяўляюцца лепшым адказам правааапортуністычным і нацыянал-апартуністычным элементам, якія не зразумелі задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і бралі стаўку на разьвіцьцё кулацкіх гаспадарак у вёсцы. Жыцьцё перакінула іх буржуазную хэрэсь без усякага астатку.

Мы бралі ўстаноўку і няўхільна ле праводзім на ўвасабляньне сельскай гаспадаркі БССР. Асноўны кірунак сацыялізацыі ў нас павінен праходзіць па разьвіцьці жывёлагадоўлі, тэхнічных і працаёмкіх культур у сельскай гаспадарцы. Як-жа тут стаіць справа? Вось лічбы: калі ў 1931 г. у нас пасеўная плошча будзе перарастаць праекта ваньні для аноўнага году пяцігодкі на 4,2 проц., то плошча пад тэхнічнымі культурамі ў 1931 г. перарастае па 25,7 проц. аноўні год пяцігодкі, па бульбе і кораньплодах — на 14,8 порц., па кармавых травах — на 301,7 порц., па збожжавых культурах у 1931 г. пасеўная плошча будзе раўняцца 91,1 проц. аноўнага году пяцігодкі.

Як бачыце, і гэту задачу мы ў асноўным выконваем, павялічваючы ўдзельную вагу тэхнічных культур, бульбы, кораньплодаў і кармавых траў.

А як справа стаіць з разьвіцьцём жывёлагадоўлі ў БССР? Тут я павінен сказаць лічбы, якія характарызуюць дынаміку стада за аноўнія 3 гады.

Калі ўзяць усё стада жывёлы ў БССР у 1928 г. за 100 проц., то ў 1929 г. яно складала 95,9 проц., у 1930 г. — 85 проц., а ў 1931 г. — будзе складаць 94,2 проц. На гэтым пытаньні я хачу крыху спыніцца.

З агалошаных лічбаў відаць, што ў 1930 г. у нас было значнае скарачэньне — на 15 проц. стада супроць 1928 г. Мне думаецца, што аноўная прычына гэтага скарачэньня ўжо вядома для усіх члена зьезду. Яна заключалася с тым, што ў мінулым годзе мы мелі факты злоснага разбазаваньня жывёлы з боку кулацкіх элементаў, падбухторваньня з іх боку бяднацка-сераднякіх мас для такога-ж разбазаваньня. Гэта прыняло некаторае скарачэньне, але мы пералом зрабілі ў гэтай галіне, кулацка асадзілі шляхам накладваньня на яго адпаведных кар, і злосны забой жывёлы ў асноўным спынен, мы ўжо назіраем значны рост жывёлагадоўлі, гэта дае нам магчымасьць у 1931 г. павялічыць усё стада на значны процант.

Асноўным мэтадам вырашэньня праблемы жывёлагадоўлі зьяўляецца мэтад арганізацыі буйных савецкіх і калектыўных жывёлагадоўчых гаспадарак. Ужо гэта відома, што наша партыя збожжавую праблему ў асноўным вырашыла праз утварэньне буйных збожжавых фабрык, праз асноўны шлях—калектывізацыю і стварэньне савецкіх гаспадарак. Па гэтым шляху мы і павінны пайсьці пры вырашэньні праблемы разьвіцьця жывёлагадоўлі.

Найбольш важным фактарам зьяўляецца тое, таварышы, што ў 1931 г. у сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі БССР будзе сканцэнтравана звыш 50 проц. усяго пагалоўя буйной рагатай жывёлы. Гэта мае вялізнае значэньне. Маючы такое моцнае аграмаджанае жывёлагадоўчае асяродзішча, мы зможам сапраўды ў найбольш кароткія тэрміны ў асноўным вырашыць праблему жывёлагадоўлі праз наш сацыялістычны сэктар.

Я, таварышы, асабліва хачу падкрэсьліць задачу жывёлагадоўлі. Мы павінны, чаго-б гэта не каштавала, пабаявому вырашыць праблему разьвіцьця жывёлагадоўлі, асабліва з нацыскаю на выкананьне плану разьвіцьця жывёлагадоўлі ў 1931 г. З паказаных лічбаў відаць, што мы праектуем павялічэньне стада ў 1931 г. на 21 проц. Гэта задача патрабуе вялізарнага напружаньня сіл і сродкаў з боку ўсіх працоўных мас, з боку савецкіх, гаспадарчых, грамадзкіх арганізацый. Мы дасягнем такога павышэньня за адзін год пры адным умове, калі мы будзем выконваць нашы пляны разьвіцьця жывёлагадоўлі па-бальшавіцку.

Як справа стаіць з валавой прадукцыяй па сельскай гаспадарцы БССР?

Калі ўзяць валавую прадукцыю па паляводзтве і жывёлагадоўлі, то мы пяцігодку выконваем такім чынам: на аноўні год пяцігодкі валавая прадукцыя вызначалася ў аб'ёме 1.135,7 млн. руб., у 1930 г. мы маем валавой прадукцыі па гэтых дзьвюх асноўных галінах сельскай гаспадаркі ў аб'ёме 732,9 млн. руб., або 64,5 проц. да аноўнага году пяцігодкі, а ў 1931 г. будзем мець валавую прадукцыю ад паляводзтва і жывёлагадоўлі сельскай гаспадаркі ў аб'ёме 989,7 млн. руб., або 87,1 проц. да аноўнага году пяцігодкі. Гэта значыць, што мы пяцігодку па валавой прадукцыі ў сельскай гаспадарцы выкананем раней, чым за 4 гады (гэтыя лічбы ўзяты ў цяперашніх цэнах 1926-27 г.).

А калі ўзяць прадукцыю па сацыялістычным сэктары, то тут якраз адбываюцца тыя працэсы, якія нам патрэбны. Па саўгасах валавая прадукцыя ў 1930 г. складала да аноўнага году пяцігодкі 96,4 проц., а ў 1931 г. яна перарастае аноўні год пяцігодкі на 236,4 проц. У калгасах у 1930 г. валавая прадукцыя ў адносінах да аноўнага году пяцігодкі раўнялася 89 проц., а ў 1931 г. яна перавысіць праектаваньне да аноўнага году пяцігодкі на 142,4 проц.

Гэта азначае, што па валавой прадукцыі сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі мы ўжо за два гады выканалі пяцігодку.

Адным з важнейшых мерапрыемстваў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі зьяўляецца яе трактарызацыя і мэханізацыя. Як-жа тут справа стаіць? Аб гэтым сьведчаць наступныя факты: калі ў нас у 1928 г. у сельскай гаспадарцы было ўсяго 173 трактары, то ў 1929 г. іх было ўжо 236, у 1930 г.—793, а ў 1931 г.—2.360. На аноўні год пяцігодкі намячалася 2.300 трактараў, так што ў 1931 г. мы перавыконваем па ўвозе трактараў усю пяцігодку на 2,6 проц. Гэта асабліва важна, таварышы, таму, што трактарная гаспадарка ўносіць карэнны пералом у мэтады работы ў сельскай гаспадарцы, ставіць сельскую гаспадарку на больш высокую тэхнічную ступень, прычым мы сталі на вілях, як і па ўсім Савецкім Саюзе, арганізацыі трактарных станцый, канцэнтрацыі трактарнага парку, не раскідаць трактараў па асобных адзінках. Таму ў БССР у гэтым годзе ўжо арганізуецца 25 трактарных станцый.

Разам з іншымі дасягненьнямі мы маем значныя дасягненьні і ў галіне павышэньня ўраджайнасьці беларускіх палёў. Асабліва характэрным фактарам у галіне павышэньня ўраджайнасьці зьяўляецца тое, што ўраджайнасьць у сацыялістычным сэктары расьце значна большымі тэмпамі, чым ураджайнасьць індывідуальнага сэктару. Вось лічбы, якія аб гэтым выразна гавораць: калі ўраджайнасьць у індывідуальных гаспадарках у 1930 г. раўнялася на жыце 7,5 цэнтн. на гэкт., на аўсе—7,6 цэнтн., на бульбе—92,7 цэнтн., то ў калгасах гэта ўраджайнасьць выяўляецца: на жыце—8,4 цэнтн., на аўсе—9,2 цэнтн., на бульбе 98 цэнтн., а ў саўгасах: на жыце—10,6 цэнт., на аўсе—10,9 цэнтн., на бульбе — 107 цэнтн.

Такім чынам, таварышы, вы бачыце, што разам з дасягненьнямі ва ўсіх галінах разьвіцьця сельскай гаспадаркі, у тым ліку і па ўздыме ўраджайнасьці, мы маем адно з найвялікшых і асноўных дасягненьняў—гэта дасягненьне ў галіне калектывізацыі, прычым калектывізацыя сельскай гаспадаркі ўжо цяпер дае свае дадатныя эканамічныя вынікі. З прыведзеных лічбаў на ўраджайнасьці відаць, што калгасы за першы год разгортваньня сваёй працы далі лепшыя ўзоры больш хуткага павышэньня ўраджайнасьці. Гэта зьяўляецца важнейшым паказальным фактарам для індывідуальных бяднацка-сераднякіх гаспадарак аб выгаднасьці буйнога калгаснага земляробства.

Мы да гэтага часу маем 17 проц. калектывізаваных усіх бяднацка-сераднякіх гаспадарак; трошкі, таварышы, малавата. Мы адстаем ад сярэднята процанту калектывізацыі на Саюзе ССР і значна адстаем, аб гэтым, таварышы, зьезд павінен ведаць і спэцыяльна па гэтым пытаньні пагаварыць для таго, каб яго лепш вырашыць.

Адначасова я хачу падкрэсьліць, што нельга недаацэньваць выпікаў калектывізацыі, бо 17 проц. калектывізаваных бяднацка-сераднякіх гаспадарак — гэта вялізнае дасягненьне. Гэтыя дасягненьні маюць і гістарычнае значэньне, якімі мы можам гапарыцца. Вы ведаеце, што калектывізацыя ня толькі нясе за сабою зьмены эканамічных адносін у вёсцы, але яна нясе за сабою і зьмены бытавых адносін—зьмену псыхалёгіі селяніна. Яна ўзмацняе грунт культурнага росту працоўных мас сялянства і г. д.

в) Культурна-сацыялістычнае будаўніцтва.

Як мы выконваем пяцігодку ў разьвіцьці народнай асьветы і пралетарскай культуры?

Па дашкольным выхаваньні лік устаноў у аноўнім годзе пяцігодкі па пляне павінен быў быць 788, а ў нас у 1931 г. будзе ўжо 2.110, або больш на 167 проц. аноўнага году пяцігодкі. Меркавалася, што ў аноўным годзе пяцігодкі лік дзяцей у дашкольных установах будзе раўняцца 31,6 тыс. чал., па самой справе іх у 1931 г. будзе ўжо 60 тыс. чал., або на 90 проц. больш, чым праекталася пяцігодкай. Па ўсеагульным навучаньні ў школах з тэрмінам 4-хгадовага навучаньня і ў палітэхнічных школах колькасьць камплектаў на аноўні год пяцігодкі праекталася ў 14.925, у 1931 г. ужо будзе забясьпечана 14.402 камплекты, або 96,5 проц. усёй пяцігодкі.

Лік вучняў у гэтых школах меркавалася давесьці ў аноўнім годзе пяцігодкі да 597,1 тыс. чал., а ў 1931 г. фактычна будзе 648 тыс. вучняў, значыць пяцігодка ўжо перавыконваецца на 8 проц. па колькасьці вучняў у гэтых школах.

Па школах другога канцэнтру і палітэхнічных школах з 5-7 г. навучаньнем вучняў меркавалася на аноўні год пяцігодкі ахапіць 81,2 тыс. чал., а будзе ахоплена ў 1931 г. 100 тыс. чалавек, або перавыкананьне пяцігодкі на 23 проц.

Лік устаноў па гэтым канцэнтры школ меркаваўся на аноўні год пяцігодкі ў 455, у 1931 г. фактычна ў нас будзе 847, або перавыкананьне пяцігодкі на 86 проц.

Хат-чытальнь меркавалася арганізаваць да аноўнага году пяцігодкі 670, а ў 1931 г. у нас ужо забясьпечана арганізацыя 688 хат-чытальнь, або перавыкананьне пяцігадовага пляну на 3 проц.

З паказаных даных выразна відаць, што мы па культурным будаўніцтве і па ахопе працоўных мас школай пяцігодку перавыконваем у 1931 г. Гэта—вялікіх дасягненьні, пры чым гэты фактар мае вялізарнае значэньне ў вырашэньні нацыянальнай культуры, і сетка школ і колькасьць ахопленых вучняў расьце для працоўных мас усіх нацыянальнасьцей, якія насяляюць БССР.

Важнейшым фактарам зьяўляецца в тое, як мы выканаем задачы па разьвіцьці літаратуры.

Аб'ём літаратурнай прадукцыі і ня зьмест, пры ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі, вызначае ступень росту і культурных рэсурсаў нашай пралетарскай дзяржавы. Калі кніжную прадукцыю вымяраць у мільёнах аркушаў, то аказваецца, што мы павінны былі за пяць год выдаць 192,7 млн. аркушаў, а выдана будзе за 3 гады 167,4 млн. аркушаў, або за 3 гады выканаем 86,8 проц. усяго аб'ёму пяцігодкі па кніжнай прадукцыі.

Па часопісах аб'ём за ўсю пяцігодку вызначаўся ў 24,8 млн. аркушаў, будзе выканана за першыя два гады і за бягучы 1931 г. 17,2 млн. аркушаў, або 69,3 проц.

Па газэтах вызначалася колькасьць экземпляраў за 5 год у суме 248,6 млн. экземпляраў, а за 3 гады будзе ўжо дасягнута 236,3 млн. экземпляраў, або 95 проц. усяго аб'ёму пяцігодкі. Значыць, як бачыце, таварышы, і па выдавецкай справе, што зьяўляецца вялікім фактарам у справе ажыцьцяўленьня нацыянальнай палітыкі, мы пяцігодку выканаем па кніжнай прадукцыі за 3 з паловаю гады, па часопісах—за 4 гады, а па газэтах амаль што выконваем пяцігодку за 3 гады.

Я ня буду, з-за недахвату часу, прыводзіць вам лічбаў, якія характэрызуюць выдавецкую справу ў нацыянальным разрэзе, але тыя паказальнікі, якія мы маем, гавораць, што літаратура і газэты на ўсіх нацыянальных мовах у БССР растуць тэмпамі, якія забясьпечваюць выкананьне пяцігодкі за 4 гады.

Апошні факт, якім я хачу закончыць у асноўным характарыстыку нашай працы па выкананьні пяцігодкі, гэта аб фінансах.

Калі ўзяць даходную бюджэт, то на пяцігодцы ён вызначаўся на 1928-29 г. у суме 86.440 тыс. руб., выканалі-ж мы яго ў 97.738 тыс. руб., або перавысілі на 13,1 проц., у 1929-30 г. пяцігодкай бюджэт вызначаўся ў 122.116 тыс. руб., выканан-жа ў 146.373 тыс. руб., або рост на 19,8 проц.; на 1931 г. бюджэт пяцігодкай вызначаўся ў 137.258 тыс. руб., прынят намі і зацьверджан ужо ў Саюзе бюджэт на 1931 г. у суме 173.596 тыс. руб., або на 26,4 проц. больш, чым вызначаўся пяцігодкай.

Мясцовы бюджэт пяцігодкай праекта ваўся на 1928-29 г. у суме 51.561 тыс. руб., выканалі мы 56.718 тыс. руб.,— на 10 проц. перавыканалі: на 1929-30 г. пяцігодкай вызначаўся ў аб'ёме 71.628 тыс. руб., выканалі 90.077 тыс. руб., або перавыканалі на 26 проц. На 1931 г. пяцігодкай вызначаўся мясцовы бюджэт у аб'ёме 80.857 тыс. руб., зацьверджан намі ў 125.155 тыс. руб., або перавышае меркаваньні пяцігодкі на 1931 г. на 54,7 проц.

Агульная сума выдаткаў у зводным бюджэце (мясцовы і дзяржаўны) за першыя 3 гады пяцігодкай вызначалася ў суме 423.700 тыс. руб., а за гэты час у бюджэтах яна складала ўжо 520.550 тыс. руб. Значыць, мы перавыконваем меркаваньні пяцігодкі на першыя 3 гады на 22,8 проц.

Вось, таварышы, прыкладна, малюнак нашай работы на выкананьні асноўнага пляну па сацыялістычным будаўніцтве, г. зн. па пяцігодцы.

г) Гапсэўнейшыя задачы сацыялістычнага будаўніцтва на бліжэйшы час.

Цяпер я хачу кораценька спыніцца на асноўных задачах сацыялістычнага будаўніцтва на бліжэйшы час.

У галіне прамысловасьці, мне думаецца, што цэнтр цяжкасьці нашай працы ў галіне далейшай індустрыялізацыі павінен заключацца, як я раней сказаў, ва ўзмацненьні энэргетычнай базы, прычым у гэтай галіне максымальную і асобную ўвагу трэба зьвярнуць на разьвіцьцё тарфянай прамысловасьці, на распрацоўку торфу, як у сэнсе скарыстаньня яго, як апалу, таксама і як сыроцу. У нас нагледзецца некаторы недахват паліва ў сувязі з тым, што тэмпы нашага росту павялічэньня запатрабаваньні на апал, гэта выклікае неабходнасьць павялічэньня яго здабычы. Задача разьвіцьця тарфянай прамысловасьці па здабычы яго, як апалу,—гэта адна з баявых задач для ўсіх цэнтральных і мясцовых арганізацый.

Апрача таго, ужо з сёньняшняга дня мы павінны паставіць перад сабой, як баявую задачу, самую строгую эканомію апалу на ўсіх нашых прадпрыемствах і на ўсіх установах. Гэта—адно з важнейшых мерапрыемстваў, якое павінна забясьпечыць пасьпяховае выкананьне задач 3-га рашаючага году пяцігодкі. Мы ў гэтых мэтах выдалі спэцыяльную пастанову СНК, якая абавязвае нашы гаспадарчыя органы скарачэньня норму апалу ня менш, як на 15 проц. У гэтай-жа пастанове мы прадугледжаем мабілізацыю найшырэйшых мас рабочых вакол гэтага важнейшага пытаньня. Трэба разгарнуць вакол выкананьня гэтых задач пралетарскую грамадзкасьць, якая-б узяла-б над свой кантроль выкананьне гэтай важнейшай дырэктывы. Трэба, каб гаспадарчым арганізацыям былі даны канкрэтныя задачы — кожнаму гаспадарніку, кожнаму савецкаму працаўніку і кожнаму рабочаму на прадпрыемстве, каб яны пранавалі над эканоміяй апалу.

Другой важнейшай задачай на пасягпны час павінна быць большае фарсаваньне разгортваньня прамысловасьці, якая выраблае будаўнічыя матар'ялы. Гэту задачу трэба ажыцьцяляць і па мясцовай і па рэспубліканскай прамысловасьці, а таксама і па сэнсе. У гэтай частцы мы ўжо маем значныя дасягненьні, але яшчэ ня ўсім дастаткова. Высокія тэмпы нашага сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць значна большага маштабу росту будаўнічых матар'ялаў, якія ўжо цяпер у вых ці іншых выпадках зьяўляюцца лімітам нашага будаўніцтва, як гаворацы, быць ці ня быць пабудаваным таму ці іншаму прадпрыемству. Бываюць такія выпадкі, калі гропы у нас ёсьць, але це хапае будаўнічых матар'ялаў. Таму нам са ўсёй катэгарычнасьцю неабходна паставіць і вырашыць праблему разьвіцьця прамысловасьці па будаўнічых матар'ялах, як адну з галоўнейшых. На гэта павінна быць зьвернута ўвага з боку цэнтральных арганізацый і з боку мясцовых арганізацый, бо і раёнам можна ў гэтай галіне правяць максымум ініцыятывы ў рамках разьвіцьця мясцовай прамысловасьці.

Цяпер трэба спыніцца на якасных паказальніках.

Мне здаецца, што якасныя паказальнікі працы нашай прамысловасьці павінны быць, як кажуць, таварышы усёй работы нашых гаспадарчых, прафэсыянальных, савецкіх і партыйных арганізацый.

Вазьмеце абутковую прамысловасьць. Калі рабочы купляе дрэнная якасьці абутак, гэта значыць, яму ў год прыходзіцца мець больш выдаткаў на абутак. Або швейную прамысловасьць, калі дрэнна будзе рабіцца вопратка, то будзе больш выдаткаў на яе куплю. Я ўжо не гавару аб тым, што ва ўмовах недахвату прамтавараў гэта яшчэ падвойвае тавары голад, а таксама ясна і тое, што пры дрэнная якасьці прадукцыі псуецца той сырэц, якога не хапае для нашай прамысловасьці.

А вазьмеце якасьць прадукцыі па буйной індустрыі, якая вырабляе сродкі вытворчасьці. Гэта азначае, што калі ў нас будуць выраблянца дрэнная якасьці машыны і іншыя сродкі вытворчасьці, гэта будзе адбівацца на індустрыялізацыі нашай краіны. Справа з якасьцю прадукцыі вельмі сур'ёзная справа. Таварышы, трэба завастрыць увагу ўсёй пралетарскай грамадзкасьці і ад імя зьезду заклікаць рабочых усёй прамысловасьці, каб яны біліся за выкананьне якасных паказальнікаў і за паляпшэньне якасьці прадукцыі. Гэту справу трэба ўзяць над абстрэл жорсткай пралетарскай самакрытыкі, бо гэта ня простая справа, а на сутнасьці ёсьць справа тэмпаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Цяпер я хачу падкрэсьліць яшчэ такую задачу, як устанаўленьне больш жорсткай пільнасьці дысцыпліны ва ўсіх будаўніцтвах. Аб гэтым гаварылася ўжо не адзін раз, але ўсё-ж такі некаторыя нашы арганізацыі не разумеюць значэньня гэтага пытаньня.

У народна-гаспадарчым пляне Саюзу ССР, які прынят Цэнтральным Камітэтам партыі і Урадам Саюзу на 1931 г., бярэцца жорсткая ўстаноўка на скарачэньне тэрмінаў будаўніцтва. Гэта ўстаноўка заключаецца ў тым, каб канцэнтраваць увагу на асноўных аб'ектах індустрыялізацыі, дасцца максымум сродкаў і будаўнічых матар'ялаў на забясьпечэньне набудовы гэтых аб'ектаў у больш кароткія тэрміны з тым, каб можна было іх уключаць у дзейсьнае ў найкарацейшыя тэрміны і гэтым самым паскорыць індустрыялізацыю нашай краіны. У гэтым, калі хочаце, і заключаецца асноўная лінія на ліквідацыю вынікаў працы шкоднікаў з «прампартыі», якія прабавалі распыляць сродкі, уключаць у вялікую колькасьць аб'ектаў, расьцягваць тэрміны будаўніцтва і гэтым самым завязвалі значныя капіталы і адсягавалі тэрміны звароту гэтых капіталаў.

А нам патрэбна павялічэньне тэмпаў яе мага, трэба паскорыць ліквідацыю нашай тэхнічнай адсталасьці. Тав. Сталін на зьезьдзе працаўнікоў сацыялістычнай прамысловасьці сказаў, што нас разьдзяляе наша адсталасьць ад перадавых дзяржаў тэрмінам у 50-100 гадоў, а мы павінны ліквідаваць гэту адсталасьць на працягу 10 гадоў. Адсюль мы павінны пайсьці самым напружаным тэмпам, зьніжаць тэмпы мы ня можам, а павінны іх павялічваць. Зьніжаць тэмпы —гаварыў тав. Сталін—гэта значыць, адстаць, а адстаючых б'юць. Павялічэньне тэмпаў—гэта стрыжань усіх нашых заданьняў.

Разам з гэтым мы павінны і аўладаць тэхнікай. Патрэбна кожнаму гаспадарчаму працаўніку навучыцца кіраваць не наогул, а канкрэтна, уваходзячы ва ўсю канкрэтную справу тай работы, якая яму даручана. Аўладаць тэхнікай — зараз асноўная задача нашых працаўнікоў,—гаварыў тав. Сталін.

Цэнтральная праблемай у разьвіцьці сельскай гаспадаркі, як я ўжо сказаў, па-мойму, трэба паставіць праблему разьвіцьця жывёлагадоўлі. Шляхі вырашэньня гэтай праблемы — калектывізацыя і арганізацыя буйных савецкіх гаспадарак. Трэба толькі не забываць, што для БССР разьвіцьцё жывёлагадоўлі зьяўляецца асноўнай праблемай разьвіцьця сельскай гаспадаркі. Каб не паўтарацца, я спынюся толькі на адным з пытаньняў, якое зьвязана з разьвіцьцём жывёлагадоўлі, гэта на кармавой базе.

Мы вызначылі рад мерапрыемстваў па ўзмацненьні кармавой базы. Пасьля праверкі аказалася, што ў гэтых адносінах работа праводзіцца яшчэ недастаткова. Кармавая база яшчэ слабая, такая праца нікуды на вартая. Некаторыя таварышы напэўна будуць высгупаць у спрэчках і гаварыць аб тым, што нельга выраш

ДЭКАДУ ПРАВЕРКІ ПАДРЫХТОЎКІ ДА СЯЎБЫ

ЗЬВЯЗАЦЬ З АРГАНІЗАЦЫЯЙ

МАГУТНАГА СТАЛІНСКАГА ЗАКЛІКУ Ў КАЛГАСЫ

Мацней націск на клясавага ворага, рашучы адпор апартуністам, якія зрываюць падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны!

ПАДНЯЦЬ МАСАВУЮ РАБОТУ НА ЎЗРОВЕНЬ ЗАДАЧ ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ!

Новыя калгасы рыхтуюцца па-ўдарнаму

Чырвоныя абозы ў падарунак Усебеларускаму зьезду

КРУГЛАЕ. Скуратаўскі сельсавет Круглянскага раёну калектывізаваны на 69 проц. **З кожным днём расьце калгасны прыліў.** Адна за другой вёскі ўліваюцца ў калгасы.

Новыя калгасы прыступілі да абагуленьня насеньня, інвэнтару, коняй, арганізуюць чырвоныя абозы з хлебам і ільном.

У вёсцы Рышкі арганізаваўся калгас імя 1-га зьезду калгасьнікаў Круглянскага раёну.

У калгасе вёскі Сеніцы разгарнулася баявая падрыхтоўка да веснавой сяўбы. Насеньне ачышчана. Інвэнтар рамантуецца. Пасеўны плян павялічаны на 50 проц. **У дзень адкрыцьця 10-га Усебеларускага зьезду саветаў калгасьнікі арганізавалі чырвоны абоз.**

У калгасе вёскі Хролішчава падрыхтоўка да сяўбы праходзіць пад знакам сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Адкрыцьцё зьезду саветаў калгасьнікі таксама **адзначылі чырвоным абозам з ільном.**

Калгас «Свабода» ліквідуе прарывы ў апрацоўцы ільну. На агульным сходзе калгасьнікаў вылучаны ўдарныя брыгады, якім даручана ў бліжэйшы-жа дзень скончыць апрацоўку ільну і здаць яго дзяржаве.

Кузьмін, Флейшар.

2.000, замест 15.000

Факты сьведчаць аб яўна-апартуністычнай недаацэнцы радам цэнтральных і раённых устаноў падрыхтоўкі кадраў масавай кваліфікацыі.

Асабліва дрэнна праходзіць падрыхтоўка масавых кадраў па лініі Калгасцэнтру. Паводле мінімальных плянаў, калгасы павінны падрыхтаваць і прапусьціць праз адведзеныя, хаця-бы каротка-тэрміновыя курсы: **3.000 жывёлаводаў, 3.000 сьвінаводаў 3.000 кіраўнікоў калгасаў, 3.000 рахункаводаў, 1.600 ільнаводаў і г. д.**

Такім чынам, **адна толькі калгасная сыстэма павінна падрыхтаваць каля 15.000 чал. масавай кваліфікацыі.**

Між тым, на сёнешні дзень на курсах калгаснай сыстэмы рыхтуецца толькі **295 жывёлаводаў, 135 сьвінаводаў,** некалькі дзесяткаў кіраўнікоў калгасаў і каля **1.000 рахункаводаў. Вось і ўсё.**

Замест 15.000 — толькі 2.000 чал.!

Ня ў лепшым становішчы падрыхтоўка і арганізацыя курсаў па лініі Наркамзему. Наркамзем толькі 15 сакавіка вызначае адкрыць курсы.

Становішча з забесьпячэньнем пасеўнай кампаніі спэцыялістамі наступнае.

Наркамземам праведзен датэрміновы выпуск студэнтаў с.-г. акадэміі і вэтінстытуту. Скончыўшыя 250 студэнтаў накіраваны на вёску. Акрамя таго, мабілізован трэці курс акадэміі і зоатэхінстыту. Сельска-гаспадарчымі тэхнікумамі на правядзеньне веснавой кампаніі накіравана 460 студэнтаў.

Мабілізацыя спэцыялістаў, якія працуюць у цэнтральных установах, прайшла больш-менш здавальняюча толькі ў Менску. З 117 спэцыялістаў цэнтральных і дасьледчых устаноў з Менску ўжо выехала 102 спэцыялісты. Адсутнічае кіраўніцтва мабілізацыяй спэцыялістаў у іншых гарадох. Аддзел кадраў ня ведае што зроблена ў Віцебску, Гомелі, Магілеве і іншых гарадох.

Падрыхтоўка загатовкаў саўгасаў па лініі Белсельтрэсту сарвана. Замест 50 чал., на курсы накіравана ўсяго 17 чал.

Абсалютна ніякай работы па падрыхтоўцы патрэбных кадраў не правяло Ільнапэньковае аб'яднаньне.

Сёлета для МТС патрабуецца 4.276 малодшых трактарыстаў, 274 старэйшых трактарыстаў і 596 паляводаў. Уся патрэбная сіла рыхтуецца на спэцыяльных курсах пры МТС Каля 80 агранамічных накіраваны на МТС.

Неабходна прыняць рашучыя меры, асабліва па лініі калгаснай сыстэмы, каб не сарваць выкананьня пляну падрыхтоўкі кадраў.

А.

Клімавіцкі раён далучаецца

ДА ПРАПАНОЎ СМАЛЯВІЦКІХ КАЛГАСАЎ

КЛІМАВІЧЫ. (Па тэлеграфу). **Клімавіцкі раён** вітае пачынаньне калгасаў Смалявіцкага раёну і **прыступае да арганізацыі сталінскага заклику ў калгасы** ў сувязі з набліжэньнем гадавіны апублікаваньня гістарычных артыкулаў тав. Сталіна.

За апошні час прыліў у Клімавіцкім раёне ўзмацніўся. Гэтымі днямі арганізавана 15 новых калгасаў, якія яднаюць 327 двароў. У старыя калгасы ўступіла 175 бядняцка-серадняцкіх двароў.

На 20 лютага ў раёне ўсяго калектывізавана 4.735 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак—41,7 проц.

Вайханскі сельсавет мабілізуе актыў

ГАРАДОК. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). ПЛЕНУМ **ВАЙХАНСКАГА** СЕЛЬСАВЕТУ, ГАРАДОЦКАГА РАЁНУ, ПАСТАНАВІЎ УКЛЮЧЫЦЦА Ў СТАЛІНСКІ ЗАКЛІК У КАЛГАСЫ, РАЗГАРНУЎШЫ МАСАВУЮ РАБОТУ І МАБІЛІЗАВАЎШЫ АКТЫЎ. ПЛЕНУМ, РАСПРАЦАВАЎШЫ АДОЗВУ ПАРТЫІ І ЎРАДУ АБ КАНТРАКТАЦЫІ, АБАВЯЗАЎСЯ РАЗГАРНУЦЬ НАЛЕЖНУЮ РАБОТУ, ДАБІВАЮЧЫСЯ 100 ПРОЦ. КАНТРАКТАЦЫІ ПАСЕВАЎ ІЛЬНУ.

Глускі раённы зьезд калгасаў заклікае

ДА ЎСЕАГУЛЬНАГА ПАХОДУ ЗА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ

ГЛУСК. (Наш кар.). **Раённы зьезд калгасаў пастанавіў уключыцца ў сталінскі заклік у калгасы** і абавязаўся разгарнуць у гэтым напрамку вялікую масавую работу. **Зьезд мабілізаваў сябе на ліквідацыю прарываў у загатоўках і падрыхтоўку да веснавой сяўбы.**

ВЕХЕР.

Арцель „Перамога" ў першых радох

ПОЛАЦАК. Прыгарадная с.-г. арцель «ПЕРАМОГА», Полацкага раёну, яднае 33 гаспадарні. У калгасе ёсьць 100 кароў. У 1930 годзе атрыман прыбытак у 61 тыс. рублёў. Даход кожнага працаздольнага члена с.-г. арцелі ў сярэднім — 350 рублёў.

Выкрыты 2 падкупачнікі, якія падрывалі работу калгасу. Пасьля выключэньня іх з гаспадаркі, у калгас уступіла 4 бядняцка-серадняцкіх гас падаркі.

Калгас дабіўся ўжо першых посьпехаў у падрыхтоўцы да сяўбы. ЗАКЛАДЗЕНЫ ПАРНІКІ НА 2.400 РАМ. Усе калгасьнікі падзелены на брыгады і пераводзяцца на зьдзельшчыну. Вывучаецца пытаньне аб рацыяналізацыі кармленьня кароў. Уводзіцца дакладны вучот работы па колькасьці і якасьці, узяты на вучот жывёла, фураж і інвэнтар. НАСЕНЬНЕ — АВЕС І ЯЧМЕНЬ — АДСАРТАВАНЫ. СТРАХАВЫ ФОНД ССЫПАНЫ. Дана заяўка на гароднае і кармавое насеньне. УДАРНАЯ БРЫГАДА КАВАЛЕЎ АДРАМАНТАВАЛА ЎСЕ ПЛУГІ, БОРАНЫ І ІНШ. С.-Г. ІНВЭНТАР.

Слаба праходзіць вывазка гною на гароды, галоўным чынам, на парнікі. Калгасьнікі змагаюцца за ліквідацыю гэтага прарыву.

Шыфман, Красн.

Даволі слоў!

ЗАСЛАЎЕ.

Тэмп падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны ў Заслаўскім раёне характарызуецца наступнымі фактамі. **Райземаддзел, райкалгасаюз і райкаапсаюз займаюцца спрэчкамі і ніяк ня могуць вырашыць, што каму рабіць. Адсюль поўная неразьбярыха, ніякай увязкі ў рабоце. А ў выніку—ні адна арганізацыя ня ведае, што ў сапраўднасьці робіцца ў нізох—у калгасах, сельсаветах.**

Пляны пасеўнай кампаніі, складзеныя габінэтным спосабам, на месцох не прапрацоўваюцца. Аб сустрэчных плянах ня чуваць. **Сельсаветы пляны сяўбы не давялі да паасобнага двара.**

На многіх калгасах малацьбы хопіць да новага ўраджаю. Больш паловы ўраджаю не абмалочана. **Насенфонды яшчэ не засыпаны.** Ні адна арганізацыя ня ведае, ці забясьпечаны калгасы патрэбнай колькасьцю насеньня, колькі якога ня хопіць і колькі ліквідаваць.

Да рамонту інвэнтару і с.-г. машын калгасы фактычна не прыступілі. Ні адна арганізацыя ня ведае дзе ёсьць кузьні. Райкаапсаюз і спажывецкая кааперацыя не клапоцяцца, каб хоць мінімальнай колькасьцю інвэнтару задаволіць калгасы. **Угнаеньне цалкам ляжыць на складах райкаапсаюзу.** Ня прымаецца ніякіх мер, каб саннай дарогай калгасы, саўгасы і сельсавет даставілі яго на месцы.

На некаторых калгасах, як напрыклад, імя Молатава, імя 16 партзьезду «Полымя» і інш. не праведзена разьмеркаваньня ўраджаю.

З ПРЫЧЫНЫ АДСУТНАСЬЦІ НАЛЕЖНАЙ МАСАВАЙ РАБОТЫ СЯРОД БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ МАС, ПЕРАЛОМУ Ў КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ЯШЧЭ НЕ ДАСЯГНУТА. КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ ПРАХОДЗІЦЬ САМАЦЁКАМ і гэта ня гледзячы на тое, што ў раёне будуецца машына-трактарная станцыя.

Дагаворную кампанію МТС з калгасамі праводзяць толькі работнікі МТС. Райком партыі ня вылучыў ні аднаго работніка для яе правядзеньня. Добрыя адносіны да МТС існуюць толькі на словах, а на справе—ня толькі дапамога, а нават тормаз. Пастанова ЦК партыі аб укамплектаваньні МТС работнікамі ня выканана. Нельга-ж лічыць выкананьнем дырэктыў партыі тое, што райком прызначыў па пасаду інструктара МТС па культмасавай рабоце чалавека, які... зьнят з работы ў саўгасе «Тарасава» за рад скажэньняў партыйнай лініі і злачынствы, будучы на пасадзе старшыні рабачкому. Гэтага работніка меркавалі нават выключыць з партыі.

Пляны загатовак амаль па ўсіх відах яшчэ ня выкананы. Значную частку ня выканалі кулакі і заможнікі. **Цьвёрдыя заданьні даны, а праверкі наколькі яны выконваюцца няма.** На сёнешні дзень няма ніаднаго выпадку, каб кулакоў судзілі, ці штрафавалі за невыкананьне заданьня. **БАЯЦЦА НАЦІСНУЦЬ, КАБ НЕ «ПЕРАГНУЦЬ» І ПАКУЛЬ ШТО ТОЛЬКІ МІТЫНГУЮЦЬ.**

Такі ход падрыхтоўкі да сяўбы і важнейшых папітычна-гаспадарчых кампаній—вынік права-апартуністычнай практыкі раду раённых арганізацый і работнікаў.

Аб кіраўніцтве РК КП(б)Б і РВК трэба сказаць наступнае. **Райком дае дырэктыву, але яе не правярае.** Дырэктыва застаецца на паперы, а ў лепшым выпадку райком задавальняецца вуснымі заявамі аб выкананьні яго дырэктывы.

Усе крычаць, што заняты, перагружаны работай, а **справы ня відаць.** Скаргі аб перагружанасьці, і адсутнасьці ўмоў для работы тут уведзены ў сыстэму. Некаторыя спэцыялісты, у прыватнасьці райагранам **Акімаў** і агранам **Клестаў** «заўсёды заняты», але калі-б праверыць іх работу і перагружанасьць, дык, балай, жахнуцца адважтнае. Вось гэтай праверкай ніхто і ня хоча заняцца. Некаторыя кіраўнікі лічаць так: «раз сказаў спэцыяліст, значыцца правільна». **Уплыву РСІ не адчуваецца,** ня гледзячы на рад прарываў у рабоце. РСІ яшчэ ня прыцягнула ні аднаго работніка раёну, калгасу, сельсавету да адказнасьці.

Усё гэта гаворыць аб тым, што бальшавіцкія тэмпы работы не забясьпечаны. Трэба кінуць больш сіл і сродкаў на праверку выкананьня дырэктыў партыі і савецкай улады. Патрэбен рашучы пералом. Даволі слоў! Патрэбна справа, інакш адстанем, а адсталых б'юць. А па некаторых работніках, якія праяўляюць яркую права-апартуністычную практыку, ужо трэба было-б рашуча ўдарыць.

Ж. С.

Пастанавілі закантрактаваць пасевы

КАЛГАС «1-га ЖНІЎНЯ», В.-БЯЛЕВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ І В. ЗАГРАДЗЬДЗЕ

СЛУЦАК. Калгас імя 1-га жніўня, абгаварыўшы адозву аб кантрактацыі, **пастанавіў закантрактаваць усе свае засевы.**

Па ініцыятыве калгаснай партыйнай ячэйкі быў праведзен сход сялян **вёскі Заградзьдзя,** на якім была распрацавана адозва аб кантрактацыі. **Па прыкладу калгасьнікаў, аднаасобнікі беднякі і сераднякі закантрактавалі свае засевы.**

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы ў калгасе праходзіць па-баявому. Насенныя фонды засыпаны. Усё насеньне ачышчана.

Слабавата пасоўваецца справа з рамонтам сельска-гаспадарчага інвэнтару. Калгасьнікі абавязаліся паскорыць рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару.

ІВІН.

***

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Работа па кантрактацыі засеваў у большасьці сельсаветаў Магілеўскага раёну не разгорнута.

Толькі **Вяліка-Бялевіцкі** сельсавет паказвае ўзорныя прыклады работы. Праведзены сходы калгасьнікаў і аднаасобнікаў, на якіх былі падрабязна разабраны ўсе пункты адозвы.

Калгасьнікі, беднякі і сераднякі аднаасобнікі аднадушна ўхваляюць мерапрыемствы партыі і ўраду.

Сацыялістычны сэктар цалкам закантрактаваў свае засевы. Прыкладу калгасьнікаў пасьледавалі ўсе беднякі і сераднякі В.-Бялевіцкага сельсавету, якія пастанавілі закантрактаваць усю засеўную плошчу.

ВЕХАР.

Апартуністычнае „благодушие" і стаўка на самацёк

„Хто быў раней кулаком, цяпер кулаком ня лічыцца"

АСЬВЕЯ. (Брыгада «Зьвязды» і «Праўды»).

У Асьвейскім раёне яшчэ ня ўзяты бальшавіцкія тэмпы падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. **Работа па загатоўках ня ўвязваецца з падрыхтоўкай да сяўбы і арганізацыяй новага калгаснага прыліву.**

У райземчастцы — апартуністычнае «благодушие» і стаўка на самацёк. Пашыраючы плошчу веснавой сяўбы з 11.809 гэкт. да 15.394 гэкт. і мяркуючы **засеяць пад адным ільном 4.000 гэкт.,** райвыканком павінен быў усе свае сілы кінуць на выкананьне гэтага пляну. Між тым, **пляны сяўбы да гэтага часу не даведзены да вёсак і паасобных двароў.** Старшы агранам земчасткі **Хабатноў** габінэтным парадкам склаў пляны для кожнага сельсавету, а загадчык земчасткі **Клопаў** «спусьціў іх у нізоўку» **толькі 3-га лютага. Савейкаўскі, Сенькаўскі і іншыя сельсаветы,** атрымаўшы пляны, **спакойна прышылі іх да справы.**

Нават калгасы, і тыя яшчэ ня ўсюды абгаварылі пляны. **Замест высоўваньня сустрэчных плянаў** па папярэдняй пасеўнай плошчы, **калгасы скарачаюць іх** і асабліва па аднэй з галоўнейшых культур для гэтага раёну — **ільну. Па Сенькаўскім сельсавеце скарацілі пляны ўсе калгасы: «Шлях Леніна» замест 62 гэкт. прыняў 14 гэкт., «Сейбіт» замест 31 гэкт. — 25 гэкт. і г. д.**

Стварэньне насенных фондаў таксама праходзіць вельмі марудна. Ні адзін калгас ня ведае добра, колькі яму патрэбна насеньня. Калгасы даюць весткі, што ў іх насеньне ёсьць, але не **бераніруюць яго,** як непарушны фонд. **Страхавыя фонды ў аднаасобных гаспадарках не ствараюцца.** Райземчастка не дала па гэтым пытаньні ніякіх дырэктыў. Адсюль **поўная неразьбярыха,** ніякай **увязкі ў рабоце.** А ў выніку—**ні адна арганізацыя ня ведае, што ў сапраўднасьці робіцца ў нізох—у калгасах, сельсаветах.**

ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ НАДЗВЫЧАЙ АДМОЎНА АДБІВАЕЦЦА І НА АРГАНІЗАЦЫІ НОВАГА КАЛГАСНАГА ПРЫЛІВУ. За дэкаду з 1 па 10 лютага ўступіла па раёне ў калгасы ўсяго толькі 21 гаспадарка. Цяпер налічваецца 44 калгасы з 685 гаспадаркамі **(15 проц.). Такі процант калектывізацыі для раёну, дзе ёсьць МТС, трэба лічыць яўнэ недаваньняючым. Калгасы не разгарнулі масавай работы** па арганізацыі новага калгаснага прыліву. Вярбовачныя брыгады, ініцыятыўныя групы і іншыя формы масавай работы, калгасы пескарысталі для прыцягненьня аднаасобнікаў у сваю калектыўную сям'ю.

Слабае разгортваньне калгаснага руху тлумачыцца праваапартуністычнай практыкай, якая пануе ў радзе сельскіх саветаў Асьвейскага раёну.

Сельсаветы не стаяць на чэле арганізацыі новага калгаснага прыліву. Яны зусім ня думаюць аб падрыхтоўцы да сяўбы.

Характэрныя факты. Сакратар **Задзежынскага** сельсавету кажа: «у нас няма кулакоў і таму няма каго індывідуальна абкладаць». Між тым група бедноты па гэтых днях выкрыла 17 кулакоў па сельсавеце. Старшыня Сенькаўскага сельсавету **Макіёнак** зусім не націсканы на кулацка-заможную частку ў справе хуткага выкананьня бю цьвёрдых заданьняў па загатоўках, а інструктар бюджэтнай часткі **Сапко,** прыняджаючы ў сельсавет, растлумачвае: **«Той, хто быў раней кулаком у нас у раёне, кулаком цяпер ня лічыцца, бо ён уже раскулачаны».** Такія думкі існуюць і ў іншых работніках РВК.

У выніку такіх апартуністычных поглядаў рад калгасаў засьмечан кулацкімі шкоднымі элемэнтамі, напрыклад калгасы вёсак **Дуброўка, Сенькава, Гарпаткі,** Шэпегава і інш. Кулакі вядуць у калгасах падрыўную работу, зрываюць падрыхтоўку да веснавой сяўбы. **Райкалгассаюз ня ўжывае рашучых мер да выяўленьня і ачышчэньня калгасаў ад клясава-варожых элемэнтаў.**

Райкалгассаюзу, РВК трэба безадкладна ачысьціць калгасы ад кулакоў, канчыць з існуючым «благодушием» і ўзяцца за праверку выкананьня дырэктыў партыі і ўраду і практычную падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны.

Воінаў, Фрадзін.

У бальшавіцкі бой за кожнае кілё ільну

ГАНЕБНЫЯ ПРАРЫВЫ Ў ІЛЬНАЗАГАТОЎКАХ НЕ ЛІКВІДАВАНЫ

ТОЛЬКІ 30,8 % ПЛЯНУ ВЫКАНАНА НА 20 ЛЮТАГА

РАЗГЯГВАЕМ ШТУРМ ЗА ЛЁН—ПА-БАЯВОМУ УКЛЮЧЫЦЦА ВА ЎДАРНЫ МЕСЯЧНІК!

ЗАКЛЮЧНАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ МІТЫНГУ-ПЕРАКЛІЧКІ ПА ІЛЬНАЗАГАТОЎКАХ

Чаму Жлобінскі раён пляцецца ў хвасьце?

СЛОВА МАЕ СТАРШЫНЯ РАЙВЫКАНКОМУ — ТАВ. КАЛЯСЬНЁЎ

— На 16 лютага плян ільназагатовак выкананы толькі ў разьмеры 12 проц. Цьвёрдыя заданьні давесьці да 6,1 проц. агульнага ліку гаспадарак, якія выканалі толькі 47 проц. іх заданьня. У раёне існуе права-апартуністычная стаўка на самацёк у пытаньнях ільназагатовак, асабліва з боку загатоўчых арганізацый і некаторых сельсаветаў. **Раённыя арганізацыі не забясьпечылі належнага кіраўніцтва гэтай работай.**

З абвяшчэньнем ЦКК-НК РСІ двухдэкадніка штурму, мы завастрылі ўвагу на гэтым пытаньні. У часе зьезду саветаў праведзена шырокая нарада па пытаньнях ільназагатовак. Пасланы брыгады над кіраўніцтвам адказных раённых работнікаў. **У складзе мабілізаваных маецца 60 чал. раённага актыву.** Выехалі 2 сэсіі суда для прыняцьця мер да кулацка-заможнай часткі вёскі. Прынятыя меры ў адносінах да членаў сельсавету, якія бяздзейнічаюць. Дадаткова выслана спэцыяльная брыгада для дэтальнай праверкі выкананьня цьвёрдых заданьняў. На сёнешні дзень праведзена 12 паказальных судоў над кулакамі. Складзена надзвычайная пяцёрка. Слобам—**рабоце надан баявы характар.** Вынікі двухдэкадніка станоўчыя—за апошні час нагнялаецца пералом. Будзем дабівацца яшчэ больш высокіх тэмпаў.

Патураньне кулаку

СЛОВА МАЕ САКРАТАР ЛУПАЛАЎСКАГА РАЙКОМУ КП(б)Б—ТАВ. ШПАК.

—Лупалаўскі раён выканаў свае заданьне ў разьмеры 24 проц. Цьвёрдыя заданьні кулацка-заможнай часткі вёскі даведзены да 4,7 проц. гаспадарак з удзельнай вагой кулацка-заможных гаспадарак у пляне ў разьмеры 5,5 проц. Плян выканан: калгасамі на 36 проц., аднаасобнікамі — на 20,5 проц., **кулацка-заможнымі гаспадаркамі—толькі на 70,7 проц.** Намі аштрафавана 90 кулацка-заможных гаспадарак на суму 20 тыс. рублёў. **Прарыў тлумачыцца слабым націскам на кулака, неразгортваньнем належнай работы сярод бяднацка-серадняцкіх мас.** Сучаснае становішча такое: пасьля абвяшчэньня штурму мы кінулі раённы актыў, арганізавалі выезд сэсіі суда, давыўлялем кулака і заможніка, павялічваем ім заданьні, разгортваем работу з бяднякам-серадняцкай часткай вёскі. Першая пяцілетка штурму дала 8 проц. пляну; пералом ёсьць, але пакуль што невыстарчальны.

За час штурму падвоім загатоўкі

СЛОВА МАЕ СТАРШЫНЯ ГЛУСКАГА РАЙВЫКАНКОМУ ТАВ. КАРПЕНКА.

—Пералом у выкананьні заданьняў па ільназагатовках—замест 4 проц.—8. Цьвёрдыя заданьні даны 470 гаспадаркам, што складае 5,5 проц. агульнай колькасьці гаспадарак. Выкананьне цьвёрдых заданьняў ганебнае. Тлумачыцца такое становішча апартуністычнай практыкай загатоўчых арганізацый паасобных саветаў. Вынятковая сэсія асуджаны 14 кулацкіх і 4 заможных гаспадаркі, адзін старшыня сельсавету. Інспэктару гандлю вынесена вымова. Выслана на раён 20 упаўнаважных, 36 брыгадзіраў. Зьезд калгасаў абязьсіўў сябе мабілізаваным на ліквідацыю прарыву.

Слова мае прадстаўнік ЦКК--НК РСІ--тав. Верба

— Папярэднія вынікі штурму гавораць аб тым, што раённыя арганізацыі са значным спазьненьнем узяліся за правядзеньне двухдэкадніка. Толькі некаторыя раёны дабіліся сапраўднага пералому ў часе штурму. Большасьць раёнаў пакуль што толькі ГАВОРЫЦЬ аб прарывах па ільназагатоўках, але-ж вельмі мала, злачынная мала робяць для таго, каб бальшавіцкімі мэтадамі гэтыя прарывы ліквідаваць. Лепшым довадам гэтага зьяўляецца тое, ШТО НА 20 ЛЮТАГА ПЛЯНЫ ІЛЬНАЗАГАТОВАК ВЫКАНАНЫ ТОЛЬКІ Ў РАЗЬМЕРЫ 30,8 ПРОЦ. Гэта значыць, мы не дадалі дзяржаве звыш 10 тысяч тон ільну. Ганьба. Але-ж гэта факт. Не дадаць 10 тысяч тон ільну—гэта значыць ня даць краіне мільёнаў мэтраў мануфактуры. Не дадаць тысячы тон пянькі — гэта значыць ня даць вяровак для другой бальшавіцкай вясны, канатаў для сплаву і рыбнае пуцыны. Толькі апартуніст можа на словах быць за індустрыялізацыю краіны, а на справе, у сваёй практычнай рабоце зрываць ільназагатоўкі — сырцовую базу аднэй з важнейшых галін нашае прамысловасьці — тэкстыльнай. Растлумачэньне ільназагатовак бяднякам і кулацкім і калгасным масам—гэта важнейшая задача раённых арганізацый, якая да гэтага часу ігнаравалася большасьцю раённых арганізацый. Дэпляці, гандлярскі падыход да ільназагатовак зьяўляецца галоўнай прычынай зрыву іх. Апартуніст, дзяляга не разумее, што ільназагатоўкі—фронт клясавага змаганьня, які цесна зьвязан з важнейшымі вучасткамі клясавага змаганьня на вёсцы—з калектывізацыяй і сяўбой. Праявіць пасыўнасьць на гэтым фронце — значыць здаць пазыцыі клясаваму ворагу—кулаку. Па гэтым шляху пайшоў рад раённых арганізацый.

Чым, калі не махравым правым апартунізмам, здачай пазыцый клясаваму ворагу, можна кваліфікаваць тое, што кулацка-заможныя гаспадаркі Лупалаўскага раёну прымаюць удзел у выкананьні пляну ў разьмеры 5,5 проц. 5-7 проц. гаспадарак кулацка-заможных атрымалі заданьні толькі ў разьмеры 5,5 проц. пляну. Яўнае патураньне кулаку. Ня лепшае становішча з выкананьнем цьвёрдых заданьняў у іншых раёнах.

Нельга больш мірыцца з такім становішчам. Пастанова партконфэрэнцыі, якая надрукавана ў «Зьвязьдзе» ад 24 лютага, павінна быць суровым папярэджаньнем для ўсіх тых кіраўнікоў раённых партыйных арганізацый, якія не зразумелі папітычнага значэньня ільназагатовак, якія праявілі ў гэтай справе правы апартунізм.

Вельмі дрэнна ідзе здача ільну па кантрактацыі. Зусім недапушчальная справа. Нельга ні на адну хвіліну дапусьціць якога-б там ни было пібэралізму ў справе спагнаньня ільну па кантрактацыйных умовах, ня скочвяючыся, зусім зразумела, на шлях права-«лявацкага» і праванацыйнага капыльнскага суда.

Ганебна адстаюць калгасы. Па Лупалаўскім раёне калгасы выканалі толькі 36 проц. іх заданьня. Па Капыльскім раёне калгасы выканалі толькі 9 проц. іх пляну. Адставаньне калгасаў ня толькі робіць уплыў на здачу ільну бяднякам-серадняцкімі гаспадаркамі, але-ж зьяўляецца тормазам у ажыцьцяўленьні баявой праграмы засеву ільну ў другую бальшавіцкую вясну і разгортваньні калгаснага руху. Хто гэтага не разумее, той нічога не разумее.

Задача раённых арганізацый—пабальшавіцку разабрацца ў прычынах зрыву загатовак у даным раёне. Ухапіцца за асноўныя зьвяны, расставіць сілы раёну — вось, што зьяўляецца асноўнай умовай стварэньня сапраўднага пералому ў ільназагатоўках. Бязьлітасна выявіўшы апартуністаў з раённага апарату, ажыцьцявіўшы дырэктывы ЦК КП(б)Б па давядзеньні цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных гаспадарак, даўшы руйнуючы адпор кулаку-сабатажніку, мабілізуючы бяднякоў-серадняцкія, калгасныя масы, мы здолеем выйсьці з ганебна-марудных тэмпаў у ільназагатоўках.

Двухдэкаднік бясспрэчна мае свае дадатныя вынікі. Пералом адчуваецца ў радзе раёнаў. Але-ж ён невыстарчальны. Асноўная прычына — гэта спазьненьне з пачаткам штурму. Таму ЦКК-НК РСІ ПАСТАНАВІЛА ПРАЦЯГНУЦЬ ДВУХДЭКАДНІК ШТУРМУ ІЛЬНАЗАГАТОВАК, УКЛЮЧЫЎШЫСЯ Ў МЕСЯЧНІК, АБВЕШЧАНЫ Х ЗЬЕЗДАМ САВЕТАЎ. За гэты час ня толькі не аслабляць тэмпаў, але-ж падвойваць, патройваць і ўдзесяцяраць іх. Ні ў якім разе не вярачаць брыгадзіраў з вёскі, а паспаць новых, узмацніць дапамогу сельсаветам. Ні ў якім разе не аслабляць увагі партыйнай арганізацыі, а мабілізаваць кожнага партыйца, кожнага камсамольца на выкананьне важнейшага папітычна-гаспадарчага заданьня!

У САСТАЛОСЯ 4 ДНІ

Да 1-га сакавіка закончыць аднаразовы збор

ВЫГНАЦЬ З ФІНАПАРАТУ БЮРАКРАТАЎ І АПАРТУНІСТАЎ

З усёй рашучасьцю спагнаць плацяжы з капіталістычных элемэнтаў у горадзе і вёсцы

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА

Даныя аб паступленьні аднаразовага збору на месцох паказваюць, што пералому ў кампаніі да гэтага часу яшчэ няма. Паводле вестак з 83-х раёнаў, **на 20-га лютага паступіла ўсяго 3.372.000 руб., што складае 50,3 проц. налічанай сумы.** Між тым, як вядома, да 1-га сакавіка збор павінен паступіць поўнасьцю, а з кулакоў яго трэба было спагнаць яшчэ да 1-га лютага.

Здавальняюча праходзіць збор па **Сіроцінскім** раёне (82 проц.), **Слуцкім** (79,1 проц.) і **Капыльскім** (75,7 проц.). Калі гэтыя раёны ў 3-й дэкадзе лютага будуць працаваць такімі-ж тэмпамі, дык можна быць упэўненымі, што яны выканаюць свае заданьні ва ўстаноўлены тэрмін.

Любаньскі раён сабраў 69,5 проц. налічэньняў, **Клімавіцкі**—67,5 проц., **Парыцкі**—65,7 проц., **Сураскі**—64,5 проц., **Клічаўскі**—64,5 проц.

Асабліва недапушчальна ідзе спагнаньне збору з кулацкіх гаспадарак. Паводле даных з 49 раёнаў, **на 20-га лютага паступіла ўсяго ад кулацкіх гаспадарак 170.000 руб., або 27,2 проц.** налічаных сум. Па **Бешанковіцкім** раёне, дзе агульнае заданьне выканана на 40,6 проц., з кулакоў спагнана толькі 1,0 проц.; па **Чэрвеньскім** раёне агульнае заданьне—42,7 проц., з кулакоў—5,4 проц.; па **Лагойскім** раёне: агульнае заданьне—41,6 проц., з кулакоў—1,7 проц.; па **Стара-Дарожскім** раёне: агульнае заданьне—45,6 проц., з кулакоў—4,4 проц.; па **Лупалаўскім раёне:** агульнае заданьне—50,4 проц., з кулакоў—4,0 проц.

Значная частка раёнаў да гэтага часу не аддае аднаразоваму збору належнай увагі. Апартуністычная недаацэнка кампаніі прывяцьці да зрыву заданьняў. Раённыя арганізацыі спадзяюцца на самацёк і ня прымаюць мер да фарсаваньня паступленьня збору.

Кулацтва злосна сабатуе збор, агітуе супроць упясьненьня плацяжоў, а некаторыя раённыя арганізацыі бяздзейнічаюць, не даюць рашучага адпору кулацкай агітацыі і сабатажу.

3-я дэкада лютага зьяўляецца рашаючай у спагнаньні аднаразовага збору. Патрэбен рашучы пералом. У залежнасьці ад выпікаў гэтай кампаніі можна будзе судзіць аб здольнасьці раённых арганізацый, у першую чаргу Райфа—кіраваць важнейшымі гаспадарча-палітычнымі кампаніямі, сваячасова ажыцьцяўляць дырэктывы партыі і ўраду.

Камсамол уключаецца ва ўдарны месячнік

Цэнтральны Камітэт ЛКСМБ за подпісам сакратара ЦК тав. ПАЛЯКОВА паслаў усім райкомам камсамолу тэлеграму наступнага зьместу: «Тэрміново ўключэцеся ў абвешчаны Х зьездам саветаў месячнік сканчэньня загатовак і мабілізацыі сродкаў. Намеціць практычныя мерапрыемствы па рэалізацыі адозвы зьезду ячэйкамі. Брыгадзіраў ільназагатовак пакінуць да канца месячніка. Аб ходзе кампаніі па-дэкадна інфармаваць».

За зрыў мабілізацыі сродкаў--пазбаўленьне волі

КАПЫЛЬ. (Па тэлефону). 17-га лютага адбыўся суд над былым старшынёй РВК **Левусам** і былымі фінработнікамі **Шабанам, Катковічам і Мельнікавым,** якія **злачынна** пядбайна адносіліся да мабілізацыі сродкаў. У выніку апартуністычнай бязьдзейнасьці паказаных асоб, у выкананьні фінпляну ўдарнага кварталу атрымаўся вялікі прарыў.

Суд прыгаварыў Шабана—да 1 з паловай году пазбаўленьня волі, Каткоўча—да 6 мес., Левуса і Мельнікава—да 1 году ўмоўна.

Брыгада «Зьвязды».

Чорная дошка

раёнаў, якія ганебна праваляваюць аднаразовы збор

РАЁН	Процант выкананьня заданьня на 20 лютага.
Чырвонапольскі	24,7
Заслаўскі	28,2
Петрыкаўскі	29,6
Прапойскі	30,8
Касьцюковіцкі	31,1
Бабруйскі	33,7
Азарыцкі	36,4
Лельчыцкі	38,0
Журавіцкі	38,2

Ведамственыя спрэчкі замест практычнай работы

(Ад нашага карэспандэнта)

Стукзеньскі плян мабілізацыі сродкаў па Плешчаніцкім раёне сарваны. З прадугледжаных 114.400 руб. паступіла ўсяго 47.400 руб. альбо 41,4 проц. Па абсьледваных 4-х сельсаветах **(Завышанскім, Крайскім, Запольскім і Зарэцкім)** аказалася, што ні **ў** адным плян мабілізацыі сродкаў не даведзен да асобных вёсак. Гэтыя сельскія саветы літаральна бязьдзейнічаюць. У крамах спажывецкай кааперацыі ёсьць вялікія залежы тавараў (скуры, фарбы, жаночыя палітэ, цукеркі і г. д.), якія не рэалізуюцца.

Да апош

ПАСТАНОВА 3-га ПЛЕНУМУ ЦКК КП(б)Б

па дакладу тав. КАЛНІНА аб рабоце прэзыдыуму ЦКК за пэрыяд ад 13-га зьезду КП(б)Б і аб пастановах прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б)

I.

Заслухаўшы даклад т. Калніна аб рабоце прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б за час з XIII зьезду КП(б)Б і пастановах прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) па выніках праверкі работы ЦКК КП(б)Б, пленум ЦКК цалкам і поўнасьцю ўхваляе пастановы ЦКК УсеКП(б).

Пленум ЦКК прызнае палітычную лінію ў рабоце прэзыдыуму правільнай і лічыць праведзеную работу.

Адзначаючы, што прэзыдыум ЦКК рабіў ахоўваў ленінскае адзінства КП(б)Б у змаганьні на два фронты, асабліва ўвагу работы па выкрыцьці і вымітаньні КП(б)Б ад права-апартуністычных і нацыянал-апартуністычных элемэнтаў, чым спрыяў яшчэ большай мабілізацыі КП(б)Б на барацьбу за праведзеньне генэральнай лініі партыі, супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, «лева» апартунізму, нацыянал-апартунізму, двурушніцтва і прымірэнцтва да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі.

II.

Пленум ЦКК канстатуе, што праведзеная ЦКК УсеКП(б) праверка работы органаў КК-РСІ Беларусі аказала істотную дапамогу ў працы ЦКК-НК РСІ. Адзначаючы за апошні час значнае паляпшэньне ў рабоце ЦКК КП(б)Б па выпраўленьні недахопаў на аснове пастановы ЦКК УсеКП(б), пленум заваграе ўвагу прэзыдыуму і ўсіх кантрольных камісій КП(б)Б на необходнасьці далейшага рашучага выпраўленьня недахопаў і перабудовы работы ЦКК-НК РСІ і КК-РСІ на месцах, у поўнай адпаведнасьці з пастановамі XVI зьезду партыі і сьнежаньскага пленуму ЦКК УсеКП(б).

Кладучы ў аснову сваёй далейшай работы пастанову ЦКК УсеКП(б), XVI і XIII зьезду партыі, пленум ЦКК лічыць, што: «Адной з важнейшых задач ЦКК-РСІ павінна быць выяўленьне і мабілізацыя ўсіх рэсурсаў краіны да далейшага паскарэньня тэмпаў індустрыялізацыі» (з пастановы XVI зьезду).

Пленум лічыць, што праверка выкананьня плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі і сапраўднасьць у ажыцьцяўленьні высокіх тэмпаў індустрыялізацыі, сацыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва як класа на аснове суцэльнай калектывізацыі — павінна займаць асноўнае і рашаючае месца ў рабоце ЦКК-РСІ і на органах на месцах.

Пленум даручае прэзыдыуму ЦКК і кантрольным камісіям забясьпечыць систематычную праверку выкананьня апошніх пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК па пытаньні аб рабоце чыгуначнага і водзнага транспарту, дабіўшыся неадкладнага пералому і мабілізацыі ўвагі партыйных арганізацый, рабочых мас транспарту на хуткае і выразнае ажыцьцяўленьне гэтых пастаноў.

Адзначаючы буйнейшыя недахопы ў пытаньнях якасьці прадукцыі, рацыяналізацыі прамысловасьці і будаўніцтва, пленум ЦКК з усёй катэгарычнасьцю заваграе ўвагу кантрольных камісій, партыйных, прафэсыянальных і гаспадарных арганізацый на задачы паляпшэньня якасьці прадукцыі, зьніжэньня сабекошту і рацыяналізацыі.

Пленум даручае прэзыдыуму ЦКК і кантрольным камісіям прамысловых раёнаў сканцэнтраваць максымум увагі навокал гэтых задач, б'ючы на ўсякай недацэнцы і ігнараваньні, як правааапартуністычнай дзейнасьці, уважаючы барацьбу за якасьць і зьніжэньне сабекошту па аснове рацыяналізацыі і ўдосканаленьне прадукцыі працы з барацьбой за поўнае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, скарачэньне сваячасова і выкананьні плянаў. Арганізаваць систематычную праверку выкананьня пастаноў лістападаўскага пленуму ЦКК КП(б)Б (30 г.) на пытаньнях прамысловасьці з прыцягненьнем шырокіх рабочых мас ударнікаў.

Ня гледзячы на значную работу, праведзеную прэзыдыумам ЦКК па праверцы становішча будаўніцтва, пленум адзначае, што дырэктывы партыі ў гэтай частцы выконваюцца ўсё яшчэ незадавальняюча. Даручыць прэзыдыуму ЦКК і КК-РСІ узмацніць кантроль на ўсіх вучастках будаўніцтва (прамысловага, сел.-гасп., жыльлёвага, дарожнага), мабілізуючы ўвагу партыйных арганізацый і рабочых масы на барацьбу з нядбайнымі і часам шкодніцкімі адносінамі да будаўніцтва, з недапушчальнай заніжанай і па-заплянаваным будаўніцтвам, дабіваючыся рашучага зьніжэньня будаўнічага індэксу, паляпшэньня якасьці будаўніцтва на падставе яго рацыяналізацыі, узяўшы пад асобны кантроль будаўніцтва ў раёнах, асабліва ў саўгасах і калгасах.

Пленум ЦКК прапануе прэзыдыуму ЦКК і ўсім КК-РСІ забясьпечыць сталы нагляд за пільнымі ажыцьцяўленьнем пастаноў сьнежаньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б на пытаньнях рабочага забясьпечаньня. Зьвярнуць асаблівую ўвагу КК-РСІ на разгортваньне сапраўды масавага рабочага кантролю над працай каапэрацыі і органаў рабочага забясьпечаньня, на рашучым выкараненьні з каапэрацыі «нэпманскага душку», вытканьні апартуністычных і чужых элемэнтаў, якія тармозяць барацьбу партыі і рабочае класы за перамаганьне часовых харчовых труднасьцяй.

Рэальныя пляны трэцяга рашаючага году пяцігодкі патрабуюць максымальнага напружаньня ўсіх сіл партыйных арганізацый і рабочай класы па перамаганьні труднасьцяй, вынікаючых з абвостранай клясавай барацьбы і шалёнага супраціўленьня кулацка-нэпманскіх элемэнтаў нашаму сацыялістычнаму наступленьню. Неабходна рашуча выкарчоўваць рэшткі шкодніцтва на масавых вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, узьнімуць адказнасьць ячэек і кіраўнікоў прадпрыемстваў за факты шкодніцтва, дабіваючыся рашаючых посьпехаў у справе аўладаньня тэхнікай, узьнімуць вытворчай прапаганды, узмацненьня ўвагі вынаходству і рабоце органаў рацыяналізацыі, арганізоўваючы далейшы ўздым і поўнае скарыстаньне ўзрастаючага вытворчага энтузіязму рабочай класы, які вызьвалецца ў сац. спаборніцтве, ударніцтве, сустрэчным прамфінпляне. Пленум прапануе ўзмацніць барацьбу з апартуністычнымі адносінамі да ініцыятывы рабочых мас, з усялякімі настроямі зьніжэньня тэмпаў, не магчымасьці выкананьня плянаў з-за «аб'ектыўных» прычын і т. д. Толькі няўхільнае правядзеньне генэральнай лініі партыі забясьпечыць поўнае выкананьне плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

III.

Канстатуючы значныя посьпехі ў справе ўзмацненьня барацьбы з бюракратызмам, чысткі і арабочаньня савецкага апарату, узмацненьня раённага савецкага апарату ў сувязі з ліквідацыяй акруг, пленум ЦКК адзначае, што рад дырэктыў партыі па ўзмацненьні і самарацыяналізацыі апарату, па зьніжэньні адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў і асабліва па ажыцьцяўленьні масавага рабочага кантролю зьнізу—шэфства заводаў над савецкім апаратам—выконваюцца яшчэ зусім незадавальняюча.

Пленум ЦКК даручае прэзыдыуму і кантрольным камісіям узмацніць работу па барацьбе з бюракратызмам і рацыяналізацыі савецкага апарату, ажыцьцяўляючы дырэктыву XVI зьезду аб «разгорнутым наступленьні на бюракратызм», праводзячы на справе паказаньні т. Леніна аб тым, што: «правяраць людзей і правяраць фактычнае выкананьне справы—у гэтым, яшчэ раз у гэтым, толькі ў гэтым цэнтр самае галоўнае ўсёй работы, усёй палітыкі», бязьлітасна б'ючы на момантах безадказнасьці, чыноўніцкага самаздаваленьня, нясумленнага выкананьня дырэктыў партыі і ўраду, што зьяўляецца найбольш любімычным і злосным відам бюракратызму.

Пленум даручае прэзыдыуму ЦКК рашуча дабіцца ўкараненьня плянавасьці ў рабоце цэнтральных і раённых устаноў, устанаўленьня выразнага плянаваньня на лініі прамысловасьці, будаўніцтва і сельскай гаспадаркі, выдучы жорсткую барацьбу з усялякай блытанінай, момантамі непрадуманага, галавацяпскага надыходу да складаньня плянаў, што тармозіць своячасовае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі.

У найкарацейшы час зрабіць канкрэтнае паляпшэньне сыстэмы кіраўніцтва цэнтральнага апарату раёнамі, пастаўіўшы узорную работу ў раённым і нізавым савецкім апараце. Прыняць усе меры, каб да 1-га жніўня скончыць чыстку савецкага апарату з шырокім прыцягненьнем рабочых мас, скончыць пачатую праверку рэалізацыі вынікаў чысткі сіламі шэфскіх брыгад, рабочых і калгасных мас.

Пленум катэгарычна абавязвае кантрольныя камісіі, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі прыняць неадкладныя меры ў разгортваньні рабочага шэфства над дзяржапаратам, накіроўваючы яго, галоўным чынам, на штодзённы кантроль з боку заводаў-шэфаў па выкананьні падшэфным апаратам важнейшых дырэктыў партыі і ўраду. Настойліва дабівацца ажыцьцяўленьня пастаноў XVI зьезду аб перадачы рабочым заводаў-шэфаў бясплатнага выкананьня асобных функцый дзяржапарату ў парадку грамадзкай нагрузкі пасьля скарачэньня працы па вытворчасьці. Пленум указвае ўсім партыйным і прафэсыянальным арганізацыям, што недаацэнка рабочага шэфства над дзяржапаратам зьяўляецца праяўленьнем правага апартунізму ў практычнай дзейнасьці.

Даручыць прэзыдыуму ЦКК і кантрольным камісіям навесьці жорсткую барацьбу з канкрэтнымі фактамі недаацэнкі і ігнараваньня рабочага шэфства, дабіўшыся карэннага пералому, правёўшы на працягу сакавіка м-ца, сумесна з прафсаюзамі, месячнік наладжаньня шэфскай работы над дзяржапаратам.

Пасьляховае ажыцьцяўленьне ўсіх задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі патрабуе ад ЦКК і яго органаў праводзіць далей непрымірымую барацьбу за ўмацаваньне ленінскага адзінства КП(б)Б на аснове правядзеньня генэральнай лініі партыі і яшчэ больш рашучай мабілізацыі КП(б)Б на барацьбу з апартунізмам, асабліва з правым, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з усялякімі антыпартыйнымі групоўкамі, двурушніцтвам і прымірэнцтвам да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі.

Даручыць прэзыдыуму і кантрольным камісіям КП(б)Б правадзіць далейшае чышчэньне ЦКК КП(б)Б ад апартуністычных элемэнтаў—правых і нацыянал-апартуністаў. Забясьпечыць сваёй правяркай няўхільнае правядзеньне нацыянальнай партыі і змаганьне з ялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, контр-рэвалюцыйным нац.-дэмакратызмам і павінізмамі розных колераў, узмацняючы інтэрнацыянальнае выхаваньне працоўных мас.

Неадкладняючае разгортваньне самакрытыкі ў радзе партыйных арганізацый, наяўнасьць фактаў скажэньня і заціску самакрытыкі (Барысаў, Віцебск, Чарэя), вынікі рабселькораўскага рэйду па рэагаваньні на заметкі і рад рабселькораўскіх спраў настойліва патрабуюць узмацненьня ўвагі ў справе разгортваньня большанцкай самакрытыкі і барацьбы з элемэнтамі заціску і скажэньня яе. Неабходна дабівацца ўзмацненьня партыйнага кіраўніцтва і ўздыму арганізуючай ролі ячэек і партыйных камітэтаў справай разгортваньня самакрытыкі, накіроўваючы яе ў абарону генэральнай лініі партыі, б'ючы на ўсялякіх спробах скарыстаньня самакрытыкі апартуністычнымі і варожымі элемэнтамі супроць партыі і дыктатуры пралетарыяту і на ўсялякіх момантах перахлістваньня.

Пленум даручае прэзыдыуму ЦКК і кантрольным камісіям дабіцца ў найкарацейшы час карэннага пералому ў разгортваньні масавай работы і ў пастаноўцы систематычнай масавай праверкі выкананьня, скарыстаўшы правадзімую зараз праверку масавай работы для ўзьнімцця ролі КК-РСІ, як арганізатара мас па іх мабілізацыі на правядзеньне генэральнай лініі партыі.

Адзначаючы, што неадназразовыя дырэктывы ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб падборы і ўзмацненьні кадраў ЦКК-РСІ выконваюцца яўна незадавальняюча, пленум даручае прэзыдыуму, у сувязі з надыходзячымі перавыборамі гар. і райКК-РСІ, неадкладна заняцца падборам і ўзмацненьнем кадраў КК-РСІ як мясцовых КК-РСІ, так і апарату ЦКК-НК РСІ, аб чым паставіць пытаньне перад ЦК КП(б)Б.

Пленум асобна зварачае ўвагу прэзыдыуму ЦКК на выкананьне пастановы ЦКК УсеКП(б) у частцы зьняцця скампрамэтаваўшых і неапраўдаўшых сябе работнікаў на адказных пасадах, даручае ўсім кантрольным камісіям рашуча дабівацца поўнай рэалізацыі гэтай пастановы.

Даручыць прэзыдыуму ЦКК уключыць у плян працы ЦКК НК РСІ на 1931 г. пастановы прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) па абсьледваньні, забясьпечыўшы поўнае выкананьне пастаноў ЦКК УсеКП(б).

Старшыня ЦКК КП(б)Б КАЛНІН.

Беларускае кіраўніцтва сувязі НЯ ВЫКОНВАЕ

дырэктыў ЦК КП(б)Б аб распаўсюджаньні друку

«Работа па распаўсюджаньні друку ва ўмовах шпаркіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва і значнага падёму культурных запатрабаваньняў працоўных мас, мае буйное палітычнае значэньне і патрабуе непасрэднай дапамогі пралетарскай грамадзкасьці і кіраўніцтва адпаведных партыйных камітэтаў. Аднак, да гэтага часу справа распаўсюджаньня друку застаецца нездавальняючай. Апарат сэктару распаўсюджаньня друку Беларускага Кіраўніцтва Сувязі і яго мясцовых органаў да гэтага часу не перабудаваўся ў адпаведнасьці з запатрабаваньнямі рэканструкцыйнага пэрыяду». (З пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б).

ЦК КП(б)Б даў зусім выразныя дырэктывы сэктару распаўсюджаньня друку Беларускага Кіраўніцтва Сувязі аб карэннай перабудове сваёй работы, аб пастаноўцы яе так, каб яна сапраўды адпавядала запатрабаваньням рэканструкцыйнага пэрыяду, культурным запатрабаваньням шырокіх мас працоўных.

На жаль, мы прымушаны канстатаваць, што гэтыя дырэктывы ЦК ня выкананы, ня гледзячы на тое, што з часу выясьненьня палажаньня пастановы прайшло ўжо каля паўтара месяца. Распаўсюджаньне друку ўсё яшчэ ідзе недапушчальна дрэнна. Сэктар распаўсюджаньня Беларускага Кіраўніцтва Сувязі вельмі мала арабіў для паляпшэньня гэтай работы.

Да гэтага часу наглядаюцца аглейшыя факты затрыманьня газэт паштовымі аддзяленьнямі замест своячасовай дастаўкі гэтых газэт чытачу. Вось адзін з многіх прыкладаў:

15 лютага прадстаўнік выдавецтва «Зьвязды» арабіў налёт на чыгуначнае паштовае аддзяленьне. Выявілася, што газэты «Зьвязда», «Рабочнік», «Кажаснік Беларусі» былі дастаўлены на чыгуначнае паштовае аддзяленьне станцыі Менск для накіраваньня ў Гомельшчыну, Мазыршчыну, Вабруйшчыну і іншыя раёны звыш чым на паўтары гадзіны раней адыходу цягніка. Газэта «Аксябр» была дастаўлена за адну гадзіну 10 хвілін да адыходу цягніка.

Здавалася-б, што пры такой большчым акуратнай дастаўцы газэт паштовому аддзяленьню, апошнія павінны былі быць нагіраваны падпісчыкам свае часова. Між тым газэты ня былі нагіраваны ў Гомельшчыну, Вабруйшчыну і Мазыршчыну бліжэйшым цягніком (8 гадз. 12 хв.), а са спазьненьнем... амаль на цэлыя сутки.

Гэты факт не адзіны. Спазьненьні з дастаўкай падпісчыкам газэт па віне пошты бываюць даволі часта.

Патрэбны рашучыя меры. Сэктар распаўсюджаньня друку Беларускага Кіраўніцтва Сувязі павінен неадкладна прыняцца за выкананьне дырэктыў ЦК КП(б)Б, пераключыцца на сапраўды баявыя тэмпы работы.

С.

Аб рабочым забесьпячэньні... думаюць

Прыгарадныя гаспадаркі і адкормачныя пункты па-за ўвагай Рагачоўскага гарспажыўтаварыства

Студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б даў выразныя дырэктывы ў галіне рабочага забесьпячэньня. Аднак, Рагачоўскае спажывецкае таварыства на сёньняшні дзень літаральна нічога не зрабіла ў выкананьні гэтых пастаноў. Нават ня прынятыя меры да стварэньня прыгарадных гаспадарак. Гарспажыўтаварыства чакае, пакуль РВК штосьці зробіць, а РВК ніяк на гарспажыўтаварыства. Тым часам, зямельныя вучасткі яшчэ не адведзены. Аб усебаковай падрыхтоўцы да сяўбы і гаворыць няма чаго...

Адкормачныя пункты спажывецкага таварыства без догляду. Сьвіні валяюцца ў гразі, у холадзе. 50 проц. прыплоду ўжо загінула. Сьвінарнікі не прыстасаваны да адкормачных пунктаў.

Аб усіх гэтых фактах пісалася ў рэйнай газэце «Камунар», але эруху яшчэ ня відаць. РайКК-РСІ патрэбна, нарэшце ўмяшацца ў гэтыя зледамственыя спрэчкі і навучыць спажывецкае таварыства і РВК, як трэба выконваць дырэктывы партыі аб рабочым забесьпячэньні.

М. Каранкевіч.

Задачы Беларускай Акадэміі Навук у галіне эканамічных досьледаў

Беларуская Акадэмія Навук робіць у сучасны момант карэнны паварот ва ўсёй сваёй рабоце, паварот, які павінен ператварыць яе з прытулку контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў у сапраўдны цэнтр марксыцка-ленінскай навуковай думкі ў БССР.

З ідэалёгічнай спадчынай нацыянал-дэмакратаў яшчэ не пакончана, яшчэ будзе патрэбна вялікая работа па выкрыцьці іх канцэпцый у розных галінах навукі. Але ня меншае значэньне мае ліквідацыя арганізацыйнай пабудовы Акадэміі, якая зусім адпавядала шкодніцкай рабоце нацыянал-дэмакратаў.

Адтаварэньне ад сацыялістычнага будаўніцтва, без якога быў-бы немагчымы росквіт нацыянал-дэмакратычнай ідэалёгіі — вось чаму была надпарадкавана арганізацыйная структура Акадэміі. Гэта знаходзіць сваё выяўленьне ў існаваньні катэдр, якія практыкавалі буржуазныя мэтады навуковай работы.

Яшчэ больш праяўляецца поўная адсутнасьць сувязі Акадэміі з сацыялістычным будаўніцтвам у тым, што ў БАН ня было ніякага арганізацыйнага цэнтру, які вёў-бы тэарытычную, навукова-дасьледчую эканамічную работы. А эканамічная-ж работа — адна з галоўных мастраляй, на якой павінна праходзіць сувязь Акадэміі з сацыялістычным будаўніцтвам.

Адсутнасьць у Акадэміі эканамічнага цэнтру, адсутнасьць распрацоўкі ў ёй актуальных праблем сацыялістычнага будаўніцтва выклікала да жыцьця цэлы рад паасобных навукова-дасьледчых інстытутаў. Замест таго, каб разбурыць Акадэмію з сярэдзіны, не абыходзілі, замест канцэнтрацыі ўсёй навукова-дасьледчай работы вакол Акадэміі, расьлі, як грыбы, навукова-дасьледчыя інстытуты ў розных галінах.

У Беларусі стварылася становішча, якое не забясьпечвае належнага ўдзелу эканамістаў Беларусі ў вырашэньні задач, якія стаяць перад тэарытычным эканамічным фронтам усяго Саюзу, а таксама і ў вырашэньні паасобных задач, якія стаяць перад эканамістамі Беларусі.

А эканамісты-ж Беларусі павінны ўнесьці сваю долю ў агульную работу усяго калектыву эканамістаў Савецкага Саюзу, павінны прыняць удзел у нарадзе да большай распрацоўкі пытаньняў савецкай гаспадаркі, пытаньняў новага этапу, праблем пэрыяду сацыялізму, да распрацоўкі праблем сучаснай фазы імпэрыялізму. Тварытычнае ўсьведамленьне і навуковае абагульненьне гістарычнага вопыту пабудовы сацыялізму ў нашай краіне на аснове генэральнай лініі партыі — павінна быць адной з галоўнейшых задач эканамістаў-тэарытыкаў Беларусі, як атраду ўсяго калектыву эканамістаў-марксыстаў Савецкага Саюзу. Выкананьне гэтай задачы павінна быць зьвязана з бязьлітаснай барацьбой за генэральную лінію партыі і выкрыцьцём тэарытычных карэньняў усялякіх ухілаў ад яе, а таксама з барацьбой з буржуазнымі тэорыямі, з сацыял-фашысцкай апалёгетыкай капіталізму, з буржуазна-рэстаўратарскімі канцэпцыямі шкодніку, з контр-рэвалюцыйным ідэалізмам Рубіна, з мэханістызмам.

Але перад эканамістамі ў БССР стаяць апрача таго свае асаблівыя задачы: выкрыцьцё эканамічных канцэпцый нацыянал-дэмакратаў, распрацоўка паасобных пытаньняў сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР, распрацоўка паасобных праблем генэральнага пляну развіцьця народнай гаспадаркі Беларусі, праблема геаграфічнага разьмяшчэньня прамысловасьці, пытаньні камбінаваньня, спэцыялізацыі і г. д.

Работа, якая вядзецца ў гэтым напрамку ў Беларусі, патрабуе рашучай перабудовы. Пры недахвазе эканамічных тэарытычных сіл мы маем розныя інстытуты, якія займаюцца распрацоўкай эканамічных пытаньняў, што ня можа быць названа інакш, як саматужніцтвам. Хіба можна лічыць нармальным існаваньне паасобных інстытутаў, часта з прэтэнцыязнымі назвамі, якія маюць у сваім складзе столькі навуковых работнікаў, што іх з посьпехам можна пасадзіць на маленькай канапцы.

Замест таго, каб сканцэнтраваць усю навукова-дасьледчую эканамічную работу ў адным месцы і каб рацыянальна і з павышанай эфэктыўнасьцю выкарыстаць тэарытычныя сілы, якія мы маем, існуюць паасобныя інстытуты, якія часта з сваіх плянах паўтараюць адзін аднаго. За прыкладамі такога паралелізму ў рабоце хадзіць недалёка. Узяць хаця-б інстытут эканамічных досьледаў Дзяржпляну і навукова-дасьледны інстытут прамысловасьці. І адзін і другі інстытуты займаюцца праблемай разьмяшчэньня прадукцыйных сіл БССР. Актуальнасьць распрацоўкі такой праблемы ясная для кожнага, але пры існуючым становішчы, пры саматужным падыходзе, ня можа быць забясьпечана яе дадатная распрацоўка, якая дала-б у рэзультаце асноўныя выточныя палажэньні для пабудовы генэральнага пляну народнай гаспадаркі Беларусі. Праблема геаграфічнага разьмяшчэньня прамысловасьці, пытаньні камбінаваньня, спэцыялізацыі і г. д.

Работа, якая вядзецца ў гэтым напрамку ў Беларусі, патрабуе рашучай перабудовы. Пры недахвазе эканамічных тэарытычных сіл мы маем розныя інстытуты, якія займаюцца распрацоўкай эканамічных пытаньняў, што ня можа быць названа інакш, як саматужніцтвам. Хіба можна лічыць нармальным існаваньне паасобных інстытутаў, часта з прэтэнцыязнымі назвамі, якія маюць у сваім складзе столькі навуковых работнікаў, што іх з посьпехам можна пасадзіць на маленькай канапцы.

Замест таго, каб сканцэнтраваць усю навукова-дасьледчую эканамічную работу ў адным месцы і каб рацыянальна і з павышанай эфэктыўнасьцю выкарыстаць тэарытычныя сілы, якія мы маем, існуюць паасобныя інстытуты, якія часта з сваіх плянах паўтараюць адзін аднаго. За прыкладамі такога паралелізму ў рабоце хадзіць недалёка. Узяць хаця-б інстытут эканамічных досьледаў Дзяржпляну і навукова-дасьледны інстытут прамысловасьці. І адзін і другі інстытуты займаюцца праблемай разьмяшчэньня прадукцыйных сіл БССР. Актуальнасьць распрацоўкі такой праблемы ясная для кожнага, але пры існуючым становішчы, пры саматужным падыходзе, ня можа быць забясьпечана яе дадатная распрацоўка, якая дала-б у рэзультаце асноўныя выточныя палажэньні для пабудовы генэральнага пляну на-

вальнае тэорыі ад практыкі. Гэта, зразумела, ня ўсё неабходнае для ліквідацыі такога адставаньня, але — адна з важнейшых умоў.

Або ўся навукова-дасьледчая эканамічная работа будзе сканцэнтравана вакол Акадэміі Навук і яна зробіцца сапраўдным цэнтрам сапраўднай тэорыі, якая «можа даць руху ўпэўненасьць, сілу арыентоўкі і разуменьне акружаючых падзей... можа дапамагчы практыцы зразумець ня толькі тое, як і куды рушацца клясы ў сучасным, але і тое, як і куды павінны рушыцца яны ў бліжэйшым будучым» (Сталін), або Акадэмія застанецца ранейшай, адарванай ад сацыялістычнага будаўніцтва.

Яшчэ адна акалічнасьць, якая дыктуе неабходнасьць стварэньня інстытуту эканомікі і канцэнтрацыі вакол яго ўсіх сіл і ўсёй работы. Гэта — падрыхтоўка кваліфікаваных эканамічных кадраў. Тут таксама панае саматужніцтва і нерацыянальная арганізацыя справы. З аднаго боку, мы маем інстытут асьпірантуры ВАН, з другога — інстытут прамысловасьці мае сваю асьпірантуру, ад іх нехоча адстаць інстытут эканамічных досьледаў Дзяржпляну і марыць завесьці і ў сябе асьпірантуру. Гэтаму рашуча павінен быць пакладзен канец.

Падрыхтоўка асьпірантаў павінна быць сканцэнтравана ў руках Акадэміі. Асьпірантуры пры інстытуце эканамічных досьледаў Дзяржпляну ня варта стварэць, а тую, што існуе пры інстытуце прамысловасьці, неабходна перадаць адпаведным інстытутам ВАН.

ГРЫЧЫК.

Закончыўся конкурс на дзіцячую кніжку

Закончыўся ўсебеларускі конкурс на лепшую дзіцячую кніжку. Конкурс быў абвешчан ў мінулым годзе Белдзяржвыдавецтвам і Наркамасьветы і ставіў перад сабою наступныя галоўныя задачы:

— Даць нашым дзецям бадзёрую таленавітую, высока-мастацкую кніжку, якая-б найбольш поўна, яскрава і праўдзіва у даступнай дзіцячаму разуменьню форме адбівала ідэі камунізму паказала сёньняшні дзень—час непасрэднага шырока-разгорнутага будаўніцтва сацыялізму.

Выявіць новыя кадры (з педагогаў, пралетарскіх студэнтаў, пачынаючых паэтаў, ударнікаў літаратуры, журналістаў, рабкораў і селькораў, работнікаў дашкольнага выхаваньня і т. д.) пісьменьнікаў для стварэньня беларускай пралетарскай дзіцячай кніжкі.

Што-ж даў конкурс? Ці выкананы пастаўленыя задачы?

На конкурс паступіла 37 рукапісаў. З іх: па беларускай мове 31, на расійскай 3, на яўрэйскай 2, на польскай 1. Пасьля разгляду—26 рукапісаў прызнаны зусім непадыходзячымі да друку. 7 рукапісаў маюць некаторую вартасьць па тэме і замыслу, але выкананы неадавальняюча. Апавяданьне на польскай мове «Два ліхтары» (дэвіз—Ян Тумінэ) прынят да друку без прэміраваньня. З наступных лепшых рукапісаў атрымалі прэміі:

1. «Дзед і ўнук» (дэвіз—«Глядзі ўперад»)—2 прэміі (500 р.).
2. «Своя воля» (дэвіз «Будзь гатоў»)—2 прэміі (500 р.).
3. «Чорт» (дэвіз «Сымон»)—3 прэміі (250 р.).

Тры лепшых рукапісы («Дзед і ўнук», «Своя воля» і «Чорт») ня гледзячы на актуальнасьць іх тэм, арыгінальнасьць і параўнаўча высокую мастацкасьць усё-ж трапяць недахопамі з пункту гледжаньня нашых сёньняшніх запатрабаваньняў да дзіцячай кніжкі, і таму журы ўстрымалася ад прысужэньня першай прэміі.

Журы на сваім заключным пасяджэньні, якое адбылося 19 лютага ад значыла, што конкурс сабе поўнасьцю не апраўдаў, што пастаўленыя задачы далёка ня выкананы. Галоўны недахоп конкурсу ў тым, што ў ім не прынялі ўдзелу пікрокія масы пралетарскіх і селькіх пісьменьнікаў, што ён ня выявіў новых пралетарскіх кадраў дзіцячых пісьменьнікаў.

Журы выказала пажаданьне, каб БДЗ зараз-жа абвясьціла другі конкурс на лепшую дзіцячую кніжку з упягненьнем у яго як мага большай колькасьці пісьменьнікаў, рабочых літгурткоў, настаўнікаў і г. д.

Ускрыцьцё дэвізных канвэртаў адбудзецца тутэйшы днямі ў Доме Пісьменьніка для чаго рыхтуецца вечар, прысьвечаны пытаньням пралетарскай дзіцячай літаратуры.

Паведамленьні

СЁНЬНЯ:

— Парт. тройка гар. КК выклікае ў 18 гадзін па пасяджэньне п. т. наступных т. т. Далінка М. Х. (яч. будаўнікоў), Мядзьведзеў 1 Малкін (яч. Камвупу), Мурашка (э-д «Бальшавік»), Унгер (сьпіртазавод), Біох (гута «Пралетары»), Сідаровіч, Банін (яч. 41 УНР), Арлоўскі завод «Энэргія»), Касьпяровіч (ЦК ЛКСМБ), Перавозьнікаў (Белдзяржбуд), Гельмановіч (абутк. майстэрня), Лепін (э-д «Полымя рэвалюцыі»), Маншукевіч 1 Лукашонак (МБВ чыг.) для ўдзелу ў разглядзе іх спраў. Таксама выклікаюцца сакратары ячэек, дзе гэтыя таварышы лічацца на вучоце.

— У 18 гадзін у Доме Чырвонай арміі адбудзецца канфэрэнцыя ячэек СВВ вайсковых часьцей. Менска гарнізону. Модус пралетаріцтва: і ад 10. На канфэрэнцыю запрашаюцца сакратары ячэек СВВ гор. Менску.

— У 18 з пал. гадз. увечары ў памяшканьні Воп. станцыі НК РСІ (Сав. 55) адбудзецца парада рацыяналізатараў устаноў і прадпрыемстваў ад адміністрацыі. На парадку дня: Абгаварэньне новага праекту дагавору і інструкцыі па абмене пошты з калектывамі.

— Дом Асьветы. У 19 гадз.—агульны сход асьветнікаў гор. Менску, прысьвечаны міжнароднаму дню беспрацоўя і вынікам III-га ўсебеларускага настаўніцкага зьезду.

— Дом Пісьменьніка. У 19 гадз.—Творчы вечар БелАПП'у. Платон Галавач чытае аповесьць «Спалох на загонах». Уваход вольны.

ЗАЎТРА:

— У 18 гадз. у памяшканьні клюбу мэталістаў (Університэцкая, 12, ЦК НК РСІ склікае нараду па пытаньні аб якасьці прадукцыі рэспубліканскай, мясцовай і саматужнай прамысловасьці.

На нараду выклікаюцца: Шкіпаб'яднаньне — фабрыка «Кастрычнік», школа імя Крупскай; Мэталлаб'яднаньне — зав. «Камунар», «Энэргія», «Ударнік» і «Полымя Рэвалюцыі»; Шкіпаб'яднаньне —зав. «Пралетары», Скурабі'яднаньне—зав. «Бальшавік» і Абутковая фабрыка, Белхарчтрэст — ф-ка «Камунарка», завод «Чырвоны Зодак», завод «Пралетары» і завод «Беларусь»; Хэмаб'яднаньне — фабрыка «Беларуска»; Сампрамкапэрацыя — арцель «Перамога», арцель паччошнікаў імя Крупскай, арцель «Чырвоны Абутнік», арцель краўцоў «Пралетары»; МІРК — усе загадчыкі закрытых разьмеркавальнікаў і буйных адкрытых крам. Ад кожнага з вызначаных прадпрыемстваў павінны зьявіцца кіраўнікі прадпрыемства, загадчыкі цэхаў, усе бракёры і кантралёры, старшыні фабкомаў і заўкомаў, сакратары партячэек, старшыні вытворчых нарад—па 5—10 ударнікаў ад кожнага цэху і трохкутніка ўсіх трэстаў і аб'яднаньняў. Запрашаюцца прадстаўнікі друку.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Сёньня, 25 лютага. Паказ для СЮЗУ СУВЯЗІ. Пач. а 8 гадз.
Беларускі другі дзяржаўны тэатр
В. Кіршон.
РЭЙКІ ГУДУЦЬ
П'еса ў 5 дзеях, 12 абразох.

Кіно-тэатр „Культура"
КІНО ЗАКРЫТА да 2 сакавіка.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „СЫРВОКАЯ ЗОРКА"
Новы шэдэўр фільм вытворчасьці Узбекдзяржкінпрам
АПОШНІ БЭК
Хроніка Саюзкіно № 3
Зьвыш праграмы ГУКАВЫ ФІЛЬМ.
Пач.—у 7 г., 8 г. 45 м., і 10 г. 30 м. Каса—з 5 гадз.

КІНО „Інтэрнацыянал"
2-гі тыдзень савецкі фільм вытворчасьці „Працэнко"
ЖАНЧЫНА Ў ЛЕСЕ
Пач. і сэансу ў 6 г.—Каса—з 4 г. 30 м.

КІНО „Пралетары"
Новы савецкі фільм выт. „Саюзкіно"
ВАЙНА-ВАЙНЕ
Зьвыш праграмы
Брацішкін сяброўчае
Пачатак ў 6 г. 30 м., 8 г., 9 г. 20 м. і 10 г. 45 м. Каса—з 4 гадз.

Кіно „Юны Піянэр"
Эпізод барацьбы з басмачтвам
ШАКАЛЫ РАВАТА
Кіно-п'еса ў 9 частках.
Пач. у 1 г. д. Каса—з 12 г.

КІНО „СПАРТАК"
Выдатны трука-прыгодніцкі фільм
НАПОЛЕОН-ГАЗ
ў 7 частках.
Пач. у 7 г., 9 г. і 10 г. 45 м.
КАСА—з 5 гадз.

СЁНЬНЯ ў 7 гадзін вечара ў залі БАН адбудзецца
нарада камуністаў—навуковых працаўнікоў і асьпірантаў
усіх навукова-дасьледчых устаноў гор. Менску
ПАРАДАК ДНЯ:
задачы БАН у галіне канцэнтрацыі навукова-дасьледчай працы ў БССР (даладчык тав. ГОРЫН).
На нараду павінны зьявіцца ўсе камуністы-навуковыя працаўнікі і асьпіранты ўсіх навукова-дасьледчых устаноў гор. Менску і без спазьненьня.
ПРЭЗЫДЫУМ АКАДЭМІІ.

Талочынскі РК КП(б)Б і райКК РСІ сумесна з газ. „Рабселькор",
1 сакавіка, у 10 гадз. раніцы, у памяшканьні Талочынскага пардому
)—(оклікае)—(
раённую нараду рабселькораў.
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Вынікі ўсесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху